Частка першая

# Зямля св. Лукі

*Як ужо многія пачалі складаць*
*аповесці пра добра вядомыя сярод нас падзеі,*
Лука 1, I,

то і я пачну з аповесці пра скудзель. Калісьці пра яе ведаў кожны, але потым забыліся. Чалавек нараджаецца, расце, жыве, нараджае дзяцей, старэе і памірае сваёй смерцю – бо калі пяма смерці, то няма жыцця. Жывое расце з мёртвага. Але памірае чалавек па-рознаму, і свая смерць не заўжды прыймае яго. І мёртвыя сапраўды мёртвыя, калі самі дажылі да свае смерці; забітыя ж на вайне альбо без вайны, дакананыя заўчаснай хваробай, тапельцы, спаленыя, задраныя зверам, укушаныя гадзюкай, атручаныя зеллем, забітыя громам ніякія не мёртвыя на самай справе – тыя яшчэ цягнуць свой век, і калісьці было нельга аддаваць іх зямлі. І калісьці адносілі іх на скудзель – у глыбокія яры, у глухія пушчы, у багны, у адну прорву, куды не хадзіў жывы чалавек, а ні памінак, ні трызны не спраўлялі па іх. Кажу пра гэта для таго, каб ты сам да свайго канца не забыў пра гэта і

*каб ты ўведаў цвёрдую аснову*
Лука 1, 4.

Сам я паходжу з мястэчка Скідаль або іначай: Скідзель, на эахадзе Беларусі, каля стокаў яцвяжскіх рэкаў Котры і Нёмана. Паводле архіваў, вядомы Скідзель з XVI стагоддзя, заснавалі яго быццам бы Радзівілы, невядома толькі, чаго яны палезлі ў неўрадлівыя пясок з балотам.

За савецкім часам школьныя настаўнікі на рэдкіх лекцыях з краязнаўства – адна лекцыя за цэлы школьны год! – апавядалі псеўданародную легенду, што некалі на гэтым месцы загразла імператрыца Кацярына ІІ Вялікая і скідвала з карэты свае шмоткі, каб лягчэй было цягнуць конікам... Мужык так і ўяўляў сабе, што калі імператрыца ездзіла карэтай, то адной карэтай, без абозу і канвою – як ён сваім возам у госці да цешчы. Кацярына тут за непатрэбай не была зусім – за тым, як маўчаў апошні Сойм Рэчы Паспалітай у гродзенскім замку, назіралі генерал Цыцянаў і дыпламат князь Рапнін, апошняга ж караля і вялікага князя Станіслава Аўгуста Панятоўскага пільнаваў да вывазкі ў крэпасць у Санкт-Пецярбурзе просты маёр расійскай гвардыі; трэба думаць, людзі таго ж маёра, – расійская гвардыя таго часу спаўняла функцыі цяперашніх спецслужбаў, – паціху і атруцілі Панятоўскага ў тым жа Гродне, і ўжо атручанага і гатовага павезлі ў Санкт-Пецярбург, і там Кацярына ІІ прыняла шчырае перадсмяротнае адрачэнне свайго каханка з пачатку кадэнцыі і зрабілася каралевай і вялікай княгіняй на законных еўрапейскіх падставах.

Пазней я пачуў ад патрыятычных беларускіх краязнаўцаў, чыя дзейнасць у канцы 80-х і пачатку 90х была нават дазволена і, нават, па вялікіх святах прапагандавалася, што Скідзель паходзіць ад балцкага кедэліс, кедзляй і азначае „плясці, заплятаць, пляцёнка”, а ў пераносным сэнсе „шчыт з лазы, пастка, загарода”, гэта значыць, застава, перадавы пастарунак... Маўляў, левы бераг Нёмана каланізавалі славяне, а правы яшчэ доўга быў балцкі, і вось тут мелі свае пастарункі і адны, і другія. І так магло быць, толькі што няма нідзе ў наваколлі Скідзеля ні пагоркаў, ні другіх зручных месцаў для абароны, ні слядоў якогасьці замчышча, а застава па-літоўску будзе „прэнай” і ёсць недалёка Коўна мястэчка Прэнай. Ізноў нешта не сходзяцца канцы з канцамі...

Гледзячы ж у час што далёкі, што блізкі, між волі само лезе ў галаву, што на самай справе ўсё гэтак жа проста, як жыццё і смерць – і той Скідзель гэта і ёсць тая самая скудзель, мясціна мёртвых, што ўсё яшчэ жывыя, альбо мясціна жывых, якія даўно ўжо мёртвыя. Але ж ты толькі пасміхнешся! Пасміхнешся – ці сам ты скідлянін, ці прыехаў здалёк ці зблізку, ці на дзень толькі з кнігай маёй завітаў сюды; але не на веру тваю спадзяюся я, але толькі на розум, зрэшты, і гэта не абы-

ходзіць мяне, бо табе надакучыла і чакаеш аднаго, калі ж гэта скончыцца, хоць тое не скончыцца ніколі, але ты будзеш чакаць,

*І ты будзеш маўчаць,*
*і не зможаш гаварыць да таго дня,*
*калі гэта збудзецца,*
*за тое, што ты не паверыў словам маім,*
*якія спраўдзяцца ў свой час.*
Лука 1, 20.

На Беларусі марнее тая скудзель – той Скідаль ці Скідзель. Што праўда, не толькі тут не жывуць, але дажываюць свой век, і як усё прапашчае на цэлай Беларусі прападае і тут. Лепш не судзіць аднаму чалавеку другога, але ж любы з пяром у руках ці за сталом з друкавальнай машынкай альбо камп'ютэрам усё роўна суддзя, хоць і не хацеў гэтага. Таму адразу кажу, што суджу самога сябе, бо ніхто не ведае, ёсць пасля Смерці той Страшны Суд альбо няма, а калі ёсць, ці справядлівы ён, а калі справядлівы, то хто судзіць і якім правам... Здаецца мне ўсё ж, што памяць чалавека пра сябе і другіх гэта і ёсць Страшны Суд, бо памятаюць тыя, хто мае сябе за шчаслівых і хітрых, або ўдаюць, што нічога не памятаюць, а таму здолеюць прапасці і слядоў па сабе не пакінуць. На скудзелі не памірае і не прападае без следу ніхто,

*бо ў Бога не застаецца бяссільным*
*ніякае слова*
Лука 7, 37.

Калі гадоў дваццаць пяць таму я дамучваў пачатковыя дзесяць гадоў савецкай школы, якая з тонкім савецкім гумарам называлася, і па сённяшні дзень называецца сярэдняй, гэта значыць, дурных робіць разумнымі, а разумных дурнымі, то самымі цяжкімі лічыліся матэматыка ды хімія, а самымі лёгкімі гісторыя і літаратура.

Але і тады, і цяпер нідзе так шмат не завальвалі экзаменаў, як на сачыненнях па літаратуры, і нідзе так не блыталіся, як у сваёй і чужой гісторыі. І вось цяпер выразна відаць, што мае землякі неяк прадукуюць і цукар, і салетру, і тэлефоны з тэлевізарамі, і ровары з аўтобусамі – калі нават

горш за Еўропу, то ўсё роўна лепш за Расію. Нашым другога не трэба, іх цалкам задавальняе і гэта. Што ж датычыцца літаратуры, то дзевяноста дзевяць з кожнай сотні выглядаюць, як той разумны сабака, які ўсё разумее, але нічога не можа сказаць, а што датычыцца гісторыі, то гавораць усе, хто не лянівы, і аж пена з рота валіць, але лепш бы яны памаўчалі, лепш бы не выхваляліся адны перад аднымі за нашых ды вашых – бедны Лелевель! Той яшчэ нешта гаварыў пра нейкае братэрства... – перажытае заўжды ўяўляецца нечым лёгкім і простым, і брахаць пра тое лёгка і проста, голькі ж памяць тым і адрозніваецца ад пустога брэху, што яна куды больш цяжкая і на язык без касцей яе проста так не пакладзеш...

Не паддаюцца законам прыроды гісторыя і літаратура. Нічога не ведае чалавек сам пра сябе.

А калі ўжо пазбіраюцца кніжнікі, то такі пыл і ляціць, што хоць сякеру ад смуроду чапляй у паветры! Адзін чытаў пра „Западную Россию”, другі пра Рэч Паспалітую, трэці пра Вялікае Княства, чацвёрты „жэ ту бэньдзе Польска, поневаж так было пшэд войном!”, пяты распінаецца, што рэвалюцыя 1917 года была памылкай, шосты бядуе „развалілі такую страну”, а ўсё гэта разам у Мінску называецца Рэспублікай Беларусь, у Варшаве называецца Крэсамі... Мы ж жывем пасярэдзіне, куды рэдкі чалавек адважваецца зайсці – і не прэзідэнт Лукашэнка таму прычынай, бо так было задоўга да яго праўлення. Ну, што ж, Крэсы, дык Крэсы – няхай будуць Крэсы! А навука пра іх будзе называцца: крэсалогія – гэта, каб падтрымаць інтэлектуальны ўзровень размовы! – з падзелам на псіхакрэсалогію, геапсіхалогію і г.д.

## Асновы сучаснай крэсалогіі

*Частка першая*

Цяпер высветлілася, што гісторыя Рэспублікі Беларусь лічыць больш тысячы гадоў і пачынаецца ад Рагвалода. Быў то гаспадар места Полацак над Дзвіной, князь альбо канязь, гэта значыць, уладар канца зямлі. Чатыры канцы тыя выходзілі адпаведна пад цяперашнія Мінск, Пскоў, Смаленск і Рыгу. Летапісны народ над Дзвіной прыняга пазываць: крывічы. Што ж да самога Рагвалода, то мог ён быць і якім-небудзь дацкім

піратам, бо ці то Роокс Вольф ці Роокс Вальд – кароль-воўк або кароль лесу! – нелагічна ж, як і вядомы рускім гісгорыкам „путь из ворягов в греки” ажно праз Фінскі заліў, Няву, Ладагу, Волхаў, Ільмень, валокі, Дзвіну і Дняпро, ці сапраўды быў там, калі можна было адразу па Дзвіне выйсці на тыя ж валокі і трапіць на Дняпро. Трэба думаць, што спачатку на Дзвіну прыйшлі нейкія крывы і селі на тубыльцаў, потым ужо іх канкурэнты русы зайшлі з поўначы, тут умацаваліся, ды пайшлі на поўдзень... Спаліў Полацак і забіў Рагвалода іхні, русаў, князь Уладзімір, пазнейшы, кананізаваны царквой, Уладзімір Святы – гэта ён ахрысціў ад візантыйскіх грэкаў аграмадны абшар ад Чорнага мора да Фінскага заліву на Балтыку. Але цікава, што Уладзімір... брыў галаву і пакідаў толькі хахол, як пазней запарожскія казакі, а войска яго хадзіла пад колерамі Неба і Сонца, мела жоўта-блакітны сцяг, як цяперашняя Украіна! Той Уладзімір здаецца мне несумненным чалавекам стэпу, якім-небудзь хазарам – і сутыкнуліся ў бітве ажно 980 году не Рагвалод і Уладзімір, але ж Лес і Стэп, альбо па-цяперашняму: Усход і Захад. Шчыра кажучы, з таго часу тут прынцыпова нічога не змянілася...

Перад сваім хрышчэннем і хрышчэннем Кіева той Уладзімір доўгі час вагаўся ў выбары дзяржаўнай веры свае сухапутнай імперыі – то не мог вызначыцца паміж хрысціянствам ды іудзействам (частка хазараў была іудзеямі!), то рэфармаваў мясцовыя паганскія веравызнанні – на самай высокай строме ў Кіеве быў устаноўлены пантэон багоў, галоўным з якіх быў Пярун, бог Стэпу, ужо ніжэй ішлі Сварог і Вялес ці Волас, богі зваяванага Лесу. Трэба думаць, спроба спалучыць неспалучальнае мела такі ж вынік, як і пазнейшая Унія, але Уладзімір зразумеў гэта вельмі хутка і надаў прывілеі адзінай законнай веры, хрысціянству, якое на гэтых землях было і раней, вядома, ад тых жа грэкаў, варагаў ці іншых народаў, але гадоў чатырыста дагэтуль існавала як вера заезных купцоў ды іншых людзей.

І так, усё было, як у людзей... Язычнік або паганін спачатку заснаваў імперыю, падбіўшы русаў у Навагародзе ды крываў у Пскове, а потым яе ахрысціў. І ўсё ж цікава – язычнік альбо паганін? Справа ў тым, што летапісныя пагане – гэта нейкія стэпнякі, нейкія печанегі, полаўцы, татары і г.д. – так бы мовячы, нехрысціяне ў законе, пехрысціяне па прыродзе сваёй; язычнікі ж гэта тыя, хто з пупкту гледжання хрысціяніна павінен, але не

хоча прымаць крыж... Значыць, быў пейкі народ, частка якога на час жыцця нашых летапісцаў прыняла хрысціянства, а частка не.

Што ж гэта за народ і дзе ён быў? Куды знік?

Падказку дае лексіка – ёсць язык, а ёсць і мова, пры гэтым тэрмін мова зберaглі толькі беларусы (паміж імі, украінцы гэта ў пэўным сэнсе нашчадкі тых жыхароў Беларусі, што пабілі татар у XIV стагоддзі і каланізавалі цяперашнюю Украіну). Язык жа прыйшоў сюды разам з Кірылам, Мяфодзіем, грэцкімі місіянерамі, азначаў ён мову кніжную, гэта значыць, мову хрысціян-прапаведнікаў, а адмаўленцы прымаць новую веру маглі быць названыя: яцьвягі, як гэта і сталася ў летапісах... Параўнаем – апостал па-грэчаску азначае прарок, але блізкае апостат па-грэчаску азначае ўжо адступнік, здраднік! Вось табе і граматыка з лексікай... Пасля хрышчэння Кіева і залежных ад яго земляў на кароткі час імперыі Уладзіміра, у тым жа Полацку і Навагорадзе, сам князь год за годам ваюе не за багатую Візантыю, але нейкіх яцьвягаў, з якіх, паводле летапісца, і ўзяць можна адно лыка на лапці ды бярозавы венік на лазню... Уладзімір ваюе неахрышчаных яцьвягаў гэтаксама, як другі імператар, Карл Вялікі, ваяваў нехрышчаных саксаў! Першыя, у імя крыжа, крыжацкія паходы на Нёман, Нарву і Прыпяць ішлі не ад немцаў, але з Кіева!

У XIX стагоддзі гісторык Сяргей Салаўёў знайшоў... рэшткі яцьвягаў – і то недалёка майго Скідзеля, на верхняй Котры. Паводле Салаўёва, яны вызначаліся вонкавым выглядам і вопраткай, былі высокія, пахмурныя і ў чорных кажухах і кашулях, з незразумелым (!!!) ні суседнім беларусам, ні суседнім летувісам дыялектам, а таксама... мясцовай беларускай прымаўкай: „Глядзіць зверам, як той яцьвяг!"

У тым жа XIX стагоддзі этнограф Оскар Кольберг прыблізна там жа – „каля Гродна"! адкрыў чорнарусінаў: росту яны былі высокага, твары мелі выцягнутыя і здаровыя, валасы насілі доўгія, адпускалі вусы, але бароды галілі, страшэнна любілі яны гарэлку і піва ды набіраліся пры кожным выпадку, мова ж іх была беларуская...

У паляка Кольберга і рускага Салаўёва сходзіцца амаль усё – рэдкі выпадак у паляка і рускага паміж пустак-балот беларускай зямлі! – апроч мовы. Але тут няма супярэчнасці, бо рускі сапраўды не разумеў нашых акцэнтаў і дыялектаў, а

Кольберга пасля паляшукоў ці мазуроў нічога не здзіўляла, а таму ён адназначна вывеў, што і каля Гродна няма палякаў, бо тыя чорнарусіны гавораць-такі па-беларуску.

Калі гадоў дзесяць назад чорт панёс мяне ў нацыянальна-вызваленчую рэвалюцыю, са спакойнага савецкага ваеннага завода і ціхага канструктарскага бюро, я адарваўся вечарам ад бясконцых тамоў Кольберга і Салаўёва і падышоў да люстэрка – адтуль глянуў на мяне змрочны яцьвяг, цэлы высокі, худы, з выцягнутай мордай, доўгімі валасамі і нават вусамі, якія насіў на той час, бараду ж не насіў, бо расла рэдкая, як у многіх беларусаў праз нашыя халерныя багны! І мяне ад адчування безнадзейнасці вызначанага лёсу страшэнна пацягнула на гарэлку і піва...

Што мае быць, таго не пазбегнуць.

Яцьвягі не паддаліся хрысціянству адразу, як сам стольны Полацак, і чыну ў дзеях яго не бралі – прынаймней на яго баку! – але ж і яны непарыўна звязаны з усім тым, што было далей з гэтым Краем. Пакуль жа адзначу, што заваёўнік Полацка, князь Уладзімір Святы, невядома чаму з усяе сям'і забітага Рагвалода пакінуў сабе яго дачку Рагнэду і нават узяў яе за жонку – усяго ў паганіна было шэсць жонак, але жонак, бо дзецям ад іх ён раздаў кавалкі свае імперыі! Простых жа дзевак у яго гарэме перад хрышчэннем лічылася васемсот: па хрышчэнні Уладзімір усіх вызваліў, даў пасаг і павянчаў са сваімі дружыннікамі, асяліўшы ў Кіеве, які тым самым павялічыўся ўдвая... Зрэшты, што значыць: невядома?! Гэта нам, цывілізаваным, невядома – мы ж вынішчаем усіх пагалоўна і да сёмага калена! Хто ведае, магчыма звычаі і мараль варвара забараналі забіваць апошняе жывое стварэнне і перасякаць род, верылі ж яны ў бяссмяроцце і перасяленне душаў, і нават у тое, што звяры і людзі браты, бо ў іх бацька і маці адны...

Укосна гэта пацвярджаецца тым, што калі княз ёўна полацкая Рагнэда падняла нож на мужа і ўладара ды параніла яго – гэта ў X стагоддзі! – то і тады яе і сына Ізяслава толькі выслалі на мяжу, пад цяперашні Мінск; мястэчка тое было потым сталіцай малога княства і да сягоняшніх дзён называецца Заслаўем. Па смерці бацькі гэты Ізяслаў законна атрымаў у спадчыну той жа Полацак па дзеду Рагвалоду – гэта была воля... бацькі Уладзіміра, які дзеда Рагвалода забіў! З гэтага Ізяслава пайшла дынастыя, якая трымала Полацкае

княства трыста гадоў – падобна Ягелонам у Польшчы ці Раманавым у Расіі... Цікава, што рускія гісторыкі называюць яе, дынастыю, Ізяслававічы, па імю заснавальніка; беларускія ж гісторыкі – Рагвалодавічы, па імю дзеда заснавальніка; князёўна ж Рагнэда – гэта пацыянальная гераіня, за тое, што ў палоне (!) не забылася „родны Край” і парнула мужа нажом... „Мы і ў ложку незалежныя!”. Гэта ж тое самае, каб перайменаваць Ягелонаў у Гальшанскіх, па імю другой жонкі, Сафіі, – зрэшты, яна ўсё роўна праваслаўная, то хай ужо будуць Ягелоны...

Той Уладзімір цікавы яшчэ дзвюмя памяткамі. Святым то яго кліча афіцыйная праваслаўная царква, але ж і ў народных быліцах, фальклоры, ён памінаецца як Яснае Сонейка – як язычніцкі бог! Чым жа ён так простаму люду дагадзіў, ні зямлі ж і ні волі не даў, не тыя часы, а жыць пры ім горш было, як пры любой новай уладзе? Уладзімір даў не што, але каго – ну, напрыклад, даў на расправу пабітых Рагвалодавых ваяроў, ключнікаў і таму падобнае чынавенства, з чаго і пайшла адвечная легенда пра добрага пана, а ў кожнай легендзе ўсё перамешана народнай любоўю, і выходзіць, што ён

*скінуў моцных з трона,*
*а ўзвысіў пакорлівых,*
Лука,1, 52.

*галодных напоўніў дабром,*
*а багатых пусціў ані з чым.*
Лука 1, 53.

Ажно з таго Уладзіміра ідзе традыцыя асвечаных ідэяй добрапанства рабункаў мужыкоў. Зрэшты, нейкі ананім – хіба то быў, аднак, Уладыслаў Сыракомля! – пусціў у народ у якасці антыдзяржаўнай агітацыі паэму пад такім тытулам пра мужыцкую чыннасць у 1812 годзе, калі Беларусь перажывала чарговы ўплыў з Еўропы, у выпадку чаго за паўгода тут загінуў кожны чацверты, як за чатыры гады гітлераўскай акупацыі... Пусціў Сыракомля тую паэму ажно ў XIX стагоддзі, а перадавалі яе з пакалення ў пакаленне да 1918 года, калі рабункі мужыкоў паўтарыліся і сталі новай легендай!

Дык вось, трыста гадоў пры Рагвалодавічах жыла сабе пад выглядам Полацкага княства цяперашняя Рэспубліка Беларусь,

то ваявала нават Кіеў і Навагорад, то распадалася на Мінск, Віцебск і Друцк, то ўвогуле трапляла пад часовую акупацыю якога-небудзь Манамаха або Мсціслава, але ў асноўным жыла сабе ціха, на свята па-царкоўнаму, на будні па-тутэйшаму брала даніну з наддзвінскіх лэтаў і земігалаў, адкуплялася іх коштам ад уедлівых Смаленска ды Уладзіміра-на-Клязьме – каб яны ногі скруцілі з той палітыкай! – мела на хлеб і да хлеба, і неяк жыла. І тут палезла на яе цывілізацыя, якой першы раз стала цесна ў Еўропе.

*У тыя дні выйшаў ад кесара Аўгуста загад*
*зрабіць перапіс па ўсёй зямлі.*
Лука II, 1.

Пасля бліскучага пачатку і бясслаўнага канца крыжацкіх паходаў на Палестыну ды Візантыю – хоць і ўзялі рыцары Канстанцінопаль, але ж праз год іх ушчэнт пабілі балгары, а праз кароткі час яшчэ і арабы! – у Рыме прыслухаліся-такі да голасу купцоў з Брэмена і князёў з Мазовіі, што ў адных гандаль прападае, а другія ноччу спаць не могуць спакойна, бо ў той жа цывілізаванай Еўропе застаюцца нейкія пагане ды схізматы... І было сказана: дранг нах Остэн!

На той час Рагвалодавічы падзяліліся на полацкую і мінскую галіны, і да таго дажыліся і пераcварыліся, што нават самы патрыятычны беларускі гісторык Мікола Ермаловіч, спецыяліст па „слядах аднаго міфа” ды „летапіснай Літве”, нарэшце напісаў у поўнай скрусе, што па смерці чарговага полацкага Уладзіміра („кеніг Вольдэмар” быў атручаны нямецкай разведкай без усялякіх слядоў, як пазней кароль Панятоўскі і прарок Міцкевіч расійскай!) полацкі перыяд у гісторыі Рэспублікі Беларусь... канчаецца ў 1206 годзе! Але мне і табе ад гэтага не лягчэй, бо следам за полацкім перыядам пачынаецца перыяд наваградскі.

*У той краіне былі на полі пастухі,*
*якія трымалі начную варту*
*каля статку свайго.*
Лука II, 8.

Немцы спрабавалі замацавацца ў вусці Дзвіны яшчэ з 1180 года – так сцвярджаюць іх кронікі; на паперы ж і на пергаменце, як вядома, застаецца не ўсё, але гэта і добра, бо часам

не дай Бог ведаць нават тое, што ведаем; калі ж даведацца пра тое, чаго не ведаем, то дзень зробіцца ночу, а ноч бяссонніцай, а бяссонніца бяздоннем дурноты, нянавісці і нізкасці душы чалавечай...

Каменданты полацкага князя – немцы мянуюць іх, тых камендантаў, ажно князямі, каб павялічыць свае заслугі, прыпісваючы сабе большыя цяжкасці для пераадолення! – у замках Куканос (ад слова кукіш альбо дуля ці фіга!) ды Горачка – нейкі „ўсходні вучоны" дагэтуль паўтарае нямецка-латышскі акцэнт і атрымлівае Куйкейніс ды Герцыкэ! – бралі з тых брэменска-любецкіх дань, як і з іх еўрапейскіх папярэднікаў, за права гандляваць на полацкім беразе Балтыку. Немцы ж угледзелі, што тыя русіны самі любяць хадзіць з Дзвіны на мора, а каля вусця ёсць жа здатнае месца пад крэпасць – і пачалі абяцаць тубыльцам вызваліць іх ад тых данін Полацку, для чаго пахрысціць іх і аддаць пад апеку Святому Айцу ў Рыме... Далей усходнія летапісцы скардзяцца, што біскуп Альберт атрымаў дазвол толькі прапаведаваць, а потым парушыў сваю прысягу князю Уладзіміру ў Полацку – і гэта выклікала вайну. Заходнія ж летапісцы з таго самага месца сцвярджаюць, што князь Вячка (???) з Куканоса парушыў прысягу біскупу Альберту, спаліў крэпасць, збунтаваў тубыльцаў – і гэта выклікала вайну...

Тагачасныя летапісцы не саступаюць сягонняшнім гісторыкам. Біскуп не мог прасіць дазвол несці Слова Божае ў нейкага там схізмата, свайго князя ў Куканосе быць не магло, бо той ніколі не адпадаў ад Полацка, да таго ж, немец не ведае, што князь пішацца толькі поўным імем, а не абы-якім Вячкам; гэтак пішацца слуга, а не князь, па гэтай жа прычыне Вячка нікому не прысягаў і яму тое не прапаноўвалі, бо са слугамі не дамаўляюцца, толькі загадваюць ім...

Справа ў адных місіянераў не пайшла. Калі ж першых высланнікаў лэты перабілі, то тыя ж высланнікі адразу перайшлі ў разрад мучанікаў, а ўжо з іх імем пасылаліся на Дзвіну новыя місіянеры – з войскам, флотам і немцамі-каланістамі. Зрэшты, усё было звычайна, як пры любой нармальнай місіянерскай экспансіі таго часу. Адно толькі было навінай: да заснаванай у 1202 годзе крэпасці Рыга на дапамогу прыватнаму войску біскупа Альберта рушыў Ордэн Мечаносцаў – не крыжаносцаў, але менавіта мечаносцаў! Неслі меч, а не крыж. Ішлі не на паганаў, але на схізматаў – працягвалася вайна, пачатая штурмам Канстанціно-

паля! Схізматамі ж былі хрышчаныя падданыя Полацка, славяне і балты, якія мелі сваякоў сярод неахрышчаных славянаў і балтаў, і якія не падлягалі Полацку, а ў летапісцаў ужо сто гадоў мелі агульную назву літва.

Літва паяўляецца ў полацкіх і кіеўскіх летапісах праз лічаныя гады пасля яцьвягаў (магчыма, літвягаў альбо ліцьвякоў). Як высветліў у сярэдзіне 90-х даследчык з Якуцка Іван Ласкоў, які займаўся этнагенезам балцкіх і фіна-угорскіх народаў, літва азначае пяць рэкаў (літ – пяць, ва – рака), а ў пераносным значэнні пяць родаў. На сягонняшні дзень гісторыкі лічаць больш-менш устаноўленыя пяць дастаткова буйных абласцей тагачаснага абшару ад Балтыку да верхняга Нёмана: Жамойція, Аўкштота, Дайнова, Нальшчаны і Дзяволтва. Таямнічыя яцьвягі, якія невядома адкуль паявіліся ў нашых летапісах і невядома калі зніклі, гэта і ёсць добравядомая літва ў іншай транскрыпцыі напісання і вымаўлення, што здараецца ў гісторыі на кожным кроку. Справа ж этнаса альбо крыві яшчэ не раз будзе закранутая ў гэтай кнізе, таму пакінем яе на потым. Тым болей, што нельга дзяліць адназначна, дзе тут славяне і дзе балты, і як далёка прасунулася славянская каланізацыя па Нёмане і Віліі, ці была гэта менавіта суцэльная каланізацыя, ці толькі асобныя выспы славянаў у балцкім моры, а таксама, як гэта пры славянскай каланізацыі ў князёў-каланізатараў балцкія імёны, альбо – ці сапраўды тыя імёны балцкія, гэта значыць, язычніцкія. Больш-менш вядома толькі, што, калі на яцьвягаў хадзілі паходам з Кіева, то супраць Кіева і літва хадзіла на баку Полацка. Літва і Полацкае княства доўгі час мелі саюзныя сувязі, дынастычныя шлюбы, балцкія астраўкі яшчэ сотні гадоў былі на даўно пахрышчанай тэрыторыі, такія ж славянскія астраўкі задоўга да ўзнікнення ВКЛ вядомы на балцкай тэрыторыі, а ўмоўная мяжа паміж тымі і тымі выразна пазначана на карце сучаснай Беларусі суседствам вёсак з назвамі Літва, Ліцьвіны, Крывіны, Палачане. Адным словам, калі на Дзвіне і Вісле паявіліся немцы, іх сустрэлі не так дзікуны ў пушчах, але некалькі народаў, кожны са сваёй дзяржаўнай арганізацыяй, пры гэтым усе яны – адны амаль цалкам, другія ж толькі часткова! – былі хрысціянскімі народамі альбо цесна звязаныя з хрысціянствам суседствам і агульнымі інтарэсамі.

Немцы гладка перасоўваліся ўздоўж Дзвіны, пакуль не наткнуліся на схізмацкі Браслаў і насупраць яго не паставілі свой Дынабург. Крыху горш ішла справа ў выгнаных з Палесты-

ны і Венгрыі крыжакоў, якіх неабачліва запрасілі на дапамогу супраць прусаў мазавецкія князі, але і тыя гадоў за дваццаць прайшлі ад Віслы да Нёмана і наткнуліся на схізмацкае Гродна. Ды і быццам бы толькі паганская Жамойць паміж Дзвіной і Нёманам аказалася не па зубах – у 1236 годзе немцаў моцна пабілі каля возера Дурбе, а ў 1260 годзе каля крэпасці Шаўлі – два Грунвальды на адно пакаленне! Пасля апошняга, немцы паядналіся ў адзіны Тэўтонскі Ордэн – нарэшце была названа справа па яе імю! – і каталіцкае ўзброенае місіянерства змяніла адкрытая нямецкая каланізацыя. Пасля 1260 года немцы вядуць вайну на вынішчэнне, усялякія спробы падначаліць, пахрысціць і г.д. адкінутыя. Нават непапраўны рамантык Гэнрык Сянкевіч справядліва заўважыў, што Ордэн сам не даваў хрысціцца Літве, таму, што тады прападала яго пачатковая ідэя і вылазіў навонак сэнс актуальнай палітыкі: знайсці месца шматлікаму беззямельнаму рыцарству, якому цесна ў Германіі, і ўвогуле збыць на Усход усіх лішніх...

Пабіў жа немцаў гаспадар новай дзяржавы, Вялікага Княства Літоўскага, князь Міндоўг. Кім жа ён быў? Альбо, памінаючы той неаспрэчны факт, што дынастыі не маюць нацыянальнасці „па крыві”, чые інтарэсы абараняў, каму на самай справе належала ВКЛ?

*І ўсе, хто чуў, дзівавалі з таго,*
*што апавядалі ім пастухі.*
Лука II, 18.

Калі летувісы з цяперашняй Літвы гавораць Міндаўгас, то як жа іначай, калі нават Наваградак у іх Нойягардукас, а Гродна ажно Гардзінас! Хаця б, чаму не гаварыць замест Наваградак проста Жоўны, як некалі называлася сапраўды балцкае паселішча на самай высокай строме (323 м ад узроўню мора) на левым беразе Нёмана – тыя Жоўны спалілі мінскія Рагвалодавічы і паставілі тут чарговы „новы гарадок”, якіх на падбітых землях ставілі тады дзесяткамі. І калі нават гэты гарадок вырас да цэнтра Навагрaдскага княства, спрэчнага паміж палачанамі і галічанамі, таксама, як Брэст, Пінск і Тураў, то папярэдніка Міндоўга звалі... Ізяслаў, як пачынальніка полацкай праваслаўнай дынастыі!

Не мог ніяк язычнік быць князем у Наваградку, калі нават быў сваяком Ізяслава і атрымаў княства ў спадчыну! З гэтага вынікае, што варта прыглядзецца да імя Міндоўга (і да іншых імёнаў той самай дынастыі!) – і першае, што прыходзіць у галаву, гэта грэчаскае праваслаўнае імя Міна (дарэчы, вядомы такі праваслаўны святы!) па прозвішчы Доўгі. Чаму не, калі яцьвягі высокага росту ды з выцягнутымі мордамі! Быў жа сярод нашчадкаў Карла Вялікага французскі кароль Піліп Кароткі... А ў нас Міна Доўгі, карацей: Міндоўг.

Гэта ўжо потым, у 1253 годзе ў тым жа Наваградку, заціснуты паміж немцамі, галічанамі, татарамі і мяцежнымі сваякамі, Міндоўг прымае каталіцтва і каралеўскую карону ад Папы Рымскага. Як толькі пагроза мінула, усе немцы-святары былі забітыя! Немцы-інжынеры, наадварот, пакінутыя ў жывых будаваць каменны замак з вежай-данжонам – праваслаўны князь меў рэзідэнцыяй крэпасць тыповай заходнееўрапейскай канструкцыі... Не нейкай маскоўскай ці ноўгарадскай. Нашчадкі ж яго, Войшалк ды Шварн, вядомыя пад быццам бы язычніцкімі імёнамі (хаця той жа Войшалк заснаваў у Лаўрышаве бліз Наваградка праваслаўны манастыр – каб мець сваіх святароў, а не з Кіева ці Галіча!), так прынята лічыць; толькі што Войшалк – гэта Вой Шалёны – апантаны, берсеркіер па-еўрапейску! – а Шварн гэта Сварань, язычніцкі славянскі бог Сварог, дарэчы, такое ж імя ў пазнейшага вялікага князя Швідрыгайла альбо Сварага! Цікавая дынастыйка ў нас атрымліваецца, нават калі з язычнікаў, дык усё роўна з нашых язычнікаў, а не балцкіх. І яшчэ цікава, што і гэтая дынастыя не Міндоўгавічы, але... Гедымінавічы! А той Гедымін заняў месца вялікага князя ажно толькі ў наступным XIV стагоддзі – і вось тут думай, ці паелі Гедымінавічы Міндоўгавічаў, ці ў мешанай дынастыі спачатку славянская галіна ўзяла верх, а потым балцкая – дарэчы, а хто, калі і ў якую веру з іх быў хрышчаны?! – ці проста нашчадкі Гедыміна палічылі выгодным таго Міндоўга не памінаць зусім, бо яго надта ж паміналі немцы, маўляў, у нас з ім быў дагавор, што Папа яму – карону, а ён нам не толькі Жамойць, але ўсё княства, за выключэннем аднаго Наваградка, пажыццёва... І надалей у дынастыі мяшаюцца і балцкія імёны (Нарымунт, Таўцівіл, Кейстут ды Альгерд), і славянскія імёны (тыя ж Віцень ды Вітаўт Вялікі)... Зрэшты, Кейстут ды Альгерд – гэта самыя натуральныя: праваслаўна-грэчаскае Канстанцін ды варажска-славянскае Алег; ну, і гэта яшчэ невядома. Няма ў нас па-

радку, так бы мовячы, ні ў былых дынастыях, ні ў цяперашніх, ні ў старых летапісах, ні ў найноўшых канстытуцыях. Сама зямля гэтая створана, каб кожны цягнуў пад сябе нават мёртвых, праз што не мелі жывыя часу спакойна жыць...

Гедымін замацаваўся як прызнаны гаспадар Вялікага Княства Літоўскага – гэта значыць, уласна Літвы ў тагачасным разуменні: у цэнтры Наваградак, на захадзе Брэст, Гродна і Коўна, на ўсходзе і поўначы Полацак і Віцебск; паміж Гедымінам і татарамі – багны Палесся ўздоўж тысячакіламетровай Прыпяці. Сын яго Альгерд (з братам Кейстутам) пабіў татараў і выгнаў іх з Падолля, Валыні і Кіева – і вось дзяржава яго, Вялікае Княства Літоўскае і Рускае, а сталіца яго ў Вільні; яшчэ Гедымін заснаваў гэту новую, як некалі Міндоўг! Пры Вітаўце новыя землі на ўсходзе, у тым жа важны Смаленск, уваходзяць пад той жа тэрмін рускае, значыць, праваслаўнае, але немец, будучы пабітым пад Грунвальдам, аддаў назад Жамойць з Юрбаркам і Клайпедай – і дзяржава набывае астатні кшталт: Вялікае Княства Літоўскае, Рускае і Жамойцкае! Але тут – пасля смерці Вітаўта – зараз жа пачнецца грамадзянская вайна, таму што на ўсходзе ці захадзе ваяваць пакуль няма з кім (пра гэта пазней).

Паміж часамі Міндоўга і Гедыміна адбылася адна, вельмі цікавая, падзея: як сведчыць летапісец, „Наримунт коли сел на Великом княстве литовском измысли себе герб а всему княству литовскому печать рыцер збройны на кони з мечем” альбо гэта і ёсць герб Пагоня. Цікава тут, што гэты гэрб Нарымунт „измыслил” або распарадзіўся, што ён адгэтуль дзяржаўны – выдумваць не было чаго і для чаго! Родавы герб клана Міндоўга быў „Калюмна” альбо „Тры слупы”, а ўзброеным ваяром на кані ў якасці герба карысталіся Рагвалодавічы... Парадокс жа ў тым, што „паганскі” род мае Калюмну, а гэта стылізаваны арол, як украінскі трызуб, паходзіць гэты арол ажно ад рымскіх ды візантыйскіх арлоў, адкуль арлы нямецкі, польскі ці расійскі, хоць там і прырасла ў выніку мутацыі лішняя галава; „праваслаўная” ж пачаткова ды „літоўская” потым Пагоня – гэта герб якраз паганскі, прыйшоў ён са стэпу і Рагвалодавічам (эх, мая б воля, то лепш-такі Ізяслававічам, бо менш блытаніны!) дастаўся ад... Уладзіміра Святога! У сувязі з тым гэтаксама цікавай здаецца мне адвечная сварка патрыётаў з патрыётамі, чые дзяржаўныя сімвалы больш старажытныя ды больш сапраўдныя!

Зацверджанне полацкай на той час Пагоні дзяржаўным гербам усяго ВКЛ паказальна ў адным: праваслаўна-славянскі накірунак фармавання дзяржавы бярэ выразны верх, але на родавых землях клана існуюць і захоўваюцца істотныя адрозненні.

Напрыклад, менавіта на свае землі (Вільня, Гродна, Брэст) Гедымін запрашае з Еўропы гнаных габрэяў – яму патрэбны рамеснікі і купцы. Пазней Вітаўт асельвае на тых жа землях татараў – яму патрэбныя добрыя ваяры і вернае асабістае войска. Альгерд увогуле дзеліць толькі што сабраную дзяржаву на Троцкае і Віленскае ваяводствы, пры гэтым заходняй часткай фактычна самастойна кіруе яго брат Кейстут. Сярод гісторыкаў на Беларусі чамусьці прынята сцвярджаць, што на тое былі вонкавыя прычыны – Кейстут ваяваў з немцамі, Альгерд з Масквой і татарамі і г.д. На справе ж войска збіралася, як і раней, а паходы ўзначальваў Альгерд – падзел трэба шукаць у нутраных прычынах. Захад і Усход спалучыцца ў адно цэлае ніяк не хацелі, „славянская каланізацыя" асіліла толькі Вільню і Трокі ды захлынулася, проста бракавала людзей на агромністых усходніх абшарах, чаму і спатрэбіліся каланісты, тыя ж габрэі ды татары... Ды і з пашырэннем хрысціянства вакол Полацка і Наваградка – пры Вітаўце на Беларусі практычна няма няхрышчаных! – падзел не зарастае, але толькі... мацнее. Нальшчаны, Дзяволтву і Дайнову хрысцяць не ў праваслаўе, а ў каталіцтва – і справа не ў тым, што была ўжо Крэўская Унія 1385 года, хаця такое хрышчэнне і было адной з яе ўмоваў, але бадай у тым, што на захадзе няма гарадоў, толькі крэпасці, а Полацк і Віцебск не згубілі сваёй сілы, князь Андрэй Полацкі праводзіць фактычна сваю палітыку, робіць усё на карысць не так ВКЛ, як праваслаўнай царквы – з Ягайлам і Вітаўтам варагуе, а паспалітае рушанне ўсяе Полацкай зямлі, тры-чатыры тысячы чалавек, моц на той час! – вядзе на Дон, на Кулікова Поле, біць татараў і памагаць маскоўскаму князю Дзімітрыю... Цесна Гедымінавічам у ВКЛ, няпэўна ў Наваградку, няпэўна і ў Вільні – чужыя на Захадзе, чужыя на Усходзе. Яцьвягі яны чыстай вады...

Гедымін спрабаваў трымаць раўнавагу. Палову дзяцей – усяго меў шэсць сыноў і шэсць дачок! – палову пахрысціў каталікамі і накіраваў на Захад, другую на Усход, ясная справа, ужо пахрышчаных праваслаўнымі. Сам жа... і тут гісторыкі чухаюць патыліцы. Быў паганінам? А як жа з ім мелі справы не толькі суседнія гаспадары, але і святары абодвух канфесій?! Быў хрышчаны? А чаму ж яго не пахавалі, але па старому звычаю спалілі цела на кастры са

свяшчэннага дуба? Пайшоў ён не да хрысціянскага Госпада, але да паганскага Зніча?! Слаба верыцца ў талерантнасць і памяркоўнасць... Сталі праваслаўныя надта шпарка прапаведваць у новапаўсталай Вільні – і павіслі на дубе трое будучых віленскіх мучанікаў; заняліся тым самым немцы-лацціннікі – і чатырнаццаць манахаў павіслі на суседнім дубе пад сценамі сталіцы; апошні ж касцёр самога Гедыміна князь загадаў раскласці на паўдарозе паміж тымі і тымі... Трэба думаць, хрышчаны ён усё ж такі быў (магчыма, нават у абедзве канфесіі, што ўкосна будзе пацверджана пазней яго ўнукамі!), але пайсці з жыцця вырашыў па-старому – каб не даваць нікому прывілеяў, ні праваслаўным, ні каталікам... Канешне, прасцей мець адну канфесію, а не дзве, але, калі хрысціць захад у праваслаўе, то нічога гэта не пераменіць. Мала таго, што немцы не спыняць нападаў, бо для Рыма праваслаўны хрысціянін гэта не язычнік, але горш язычніка – здраднік! Усход жа перахрысціць у каталіцтва – і думаць няма чаго! Імгненна падымуць на мячы, мокрага месца па дынастыі не застанецца...

Перабіраецца Гедымін з ужо праваслаўнага Наваградка на рэчку Вілію, новую сталіцу ставіць, хоць і побач з немцам, які ўжо Коўна двойчы паліў, але лепш так – ні тым сваім, і ні гэтым! – чым сядзець у Наваградку, як у асадзе. Сыны яго, Кейстут з Альгердам, побач з Вільняй ставяць яшчэ адну сталіцу – Трокі, на востраве, на вадзе! – як жа ж, не паспелі Вільню асесці, а там ужо два дзесяткі праваслаўных храмаў і поўна купцоў з Полацка; трэба далей ад іх, на востраў, што на возеры Гальве; сцены трайныя і месца ніякага пад сценамі. Унук яго, Вітаўт, ужо і татараў селіць – быццам бы немца біць! – а пабілі немца, і татарам шляхоцтва, зямлю татарам, веру іх мусульманскую не чапаць, толькі не купляць хрысціян з палону, і жаніцца татарам пажадана з хрысціянкамі, каб дзеці гадавалі па-тутэйшаму... Хітрыя былі тры пакаленні ўладароў віленскіх, на катле з варам сядзелі, а і дзяржаву змацавалі і ворагаў на ўсіх канцах свету пасеклі! Таму і павесіў Гедымін трох праваслаўных ды чатырнаццаць лацціннікаў, каб памяталі, што не ім, але яму гэта зямля належыць, бо з двума гаспадарамі яна прападзе, а што так зрабіў, дык сказана ж было

*і каб прынеслі ў ахвяру*
*паводле сказанага ў законе Гасподнім,*
*дзве галубкі альбо два птушаняткі галубіныя.*
Лука II, 24.

Суадносіны сіл паміж двума птушаняткамі – праваслаўем і каталіцтвам – ілюструе кароткая гісторыя доўгай барацьбы Гедымінавічаў за панаванне над сваёй родавай Імперыяй, чым і было на самай справе шытае белымі ніткамі ды чырвонай крывёй Вялікае Княства Літоўскае. Па волі Гедыміна дзяржаву ўзначаліў яго сын Яўніс – праз год яго скідаюць Альгерд з Кейстутам і замест забіць... высылаюць у тое ж Заслаўе пад Мінскам і даюць яму добрае мясцовае княства! Гэтакі напамінак занадта шчыраму праваслаўнаму, дзе тваё месца – а што Яўніс гэта Іван, Іоанн, тое відаць голым вокам. Па волі Альгерда дзяржаву ўзначальвае яго сын Ягайла, у праваслаўным хрышчэнні Якаў, але як толькі спрабуе ўзмацаваць сваю ўладу, то яго стаўленік Скіргайла... выязджае з Віцебска на здыхотнай клячы, пасаджаны да хваста тварам! За Андрэем Полацкім стаяць гарой Пскоў, Наваград, Масква, Цвер, Кіеў – праваслаўны Усход, незалежна ад фармальнай залежнасці ад ВКЛ ці Залатой Арды, яднаецца дзеля абароны веры – Скіргайла выляцеў з Віцебска гэтаксама, як стагоддзем раней з той жа Цвяры павыляталі татарскія баскакі, зборшчыкі падаткаў. Ягайла змаўляецца з ханам Мамаем аб супольным паходзе на Маскву – сячы, дык пад корань! – але... паварочвае назад за адзін пераход ад Куліковага Поля, і там у 1380 годзе маскоўцы і палачане першы раз пабіваюць шматтысячную татарскую конніцу, падмацаваную... еўрапейскай пяхотай, што навербавалі ў каталіцкіх краінах генуэзскія (генуйскія?) купцы і сваім коштам перавезлі ў свае гавані на вусці ракі Дон! Ягайла павярнуў па той простай прычыне, што ў войску ВКЛ па-ранейшаму з кожных дзесяці харугваў сем-восем праваслаўныя – выступі ён супраць маскоўскага Дзімітрыя і Андрэя Полацкага на баку татараў, яго б свае пасеклі на кавалкі... І ўжо ў 1385 годзе Ягайла сам, без змовы і рокашу, едзе ў Кракаў, хрысціцца другі раз і бярэ нове імя Уладыслаў, потым шлюб з Ядзвігай – і Польшча мае пачатак новай дынастыі... Потым добра вядомая гісторыя з уцёкамі Вітаўта да крыжакоў, грамадзянскай вайной, прызнаннем ВКЛ пажыццёвым уладаннем Вітаўта, Грунвальдам ды Гарадзельскай Уніяй 1413 года. Спынімся на момант толькі на рокашы Свідрыгайлы – уцёк у Маскву, потым спаліў Серпухаў і ўцёк з Масквы, потым змовіўся з немцамі аддаць ім – што цікава! – усе землі ВКЛ, дзе няма праваслаўных, быў схоплены людзьмі Вітаўта і... ізноў, як і Яўніс, не забіты, але кінуты ў падвал крэпасці Камянец! Зноў-такі гісторыкі сцвярджа-

юць, што Вітаўт на жыццё Свідрыгайлы выменяў у яго брата Уладыслава Ягайлы цэлае багатае Падолле... Але ж больш верагодна, што Вітаўт ніяк не мог забіваць Свідрыгайлу – інакш падняліся б усе праваслаўныя абшары, з пункту гледжання Полацка ці Смаленска Свідрыгайла не быў здраднікам, бо аддаў немцам не іх! А вось той жа Ягайла раней не пабаяўся забіць старога Кейстута, бацьку Вітаўта, – Кейстут абапіраўся на захад ВКЛ, на Трокі і Гродна, дзе насельніцтва і баярства ці рыцарства было мешаным, так што Ягайлу іх рокаш быў не страшны, тады ён яшчэ не згубіў падтрымкі Полацка...

Такая была паміж нашымі продкамі згода, талеранцыя, цярпімасць і памяркоўнасць. Мне чамусьці здаецца, што Ягайла пабег аж у Кракаў толькі па той прычыне, што неяк бяссоннай ноччу зразумеў, што нічога тут паяднаць нельга і што гэты кацёл аднойчы выбухне і разнясе сам сябе і ўсіх суседзяў на дробныя кавалкі. І хіба гэта таксама адчувалі – гэта значыць, становішча Ягайлы ў сваім гаспадарстве, – біскупы з Гнезна і Кракава, ужо з тых часоў фактычна кіруючыя ўсёй Польшчай, прынаймней, яе замежнай палітыкай. Канешне, актуальныя выгоды для Польшчы былі відавочныя – няпэўная літва на ўсходзе з яе нападамі (апошні раз Свентакшыскі кляштар рабавалі... тыя ж Ягайла і Вітаўт!, толькі тады не былі яны дзяржаўнымі дзеячамі, бо мелі па дваццаць з лішкам гадоў), цяпер замянялася ў саюзнае ВКЛ, няхай сабе і праваслаўнае працэнтаў на восемдзесят – было трохуу паганаў, патэнцыяльных каталікоў...

Крэўская Унія 1385 года падначаліла ўсходнюю палітыку Польскага Каралеўства ўсходняй палітыцы польскага касцёла. Не ў тым была будучая бяда Польшчы, што ад Ягелонаў яна канчаткова кінула Шлёнск і Паморыю ды рушыла на Крэсы – бяда ў тым, што з таго часу на Усходзе інтарэсы касцёла былі вышэй за інтарэсы Польшчы. І пры Ягайле, і ў наступных стагоддзях, і перад падзеламі, і ў разабраным на тры кавалкі выглядзе, і ў паўстаннях рамантычных, і ў ІІ Рэчы Паспалітай, і да нашых дзён.

І так, пад Грунвальдам у 1410 годзе немец быў пабіты так, што пяцьсот гадоў са зброяй у руках не пераходзіў на правы бераг Нёмана. Наступныя пасля чатырыста дзесятага два гады прайшлі ў патаемных перамовах, і ў 1413 годзе ў Гародлі над Бугам была абвешчана... новая Унія! Пры гэтым Вітаўт пазбаўляўся, так бы мовячы, цвёрдых кайданоў папярэдняй Уніі 1401

года (мельніцкай), але нічога не выйгрываў у параўнані ні з Крэўскай, ні нават з Востраўскай – не выйгрываў, як гаспадар дзяржавы. Таму, што Вялікае княства Літоўскае заставалася часткай канфедэрацыі, а не рабілася самастойным каралеўствам, як тая ж Польшча. Але Вітаўт значна выйгрываў як самадзержац, дыктатар! таму, што прывілеі шляхты на польскі ўзор, „братнія” гербы і роды атрымвалі ў Гародлі толькі каталікі ВКЛ, праваслаўныя не атрымвалі нічога; больш таго – тыя, хто меў дзяржаўныя пасады пры двары ў Вільні ці на правінцыі, іх фактычна пазбаўляліся. Гародля грамадзянскай вайны не выклікала, бо апазіцыі не было каму ўзначаліць – князь Сямён Лугвен быў у Наваградзе, князь Свідрыгайла сядзеў у Камянцы... І здавалася, што цяпер перад верай лацінскай

*кожны дол напоўніцца*
*і кожная гара і пагорак панізяцца,*
*крывізны выпрастаюцца*
*і няроўныя дарогі зробяцца гладкімі.*
Лука III, 6,

– але дзе там! Нават тое, што хітрамудры Вітаўт выправіў пяць тысяч праваслаўнага рыцарства – „дабраахвотнікі”! – на дапамогу гусітам Яна Жыжкі ў Чэхію, бо чэхі далі яму сваю чэшскую карону, а Святы Айцец у Рыме кароны за Вітаўтам не прызнаў і адзін па адным абвясціў супраць гусітаў чатыры крыжацкія паходы, – нават тое спакою на Крэсы не прынесла. Быў ён толькі да смерці Вітаўта ў 1430 годзе, пасля чаго каталікі клікнулі вялікім князем Жыгімонта. Потым, пасля жахлівага забойства яго, палякі адразу рабілі вялікага князя каралём Польшчы! Гэта зробіцца традыцыяй, высвенчанай, ясная справа, касцёлам! Праз які год праваслаўныя перабілі гарнізон Камянца і клікнулі вялікім князем старога Свідрыгайлу... Край разарваўся такі грамадзянскай вайной, прычым на баку каталікоў са Жмудзі біліся польскія харугвы, а на бакуі праваслаўных з Полацка... учарашнія ворагі немцы з Лівоніі. І нават перамога над праваслаўнымі ў вайне і натуральная смерць Свідрыгайлы нічога не перамянілі: былі жывыя праваслаўныя князі Астрожскія, Лукомльскія ды Чартарыйскія і адзін з апошніх праламаў галаву вялікаму князю Жыгімонту, а неўзабаве сам польскі кароль загінуў у бітве

з туркамі пад Варнай – і абедзве краіны, Літва і Польшча, апынуліся зноў без галавы...

Чарговым вялікім князем ВКЛ быў абраны Казімір, сын Ягайлы і праваслаўнай княгіні Сафіі Гальшанскай – ясная справа, імгненна і палякі абралі яго ж каралём Польшчы. Судзебнік Казіміра 1447 года быў першым дакументам, які ўстанаўляў хоць нейкі адносны парадак на Крэсах, бо раней усё вырашалі меч і пятля, якія гісторыкі з чорным гумарам называюць звычаёвым правам – адгэтуль праваслаўныя і каталікі фармальна раўняліся ў правах, гэта значыць, мелі роўнае права займаць дзяржаўныя пасады. Але, паколькі ні тады, ні пазней так і не дамовіліся замацаваць адны канкрэтныя пасады за каталікамі, а іншыя за праваслаўнымі – за гэтыя пасады ішла бесперапынная грызня не толькі паміж кланамі адной канфесіі, але паміж усімі кланамі. Альбо – рэлігійная вайна на Крэсах, хоць і зрабілася „халоднай”, але ж зрабілася таксама перманентнай, а такая вайна награваецца да гарачай пры кожным любым выпадку. Чым і карысталіся адгэтуль усе суседзі – і ворагі, і саюзнікі. Зразумела, у інтарэсах Польшчы, як дзяржавы, было перарваць такое становішча ў самым зародку, таму што „ліцвінскі” бардак і грызня праз пабрацімства найбольш уплывовых фамілій вельмі хутка перакінулася на саму Польшчу, але ж інтарэсы Польшчы на практыцы выглядалі так сама, як інтарэсы касцёла. Палітыка ж каталіцкага касцёла хутка ўва ўсёй Еўропе робіцца больш дынамічнай, больш агрэсіўнай па ўсіх напрамках, у тым жа і на Усходзе. Дадаткова ж алей на агонь льецца і з другога боку...

У 1453 годзе туркі бяруць штурмам Канстанцінопаль – валіцца сталіца праваслаўя. Неўзабаве апошняя з роду Палеолагаў, дачка імператара Сафія, бярэ шлюб з вялікім князем маскоўскім Васілём III – сталіца праваслаўя замацоўваецца на Маскве, а вялікі князь сябе абвяшчае кесарам, царом маскоўскім, нашчадкам Візантыі, сваё ж княства – Трэцім Рымам (другім называлі раней Канстанцінопаль). А задоўга да таго мітрапаліт з Кіева, галава ўсіх праваслаўных Масквы і Літвы, пераязджае з Кіева ў Маскву. Гэтая часовая эміграцыя робіцца з цягам часу сталай; ад таго часу цэнтр праваслаўя не Полацак і не Кіеў, але Масква. Пазіцыя мітрапаліта абсалютна зразумелая – у ВКЛ праваслаўная царква на працягу праўлення Вітаўта і Казіміра зрабілася прымусова-апазіцыйнай, дакладней, з яе зрабілі ворага дзяржавы, на Маскве ж у тыя часы мітрапаліт меў большую

ўладу, чым... сам вялікі князь! Нават пад туркамі кожны чарговы Васіль альбо Іван перад тым, як ехаць у Арду па ярлык альбо дазвол на вялікакняжанне – гэтак у Еўропе васал ездзіў па ленн! – спачатку ехаў да мітрапаліта па блаславенне. Канчаткова такі парадак захоўваўся да часоў ужо патрыярха (патрыярства на Маскве заснавана ў 1589 годзе) Нікана і яго рэформаў, якія выклікалі гэтак званы царкоўны раскол – сам Нікан таксама быў скінуты са свайго месца царом Аляксеем Міхайлавічам, а сын яго, Пётр Вялікі, увогуле патрыярства скасаваў і падначаліў царкву ў Расійскай Імперыі Свяцейшаму Сіноду, альбо, па-цяперашняму, міністэрству ўнутраных спраў і адміністрацыі... Усё гэта прывяло да таго, што ў Маскоўскім Княстве праваслаўе сталася нацыянальнай, а не толькі дзяржаўнай верай – з той пары і дагэтуль у Расіі рускі і праваслаўны гэта адно і тое самае!

Але менш вядома, што апошнія Палеолагі шукалі падтрымкі... у Святога Айца ў Рыме, удзельнічалі ў шматлікіх доўгіх саборах XVI стагоддзя, нават пры пэўных умовах згаджаліся на унію абедзвюх хрысціянскіх канфесій! І Вітаўт Вялікі пасля Гарадзельскай Уніі нейкі час камбінаваў паўстанне самастойнай праваслаўнай царквы, незалежнай ад Канстанцінопаля і тым больш ад Масквы – быў абраны і свой мітрапаліт, серб Цамблак Рыгор, але ж Вітаўт, з прычыны ангажавання ў еўрапалітыку ды жадання радыкальна развязаць канфесійную варожасць у сваім гаспадарстве, захацеў пераскочыць яму за два крокі: і завесці свайго мітрапаліта, і падпарадкаваць яго Рыму праз тую ж унію, прыкладна, як свайго каталіцкага біскупа... Цамблак нават ездзіў у Еўропу на сабор, вёў перамовы з папаю... З гэтага нічога не атрымалася, бо не магло атрымацца – калі ад словаў пераходзілі да справы, унія аказвалася не тое што аднабокай, але на ўмовах Рыма знікала ўсялякая адметнасць праваслаўя, апроч адной: новая уніяцкая царква, хоць і прызнавала ўладу Рыма, але па-ранейшаму разглядалася ніжэй за каталіцкую. Пазней на такіх жа ўмовах заключылі-такі Брэсцкую Унію 1596 года...

Палеолагі нічога не знайшлі ні ў Рыме, ні ў Вільні – хаця па асобных звестках імператар і патрыярх былі згодныя... часова перабрацца з Канстанцінопаля ў Кіеў! – і тады ўгледзелі яшчэ адзін праваслаўны край, а менавіта Вялікае княства Маскоўскае. Дарэчы, як толькі Васіль III пасля шлюбу з Сафіяй абвясціў сваё гаспадарства нашчадкам Візантыі і апорай усіх праваслаўных, пры першай жа нагодзе (хан Залатой Арды Ахмет запатрабаваў

заплаціць дань за дванаццаць задоўжаных гадоў!) разарваў з Ардой, выставіў супраць яе войска і выстаяў тры тыдні на рацэ Угра; татары павярнулі назад. Гэта было ў 1480 годзе – на дату ўвага! – у тым жа годзе выкрыта ў ВКЛ гэтак званая „змова князёў Бельскіх”, мэтай якой было ўтварэнне на праваслаўных землях ВКЛ... незалежнай праваслаўнай дзяржавы! Змова была выяўлена, змоўшчыкі часткова былі пакараныя смерцю, часткова збеглі да Васіля III, а падчас першай маскоўскай вайны ў 90-х гадах XV стагоддзя ад ВКЛ адпадаюць Бранск, Чарнігаў і Гомель. Потым адбываецца „мяцеж Глінскага”, буйнейшага тады праваслаўнага князя, уладара ўсяго беларускага і ўкраінскага Палесся, татарына з паходжання, які дванаццаць (!) гадоў вучыўся і жыў у Германіі ды Італіі. У 1506 годзе, ужо пры вялікім князі Аляксандры, Глінскі пабіў пад Клецкам крымскіх татараў, пасля чаго тыя больш не вялі маштабнай вайны супраць ВКЛ і абмяжоўваліся асобнымі нападамі, але потым... ізноў паспрабаваў ён учыніць незалежную праваслаўную дзяржаву! Спроба ізноў не ўдалася, а сам Глінскі... ізноў уцёк у Маскву.

Заўважым, што ўсе праваслаўныя рокашы адбываюцца менавіта на поўнач ад Прыпяці, гэта значыць, на сучаснай Беларусі – князі Астрожскія, уладары Валыні і Падолля, у гэтым не ўдзельнічаюць; там пакуль што меншы ціск з боку „братоў”-каталікоў...

Ад гэтага часу войны паміж Масквой і Літвой ідуць бесперапынна. У чарговай з іх быў страчаны Смаленск – хоць гетман Астрожскі і пабіў 80-цітысячнае маскоўскае войска пад Воршай у 1514 годзе, у гонар чаго заснаваў у Вільні чарговую праваслаўную царкву і прысвяціў „перамозе над варварамі” (!!!) – але Польшчу гэтыя войны мала цікавяць, хоць ВКЛ і мае быць у стратэгічных планах польскай правінцыяй. У думках касцёла гэта чужыя войны, гэта войны праваслаўных з праваслаўнымі, хоць ужо маскоўцам і да Полацка недалёка, а там і да Вільні чатыры пераходы лёгкай кавалерыі.

Між тым рушыць і Захад. Генуэзец на гішпанскай службе Крыштап Калумб, замест абяцанай каралю Індыі, трапляе ў Амерыку, але, замест абяцанага золата, прывозіць нешта яшчэ горшае – спакусу пра Новы Свет, мрою пра Terra Incognita. Другі вольнадумец, вучоны манах Марцін Лютар, піша пратэст супраць гандлю індульгенцыямі; практычныя немцы адразу кемяць, што, калі за грошы бессмяроцця не купіш, то на ліха тады пла-

ціць касцёлу дзесяціну і ўвогуле навошта біскупам і ксяндзам золата; а калі мацней падумаць, то навошта ў такім выпадку той Рым і Святы Айцец, бо можна ж абраць кожнаму месцу свайго ды яшчэ выбарнага пастара ды пасадзіць яго на цвёрды аклад, як ратмана ў ратушы... Рэфармацыя набывае мацаты ў Германіі, Англіі, скандынаўскіх краінах. Каталікам робіцца цесна, тым болей, што туркі ў 1526 годзе пабілі венграў і дайшлі да Вены ды Львова, так што супроць іх выдаюць усе сілы і сродкі палова Германіі ды ўся Італія. І вось гішпанцы і партугальцы рушаць на другі бок Атлантыкі, а польскі касцёл актывізуе свае намаганні падначаліць Усход, таму, што ёсць небяспека, што менавіта на нічыіх Крэсах зробіць сабе гняздо пратэстанцкая зараза. На касцёл пад парай паміж Бугам і Дняпром ды Дзвіной і Прыпяццю дадаткова ціснуць з двух бакоў – з каталіцкага Захаду і праваслаўнага Усходу. А навонак той Край нібы спіць, бо тут з часоў Вітаўта і да часоў Боны Сфорцы ані зямлю па-новаму ні мералі, ані замкі мураваныя ставілі, ані навукі заводзілі, ані войска парадкавалі, а толькі спалі на неабсяжных прасторах, дзе кіеўская вярста была два разы даўжэйшая за віленскую, а маёнткі нямераныя і цэлы Край першабытны, спалі там і снілася толькі часам, што

*ужо і сякера пры карані дрэва ляжыць,*
*бо ўсякае дрэва,*
*якое не родзіць добрага плоду,*
*ссякаюць і кідаюць у агонь.*
Лука III, 9

Нешта ўсё ж такі рухалася. Прывучылася шляхта пасылаць дзяцей вучыцца ў Еўропу. Ехалі найперш на Ягелонку ў Кракаў – там нават цэлы курс чыталі па-русінску. Дарэчы, тая Еўропа спрабавала Крэсы неяк запарадкаваць, хоць у кваліфікацыі – юрысты як ні як! – і падзялілі нас ясна ды проста: ліцьвін – гэта католік з славянскай часткі ВКЛ, самагіцін (жамойт!) – каталік, але са Жмудзі, а русін – гэта з тых жа славянскіх земляў, але праваслаўны. Тады ж італьянец адзін упершыню ў Еўропе піша Чорная Русь ды Белая Русь – „чорнай” у яго выходзіць Панямонне, а „белай” Полацак, Віцебск і Кіеў. Сягоння шматлікія гісторыкі ніяк паходжанне тых тэрмінаў не вывядуць: то з вопраткі бяруць, то з колеру валасоў, то з веры (адна паганская,

другая хрысціянская!), але ж, паўтараю, гэта пісаў італьянец часоў позняга Сярэднявечча, а ў навуцы тых часоў „белы” азначаў пачатковы, а „чорны” наступны – ну, як папера і чарніла... І так выходзіць, бо спачатку да хрысціянскай веры, гэта значыць, да цывілізацыі прыступіла Полацкае княства, а намнога пазней Панямонне. Адразу заўважым, што той італьянец назву Белая Русь мог пачуць тут сваімі вушамі, а тую Чорную Русь проста дапісаць на грунце свайго еўрапейскага, лацінскага ды універсітэцкага, педантызму – бо ж у праваслаўных хроніках белы азначае слушны, сапраўдны, хрысціянскі; гэта калісьці, яшчэ заснавальнік цяперашняй Расіі, каланізатар Акі і Волгі святы князь Андрэй Багалюбскі называў Белай Руссю падбіты ім Край з Уладзімірам-на-Клязьме і з будучым цэнтрам Масквой; потым гэты Край трапіў пад татараў, таму назва белы, свабодны павандравала на Смаленск, а калі Смаленск падпарадкаваў Вітаўт, то распаўсюдзілася на Полацак, Віцебск і ўсе праваслаўныя землі ВКЛ. На Маскве нас доўга пісалі гэтаксама, як у Еўропе: Митька купец литвин белорусец... Значыць, прыехаў на гандаль з Літвы, ёсць праваслаўнай веры.

Вяртаючыся да шляхты, а потым і да купецтва ды іх дзяцей на кракаўскай Ягелонцы: калі хто з нашых даязджаў толькі да Кракава, то па вяртанні дамоў ён так і заставаўся з польскай мовай, а калі ж хто пасля Ягелонкі ехаў яшчэ далей і там бачыў, што на Польшчы Еўропа не канчаецца, то ён, пасля вяртання дамоў, гаварыў па-беларуску, а пісаў на лацінскай – так тады ўся Еўропа пісала! Магілеўскі шляхцюк Мікола Гусоўскі са сваёй „Песняй пра зубра” – пісаў яе ў Рыме, дзе быў дыпламатам ВКЛ! – быў другім шырокавядомым у Еўропе аўтарам ува ўсіх славянскіх народаў. Пасля самога Яна Гуса...

Сын полацкага купца Францішак Скарына, пасля Ягелонкі, атрымаў ступень доктара ў венецыянскай Падуі ды працаваў у Залатой Празе. Адтуль прывёз у Вільню першы пераклад Бібліі на старабеларускую мову, друкарскі станок, рыштунак, майстроў і ўсё астатняе...

– А навошта нам гэта? – здзівіліся ў Вільні такія ж, як Скарына, праваслаўныя. – Мы і так па латыні можам... Хамаў ты нам не бунтуй Божым словам! Едзь на Маскву, няхай там чытаюць, там латыні няма...

Быў бы гаспадар у тым ВКЛ, то на базе аднаго Скарыны заснаваў бы ў Вільні універсітэт – як некалі Ядзвіга ў Кракаве

(дарэчы, дзеля гістарычнай справядлівасці Ягелонку варта пераіначыць на Ядзьвіжанку, бо наш Ягайла да канца жыцця так і быў непісьменным, а шматлікія мовы ведаў на слых!). Але дзе там! Каму тое патрэбна, адным жабракам, бо свайго сына я і сам да той Італіі адаслаць вучыцца магу... Не, хамы маюць у гаўне сядзець, няма чаго ім да караля скакаць, таму мы парадзім, бо то мы Радзівілы, а быдла мае ў гаўне сядзець... Скончылася тым, што Скарына ледзь уцёк з Масквы, дзе яго (не без падставаў!) узялі за каталіцкага агента, не знайшоў месца ў Вільні і... славіў далей еўрапейскую навуку ў Каралеўцы, Капенгагене і Празе. Тут, на Крэсах, ён так і застаўся двойчы пачынальнікам. Першы друкар і першы непатрэбны...

Між тым, Усход, пасля ліквідацыі татарскага ханства ў Казані, заваёвы усяе Волгі, а таксама памежных з Еўропай Наваграда і Пскова, апошніх праваслаўных рэспублікі з уласнай царквой, асмялеў і адкрыта рушыў да Балтыку. Іван IV Жахлівы высылае рускіх і татараў на Нарву, Рэвель, Дэрпт, Рыгу і... Полацк. І ўзяты Полацк штурмам зімой 1563 года! Казацкія і татарскія загоны даходзяць да Вільні, а гетман Радзівіл мае чатыры тысячы войска супраць дзесяткаў тысячаў у царскіх ваяводаў.

Палякаў гэта мала абыходзіць – таму, што яны інспіравалі гэты развал і раскол на Крэсах. Палякі дамагаюцца і вымагаюць у 1569 годзе Люблінскую Унію – у выніку на Крэсах даходзіць да новага расколу: ВКЛ канчаткова разбіваецца на Беларусь і Украіну – усё, што на поўдзень ад Палесся, у тым жа Кіеў, інкарпаруецца ў Карону; Літвою ж застаецца Жамойць і Беларусь – плацдарм для вайны з Масквой за Інфлянты, за знішчаны ўжо ваяводамі Івана IV некалі грозны Лівонскі Ордэн. Вайна за Інфлянты азначае пачатак... вайны за інкарпарацыю ўсяго Вялікага Княства Літоўскага, Рускага і Жамойцкага ў склад нават не Рэчы Паспалітай, але проста Польшчы. Упершыню ясна праяўляецца ідэя, сфармуляваная калісь князем Баляславам Харобрым ды св. Войцехам...

Інкарпарацыя ж мае рабіцца паводле старога рымскага, а пазней касцельнага прынцыпу – крок за крокам. Спачатку дзяржаўная унія і падпарадкаванне Літвы Кароне, потым рэлігійная унія і падпарадкаванне праваслаўнай царквы каталіцкаму касцёлу. У Польшчы ў гэты час – да Ягелы – біскаралеўе, а яна адважваецца на наступальныя акцыі! Але ў тым нічога дзіўнага: кароль ужо даўно і безнадзейна выбранец, паміж выбарамі га-

лоўным ёсць прымас, а галоўны паміж выбарамі і вызначае выбранца.

Пасля 1569 года ВКЛ у якасці дзяржавы існуе толькі праз адно чалавечае пакаленне, пакуль сярод паноў-рады яшчэ ёсць праваслаўныя Астрожскія ды кальвіністы Радзівілы. Як толькі да ўлады даходзяць іх дзеці-каталікі, вучні езуіта Пятра Скаргі, то дзяржава ВКЛ знікае і ператвараецца ў велізарную правінцыю Рэчы Паспалітай. А нейкія там свае грошы, суды, войска не маюць ніякага значэння, таму што і сама Рэч Паспалітая даўно разабраная на кавалкі ды трымаецца толькі касцёлам. Са смерцю ў 1633 годзе канцлера ВКЛ Льва Сапегі, гісторыю ВКЛ можна лічыць замарожанай на вякі. Усялякая Белая і Чорная Русь знікаюць з еўрапейскай палітыкі, а калі ўсплываюць, дык толькі з прычыны чужых спекуляцый. Пазнейшыя міжусобіцы – усе гэтыя казацкія, турэцкія ды шведскія войны, усе рыцары і паненкі, героі і здрайцы, паны і хамы – ёсць толькі сюжэты і персанажы для школьных падручнікаў, папулярнай літаратуры ды масавага кінематографа. Пра такія часы добра глядзець кіно з голымі дзеўкамі, бясконцымі папойкамі, стралянінай і мардабоем. Не дай Бог у такія часы жыць...

Сотні гадоў не мянялася тут нічога – у 1772 годзе магнатэрыя і шляхта сеймікавала ў тых жа кунтушах і жупанах, што і ў 1648 годзе; трэба думаць, хам на зямельцы і рамеснік за варштатам за тыя гады абадраліся яшчэ горш. Спачатку людзі грашылі, потым каяліся, потым зноў грашылі, золата адлівала крывёй, а кроўю сплывала золата. Люд жыў у цемры граху – хіба таму ніколі не будавалі на Беларусі столькі кляштараў і касцёлаў, як за тыя сто пяцьдзесят гадоў. Невядома – дайце веры! – ці гэта дух перамог цела, але

*пыталіся ў яго людзі:*
*што ж нам рабіць?*
Лука III, 10.

Што датычыцца Берасцейскай Царкоўнай Уніі 1596 года, то пасмею зрабіць некалькі заўвагаў, якія нікому не даспадобы.

Па-першае, ідэі Пятра Скаргі пра яднанне ўсіх хрысціянаў перакруцілі да немагчымасці. Скарга крытыкаваў праваслаўную іерархію (заўважце, іерархію, а не канфесію!) па некалькіх пунктах: перадаюць свае царкоўныя чыны і месцы ў спадчыну; кла-

дуць на свае вёскі найбольшыя падаткі; не вучаць вернікаў Слову Божаму і самі яго не ведаюць; служаць не дзяржаве, але апекуну ўласнаму; не дапускаюць у манахі і школы бедных, бо тыя не маюць чым заплаціць і г.д. Потым усё перакруцілі – замест іерархаў пагражалі анафемай усёй Царкве; замест зменаў унутры Царквы патрабавалі падпарадкавання Рыму; замест паяднання каталікоў і праваслаўных на роўных навязалі падпарадкаванне праваслаўных нават не Святому Айцу ў Рыме, але... мясцовым каталікам; новапаўсталыя уніяты былі людзьмі другога гатунку, як і праваслаўныя...

Берасцейскую Унію 1596 года падмацавалі подпісам толькі чацвера праваслаўных іерархаў. Тым не менш і канцлер Сапега, і кароль зацвердзілі яе такім чынам, што ўся праваслаўная Царква была абвешчана па-за правам! Уніяцкі біскуп Езафат Кунцэвіч перахрышчваў на Унію агнём і мячом – пакуль у 1623 годзе яго не забілі віцебскія мяшчане... Дарэчы, той храм, што цяпер у Полацку называюць Сафійскі Сабор, пастаўлены уніятамі на падмурках сапраўднага сабора ажно з XI стагоддзя, які быў зруйнаваны... тымі ж уніятамі! З палемічнай беларускай літаратуры таго часу („Прамова Мялешкі", „Ліст да Абуховіча" і інш.) неяк выпадае ў нашых гісторыкаў ліст канцлера Льва Сапегі да біскупа Езафата Кунцэвіча, незадоўга да забойства апошняга. Там сказана даслоўна, што праз вашу Унію цэлы край спакой згубіў і сам з сабой вайну распачаў, што не хочуць людзі той Уніі,
а пра спосабы вашы навароту да яе „у нас уси суды скаргами забиты" – і далей піша канцлер, што, каб ведаў наступствы Уніі той, то ніколі б не даў згоды на яе... Ліст быў прыватны і стаў апублікаваны толькі праз сотні гадоў. Леў Сапега палічыў за лепшае сваю памылку не выпраўляць, бо ад таго было б толькі горш. Ён толькі меланхалічна адзначыў у дыярыушу:

*Не выжыве доўга дзяржава тая,*
*дзе большасць дурная перамагае...*

Дарэчы, забароненая ў 1596 годзе праваслаўная Царква існавала ў ВКЛ у падполлі, база яе перамясцілася на Украіну, праваслаўе стала ідэалогіяй запарожскага казацтва, нацыянальна-вызваленчага руху... Калі коратка, то менавіта тады ўкраінцы аддзяліліся ад беларусаў. Беларусы перайшлі на уніяцтва, ці

змужычыліся, а часткова кінуліся ў каталіцтва, украінцы ж (па-за Львовам і асобнымі магнатамі накшталт Ірамія Вішнявецкага) скансалідаваліся з гультаёў і казакоў (па-татарску кайсак – гэта разбойны чалавек на шляху!) у рэспубліку Запарожская Сеч. Геаграфічны тэрмін украіна (ускрай) менавіта тады робіцца геапалітычным.

Адразу пасля Уніі... перайшоў Прыпяць і Дняпро атаман Севярын Налівайка (імя і прозвішча выключна з Крэсаў) і два гады гаспадарыў у Магілёве і Пінску. То было папярэджанне – гетман Багдан Хмяльніцкі з рэгулярнай казацкай арміяй меў прыйсці пазней... А ў ВКЛ, скурчаным да памераў сягоняшніх Летувы ды Беларусі, забарону праваслаўя адмяніў Сойм 1633 года: у тым годзе памёр Леў Сапега, у тым годзе Рэч Паспалітая скончыла чарговую вайну, але, хоць і адстаяла зноў забраны Смаленск, ды толькі кароль адмовіўся ад тытула... „царя московского и Всея Руси"! Тытул жа той прышчапіўся пасля ўмяшання новаскаталічаных паноў ВКЛ – Сапегі, Мнішака, Лісоўскага etc. – у грамадзянскую вайну у Масковіі 1605-18 гадоў, узяцця Смаленска, узяцця нават самой Масквы і... адступлення пад ударамі народнага войска Мініна і Пажарскага, набранага на грошы купцоў з Волгі! Цікава, ці мог тады хто ў ВКЛ ці Кароне сабраць за свае грошы войска па-за магнатэрыяй ды касцёлам?! Ці была такой безнадзейна „дзікай" тая Масковія, якую збіраліся не толькі „канфедэраваць", але паважна далучыць да Уніі?!

„Легалізацыя" праваслаўя 1633 года была справай добрай, але спозненай – праз пятнаццаць гадоў пачаўся патоп.

Калі ў 1648 годзе Багдан Хмяльніцкі (у сваім „Агнём і мячом" нобелеўскі лаўрэат Генрык Сянкевіч забыў дапісаць, што Хмяльніцкі ведаў дзевяць моваў, а стажыраваўся ў мушкецёрскіх палках французскай арміі, дзе быў асобны полк запарожцаў!) распачаў адкрытую вайну супраць Польшчы, на Беларусь рушылі толькі дапаможныя казацкія загоны пад камандаю... беларуса Марціна Крэчаўскага! Само прозвішча паказвае, што ён з падмагілеўскага Крычава, Крэчата на тутэйшы манер – трэба думаць, што і палкі яго былі набраныя не з нейкіх там „украіньских козаків", але з тутэйшых, іначай наўрад ці меў бы тут поспех. Пры ўсіх казацкіх пагромах – па асобных ацэнках, у 1648–54 гадах на 4-мільённай Беларусі загінула дзвесце тысяч чалавек! – няма звестак пра масавы партызанскі рух у адказ, хаця пасля ўварвання рэгулярнай маскоўскай арміі годам пазней большасць пе-

рапіскі цара Аляксея Міхайлавіча з ваяводамі датычыцца не рэгулярнай арміі ВКЛ, але „шишов”, мужыцкай і шляхецкай партызанкі! З Украіны прыйшлі назад тыя, хто не хацеў прымаць Унію і аддаваць грошы касцёлу – пагромы датычыліся жыдоўскіх гетаў у местах і мястэчках (гандаль, ліхвярства, дзяржаўныя падаткі і г.д.) ды хутароў і фальваркаў новаакаталічанай шляхты; яшчэ перад маскоўскай вайной шляхта ачысціла Старадубскі павет і ўвогуле ўвесь левы бераг Дняпра, куды не вярнулася нават пасля канца вайны ў 1667 годзе! Не вярнулася, бо не было каму вяртацца, Крычаўскае староства скарб дзяржавы за бясцэнак прадаў Радзівілам...

Тры гады спатрэбілася рэгулярнаму войску Януша Радзівіла Пяруна, каб узяць штурмам (!) Пінск, Рэчыцу, Мазыр, Рагачоў, Быхаў і нарэшце ў 1651-м разбіць Крэчаўскага ды нават на кароткі час заняць Кіеў... Але гэта быў часовы поспех. Пакуль ішла вайна на Беларусі, гетман Хмяльніцкі набраў пяцьдзесят тысяч войска і ў пыл разграміў каронную армію пад Батогам – цяпер у Маскве на яго місію глядзелі зусім іначай. У 1654 годзе дайшло да саюза паміж царом і гетманам, а летам у межы ВКЛ уварваліся чатыры арміі, разам больш ста тысяч чалавек; праз год была ўзятая Вільня, а ў каронную Польшчу ад Гданьска ўварвалася шведская армія...

У выніку вайны 1654–67 гадоў ВКЛ канчаткова страціла толькі Смаленск. Аднак страты ў людзях былі непараўнальныя: з блізу 4 млн. чалавек засталося – паводле рэвізіі 1671 года – 1 млн. 850 тысяч... У палон у Маскву вывелі да 300 тыс. мяшчанаў – вясковых не бралі! – у выніку насельніцтва самой адно Масквы вырасла на дваццаць адсоткаў; таксама павялічыліся Ніжні Ноўгарад і інш. І выведзены былі пераважна рамеснікі: збройнікі, рэзчыкі, кафляры і г.д. Такім чынам, беларускае мяшчанства практычна знікла – і беларусы ператварыліся ў вясковы люд. Тая іх частка, што ўзначальвала атрады „шишов”, была прынятая ў шляхецтва – зразумела, пры ўмове пераходу ў каталіцтва... Вось адкуль яны ды іх дзеці ўчынілі ў наступным стагоддзі суцэльную папіюху ажно да часоў забораў! „За Саса едлі од паса”... Гэта была ўжо не шляхта ў поўным значэнні гэтага слова, толькі частка іх цягнулася хоць да езуіцкай навукі, а да Еўропы, куды раней ехалі вучыцца купцы – як той жа Скарына! – цяпер і са „шляхты” траплялі адзінкі!

Карацей кажучы, ад вайны за праваслаўную веру больш усяго выйгралі маскоўскі цар (Смаленск, „людишки”, здабыча) ды... каталіцкі касцёл Рэчы Паспалітай! Пасля вайны, не тое, што няма ніякай апазіцыі ні каталікам, ні уніятам, але ўцалелыя праваслаўныя ледзь здольныя былі трымаць мізэрныя драўляныя цэркаўкі па вёсках! У нейкім сэнсе выйграла на той катастрофе ВКЛ нават габрэйскае зямляцтва – нягледзячы на велізарныя страты ў людзях, іх працэнт сярод насельніцтва ВКЛ ажно павялічыўся, таму, што на літоўскую пустку масава эмігравалі габрэі з цэнтральнай Еўропы, пераважна з Германіі; тады менавіта габрэі на Беларусі пераходзяць на ідыш, да вайны большасць з іх гаварыла... па-беларуску, як і нашы татары! Але, найбольш выйгралі ад вайны мясцовыя магнаты – Радзівілы, Сапегі, Агінскія... Пасля вайны, Радзівілы мелі 16 местаў, 583 вёскі, 25 староставаў, агульны даход дасягаў 20 млн. злотых у год, што ў паўтары разы перавышала бюджэт цэлай Рэчы Паспалітай! Не горш выглядалі справы ў Вішнявецкіх, Глябовінаў, Пацаў, Сангушкаў, Ябланоўскіх – між іншым, следам за Радзівіламі са сваімі даходамі ішло... віленскае біскупства. Здавалася, што ў такіх умовах поўная каталіцызацыя Беларусі ёсць справай дваццаці гадоў альбо аднаго дзейснага пакалення. Але, насамрэч, разам са значным змяншэннем працэнта праваслаўных, працэнт каталікоў... практычна не ўзрастаў! Затое, праз дваццаць гадоў, уніяты складалі ўжо дзве траціны ўсяго насельніцтва Беларусі!

Пры гэтым цікава, што не было асобных раёнаў, як у канфесійна падзеленай Германіі, дзе б панавала тая ці іншая канфесія – каталікі, уніяты і праваслаўныя больш-менш роўна насельвалі ўсю Беларусь. Больш праваслаўных вёсак было на Палессі, Падляшшы і Магілёўшчыне, больш каталіцкіх вёсак (амаль выключна біскупскіх, а не шляхецкіх!) у радыюсе 200-300 км ад Вільні, але пераважала ўсё ж вёска уніяцкая – шляхта ж у пераважнай большасці была ўжо каталіцкай; кальвіністы альбо праваслаўныя напрыканцы XVII стагоддзя былі рэдкім выключэннем... Такім чынам, касцёл каталіцызаваў не Беларусь і не спаленую зямлю, але верх грамадства, ды і то верх не найлепшай якасці, калі гаварыць пра паходжанне, мараль і, тым больш, адукацыю. Сягоння на Беларусі гэты старадаўні падзел кідаецца ў вочы нават без ведання гісторыі і статыстыкі таго часу – у местах стаяць каталіцкія мураваныя касцёлы, у мястэчках і большых вёсках мураваныя уніяцкія цэрквы (у XIX стагоддзі часткова

перароблены на касцёлы, а ў большасці выпадкаў на цэрквы праваслаўныя!), а праваслаўныя цэркаўкі з дошак стаяць менавіта па вёсках; мураваныя праваслаўныя цэрквы захаваліся хіба толькі на Гродзеншчыне (Сынкавічы і інш.), новыя ж паявіліся ў сярэдзіне XIX стагоддзя і ставіліся коштам бюджэту Расійскай Імперыі.

І ўсё ж такі – чаму касцёл змарнаваў шанц цалкам акаталічыць Беларусь?! Ніхто ж не мог яму тады супрацьстаяць...

Мог! – аказваецца. І супрацьстаяў! Супрацьстаяла таму новаакаталічаная шляхта з тутэйшых... Ну, бо пераводзіць мужыка на „панскую” веру значыла раўняць яго з панам, а пан гэты ўсяго дваццаць гадоў назад яшчэ казакаваў і быў мужыком. Навапечаная шляхта ненавідзела сваё мінулае... З гэтым мы сустрэнемся і ў другой палове XIX-га і ў XX-м стагоддзі.

Краем упраўлялі і кіравалі магнаты, якія канчаткова аддзяліліся ад шляхты. Шляхта трапіла да іх у прыгон („на службу”!), а ўжо хамы былі прыгоннымі прыгонных. Цікава, што гэтаксама трапілі ў падвойны прыгон і выведзеныя ў Масковію беларускія мяшчане: баярын Шарамецеў прадаваў сваіх палонных па рублю сваім прыгонным мужыкам – неўзабаве яго мужыкі зрабіліся ўдалымі гаспадарамі, першымі буржуа ў Маскоўскай дзяржаве, а сын баярына, Барыс Шарамецеў, у часы Пятра Вялікага зрабіўся першым фельдмаршалам новай расійскай арміі. Магнатэрыя ж на Літве Рэчы Паспалітай да канца XVII і пачатку XVIII стагоддзя выйшла з-пад усялякага кантролю, наймала на службу сваю і чужую шляхту, і гаспадарыла, як хацела... Пасля „Вечнага міра” з Масквой у 1686 годзе і „апошняга рыцара”, караля Сабескага, на Крэсах пачынаецца і цягнецца ажно да часоў Напалеона і Аляксандра бесперапынна грамадзянская вайна паміж магнатамі, вайна ўсіх супраць усіх, бо багацейшы Радзівіл трымаў толькі шляхту і немцаў-наймітаў, а крыху бяднейшыя Сапега ці Агінскі ў сваю міліцыю набіралі і ўзбройвалі... сваіх жа прыгонных халопаў.

– Было штосьці манархічнае ў маёнтку Радзівіла ў Нясвіжы. Маўчу пра баляванні, на якія збіралася ўся Літва, маўчу і пра тэатр, пра аркестр і багацце дома, бо толькі адна міліцыя налічвала восем тысяч усяляк узброеных... Ахвотнікаў знаходзілася мноства, бо мала хто з каралёў меў столькі гайдамакаў і казакаў, – апіша ў мемуарах пра двор і палац „Пане Каханку” Радзівіла адзін з яго гасцей, Б. Міхалоўскі.

Сусветная Вайна тагачасанай Еўропы паміж Расіяй і Швецыяй, куды паступова ўцягнуліся Турцыя, Данія, Прусія, Англія і Галандыя ў 1700-21 гадах на Крэсах прайшла незаўважальна. Тут ішла свая вайна... Зімой 1700 года каля Смаргоні і Ашмянаў двойчы біліся арміі Сапегаў і Агінскіх – першы быў за „незалежнасць" ВКЛ з рукі шведскага караля, другі за тую ж „незалежнасць" з рук маскоўскага цара! – кожная з армій лічыла тысяч пад дваццаць, а палова з іх засталася вечна ляжаць на тых, замеценых снегам, пагорках... Параўнаем – той жа зімою каля крэпасці Нарва на мяжы Расіі ды Эстоніі Карл XII меў не больш 10 тыс. чалавек, а Пётр I не больш трыццаці тысяч. У самой Рэчы Паспалітай у тую вайну зноў былі два каралі – саксонскі курфюрст Аўгуст Моцны і познанскі ваявода Станіслаў Ляшчынскі.

Маскоўская армія пад камандаю нямецкіх афіцэраў у 1709 годзе шведаў пабіла, праз год цар Пётр меў і Рэвель, і Рыгу – з Рэчы Паспалітай яго войскі часова выйшлі, пайшлі толькі па патрабаванню Турцыі, пасля няўдалага паходу цара ў Малдову летам 1711 года. Але, як рускія выйшлі, так і ўвайшлі зноў...

Пад рускім кантролем у 1717 годзе быў першы „нямы Сойм" – нямы, бо дакументы толькі зачытваліся і галасаваліся аднагалосна, без ніякага абмеркавання. Сойм пацвердзіў каралеўскія правы Аўгуста II, але... адначасова пацвердзіў „вольнасці" шляхты (ажно да права на рокаш ці ўзброенае паўстанне супраць таго ж караля!) ды славутае на цэлы свет сваёю дурнотай liberum veto. Колькасць рэгулярнай арміі абмяжоўвалася да васемнаццаці тысяч у Кароне і шасці тысяч у Літве. Так і хочацца думаць, што апошнюю лічбу пісаў які-небудзь Радзівіл – каб яго міліцыя была большай... І дэ-факто, і дэ-юрэ Рэч Паспалітая прызнавала сябе пад патранатам, паўсталай пару гадоў раней Расійскай Імперыі (Пётр I Вялікі абвясціў сябе імператарам пасля Ніштацкага мірнага дагавору са Швецыяй); у 1720 годзе пастановы гэтага „нямога Сойма" гарантавала таксама Прусія, а ў 1726 годзе Аўстрыя... Гэтак адбыўся нулявы падзел Рэчы Паспалітай; нулявы, бо намінальна і межаў ніхто не чапаў, а кароль быў той самы, а яшчэ намінальна, бо першы падзел прынята лічыць ад 1772-га... Але на тым... ізноў выйграў касцёл! Роўна праз год, у 1718-м, апошні пасол на Сойм некаталік пратэстант Пятроўскі па патрабаванню віленскага (!) афіцыяла кс. Анцуты быў выкінуты навечна. А Канвакацыйны Сойм 1733 года прыняў канстытуцыю, якая забараняла некаталікам не толькі быць пас-

ламі, але і засядаць у трыбуналах, служыць у войску і займаць дзяржаўныя пасады. Нават з уніяцкіх мітрапалітаў у Сэнат Рэчы Паспалітай быў дапушчаны як пятнаццаты па ліку С. Растоцкі, а было гэта ажно ў 1791 годзе, калі было ўжо позна дзяліцца і наогул позна на ўсё...

Калі ў 1756-63 гадах ішла чарговая еўрапейская вайна з удзелам Расіі і Прусіі (тады рускія першы раз бралі Берлін), то армія Румянцава і Салтыкова ішла праз „польскія” Курляндыю і Жмудзь, а кватаравала і грабла правіянт з фальваркаў і вёсак над Віслай; адгэтуль фактычная ўлада ў Варшаве належала амбасадару Расійскай Імперыі... А тут, як на грэх, вакол бязмерных Крэсаў паселі прасвечаныя манархі Фрыдрых II, Марыя-Тэрэза ды Кацярына II Вялікая. І хоць новым каралём быў пастаўлены пасол Рэчы Паспалітай у Санкт-Пецярбурзе беларус Станіслаў Аўгуст Панятоўскі з фаміліі Чартарыйскіх, адзін з першых і незабыўных каханкаў імператрыцы Кацярыны, але лёс Крэсаў цяпер залежаў толькі ад часу, за які манархі паміж сабою дагаворацца. Беларусам называю караля Станіслава, бо цяперашнім беларускім патрыётам надта да спадобы, што дзед і бабка Панятоўскага пісалі свае прозвішча праз наша „у”, а не праз польскае „дабл ю”... Першым падаў голас (і мемарандум імператарцы) расійскі амбасадар у Варшаве князь Рапнін:

– Матушка, абрыдла мне сядзець без толку ў той Варшаве! За кожную дробязь плаці кожнай пасольскай сволачы з гнілога мястэчка – і хоць бы бралі, работу рабілі! А то ж бяруць і не робяць...

І кароль пруські Фрыдрых II, які рэзка памяняў генеральную лінію, і больш з Расійскай Імперыяй не ваяваў, але сябраваў, гнуў тое ж самае, толькі прапанаваў і аўстрыякаў не пакрыўдзіць (ён нядаўна адрэзаў ад сваякоў па крыві і мове багатую Саксонію! – і таму хацеў, каб коштам Рэчы Паспалітай за яе заплаціла Кацярына II). У Вене і хацелася і калолася; аўстрыякі яшчэ пару гадоў круцілі хвастом, бо тагачасны Кракаў ніяк не цягнуў на кампенсацыю за тагачасны Дрэздэн. Між тым, кароль Стась і яго маладое энергічнае таварыства – тыя думалі, што гэта кароль! – узяліся за рэформы: школы там розныя, у тым жа афіцэрская; Акадэмія Мастацтваў, тэатры, музеі... Дава-ай, пазяхаюць Браніцкія з Патоцкімі, шуруй... Той кароль Стась далей: на liberum veto здумаў наехаць... Стой! – кажуць Браніцкі з Патоцкімі ды бягом да амбасадара князя Рапніна... А Рапнін караля Стася паклі-

каў – і даў прачухон! Станіслаў Аўгуст пакрыўдзіўся і напісаў скаргу ажно ў Санкт-Пецярбург...

– А ці не крута бярэш, бацюшка?! – строга паглядзела на выкліканага для кансультацый амбасадара князя Рапніна імператрыца Кацярына II і ўжо тады Вялікая. – Казала я табе: пашукай спачатку каго сярод тых нашых дысыдэнтаў на кандыдата ў каралі, а потым ужо пары гарачку! Хай кароль Стась спачатку ўладку сваю падмацуе багнэтамі нашымі, на якіх сядзіць, а потым мы сваяго паставім. Мы прыяцельскую дзяржаву на захадзе мець павінны...

Беларускі фактар, панове! Вось ён – здрадлівы беларускі фактар!!! І то ад каго?! Ад курвы-немкі!!!....

– Матушка! – збялеў князь Рапнін. – Ды я ўвесь Магілёў перабраў разам з суфраганам нашым, усе цэрквы аблазіў, да Кіева-Пячорскай Лаўры пісаў, каб прыслалі на размову хоць аднаго шляхціча нашага... Дзе там к чорту! Няма!

– А хто ж тыя дысыдэнты, каго мы баронім? – шчыра спытала Кацька.

– Хамы, – шчыра адказаў Рапнін.

– Ну, хай ужо лепш тады кароль Стась будзе, – уздыхнула царыца.

– Кароль Фрыдрых Вармійскае біскупства хоча, – пастрашыў князь.

– Абы прапанаваў першы, – сказала Кацярына. – Тады і мы возьмем кавалак сабе. Ну, хоць бы да Дзвіны і Дняпра... Трэба нарэшце ад Смаленска просты рачны шлях на Балтык і на Чорнае мора мець, ды і бацюшкі нашы праваслаўныя паству і капітал свае павялічаць!

Быў 1772 год. І паўстала ў Рэчы Паспалітай, аслупянелай ад такога забору без вайны, банальнае пытанне: што ж рабіць?!

*Ён казаў ім у адказ:*
*у каго дзве адзежыны, то дай таму, хто*
*не мае; і ў каго ёсць ежа, рабі тое самае.*
Лука III, 11.

Рускія, прускія і аўстрыяцкія войскі хадзілі па ўсёй Рэчы Паспалітай і рабілі, што хацелі... Але ж мясцовая шляхта ўмудралася іх нейкім чынам адрозніваць! Ну, бо ж рускія рабавалі толькі маёнткі паводле зацверджанага Рапніным спісу (хамскіх

вёсак, ясная справа, нічый спіс нават не памінаў!); „галодныя” прусакі часалі ўсіх падчыстую частым грэбенем; аўстрыякі ж не рабавалі зусім, а толькі бралі падарункі, бачыце, яны не білі барскіх канфедэратаў, чым займаўся генерал Сувораў, але дапамагалі тым уцякаць ад прусакоў і рускіх – за гэта той Сувораў уступіў з аўстрыякамі ў перастрэлку і выклікаў міжнародны скандал паміж саюзнікамі... Праз гэта ж ён трапіў на вока самой Кацярыне Вялікай: немка сама, на дух не пераносіла немцаў – пазней гэтаксама Леў Давыдавіч Бранштэйн альбо Троцкі на дух не пераносіў жыдоў-аднакроўцаў... Не адным выдатным палякам ці беларусам цесна ў сваёй нацыі!

Падзелы 1772, 1793 і 1795 былі лагічным канцом Рэчы Паспалітай – паўстанне ж Касцюшкі было пачаткам новай Польшчы. Новай не ў сэнсе Канстытуцыі 3 мая 1791 года, бо той Акт – так паміж намі – меў не шмат новага, але ў тым сэнсе, што лёс Краю адгэтуль вызначалі не касцёл і не магнаты, нават не заможная шляхта... Той Андрэй Тадэвуш Банавентура Касцюшка – маці яго была праваслаўная, таму сына хрысцілі спачатку ў царкве (па-сапраўднаму!), а потым у касцёле (бо праваслаўнаму нідзе не было дарогі, а Касцюшкі зямлі амаль што не мелі!) быў адным з першых беларусаў у дзеях ужо XIX стагоддзя. Следам можна называць Панятоўскага з 1812 года, Савіча, Валовіча, Эмілію Плятэр, Канарскага, Каліноўскага, Врублеўскага, Дамброўскага, Пілсудскага, Іваноўскага, Дзяржынскага... Беларусамі ізноў-такі называю іх паводле іх паходжання ды псіхалагічнага складу, а яшчэ таму, што кожны пры пэўных абставінах сам сябе называў беларусам альбо старадаўнім ліцьвінам – гэта абое рабое.

Паўстанне Касцюшкі на Крэсах выглядала, як чарговая грамадзянская вайна: былы барскі канфедэрат С. Касакоўскі быў ужо генерал-лейтэнантам рускай службы і пільнаваў парадку ў Вільні, дзе яго і павесілі паўстанцы другога тутэйшага, палкоўніка Якуба Ясінскага, якога той жа Т. Касцюшка хутка быў змушаны адхіліць ад камандавання з прычыны залішняга якабінства ды ліцьвінскага сепаратызму...

У час вайны 1812 года і Лістападаўскага паўстання 1830 года той беларускі альбо ліцьвінскі фактар прасочваецца слаба. Палеміка вакол яго абвастраецца паміж тымі датамі – у 20-я гады ў Віленскім Універсітэце, напярэдадні справы філаматаў і філарэтаў. Апроч шырокавядомага І. Лелевеля з яго гарачым

польскім патрыятызмам быў там і уніят прафесар Міхал Баброўскі, родам з Падляшша... Той у Супраслі і ў іншых месцах начытаўся старых друкаў (у тым жа самога Скарыны!) і рукапісаў „рускими езыком и словы”, лексіка і структура якіх цалкам адпавядала таму, як гаварылі вяскоўцы на яго радзіме і далей – пад Гроднам і Вільняй – і яшчэ далей – пад Мінскам, Магілевам, Полацкам, Мазыром, Брэстам... Зрэшты і шляхта дома гаварыла амаль што гэтаксама. Прафесар М. Баброўскі спецыяльна праехаўся па Чэхіі і Славакіі, Харватыі ды Чарнагорыі і пераканаўся, што „руским езыком” гавораць не толькі тут, а друкуюць не толькі ў Маскве і Санкт-Пецярбурзе. Потым прафесар Баброўскі добра перакапаў тыя забітыя вёскі, сярод якіх вырас, і высветліў, што ягоны Супрасль ёсць скрайні заходні пункт беларускага этнасу, а скрайні ўсходні пункт таго ж этнасу – недзе пад Смаленскам... Калі ў лістападзе 1830 года пачалося паўстанне ў Варшаве, на Віленскім Універсітэце выбухла авантура: „Што вам тут трэба?! – крычаў Баброўскі на сваіх учарашніх калегаў, польскіх патрыётаў. – Ідзіце туды, адкуль прыйшлі! У сваю сапраўдную Польшчу...”

Не спяшайце яго асуджваць за „здраду” і „верноподданничество” – прафесар Баброўскі за свае крамольныя (!) словы быў выдалены з Універсітэта царскай адміністрацыяй і высланы простым святарам у глухую вёску на гістарычную радзіму... Расійская Імперыя нават у 1830 годзе не збіралася „обрусить” хаця б Літву, не тое, што ажно Польшчу – Імперыя дабівалася толькі, каб ліцьвіны і палякі служылі Расіі гэтаксама, як даўно ўжо служылі нямецкія бароны з Эстоніі ды Латвіі, ці грузінскія князі ды армянскія купцы. А вось гэтага дзівака Баброўскага, не ўздымаючы лішняга пылу, трэба было паціху прыбраць як можна далей і надзейней.

Так ці інакш, але заўважым: удзел беларусаў у еўрапейскай палітыцы робіцца толькі пасля таго, як лёс Краю вырашаюць ужо не ачумелыя магнаты і не рэлігійныя фанатыкі, але маладыя людзі з малазаможнай шляхты, у якіх няма ні зямлі, ні багацця, а таму для іх паняцці Айчына і Свабода не ёсць пустым гукам; і спадзяюцца яны толькі на сябе, на ўласны розум, не абцяжараны гістарычнымі традыцыямі, з якімі тую Айчыну самі раздалі на тры кавалкі іх дзяды і прадзеды.

Пералом гэты адбыўся дзесьці пасля паражэння Лістападаўскага паўстання 1830 года, можа, напярэдадзень Вясны На-

родаў 1848 года... Адзін з вядучых ідэолагаў радыкальна-рэвалюцыйнага руху цэлай Еўропы і лідэр расійскіх сацыялістаў Аляксандр Герцэн – дарэчы, цесна звязаны з наступным, Студзеньскім паўстаннем 1863 года – у сваіх мемуарах успамінаў першую сваю высылку да падуральскай Вяткі, дзе ён сустрэў ссыльных палякаў 1830 года. Герцэн піша, што палякі былі вельмі розныя – багатыя атрымвалі з радзімы добрыя грошы, бедныя ж літаральна галадалі. Мясцовыя рускія адносіліся да іх гэтаксама, як да астатніх ссыльных: у Вятцы былі ўсе ссыльныя альбо нашчадкі ссыльных, нават чынавенства, афіцэры, жандары і сам губернатар, хоць чым-небудзь ды праштрафіліся ў цэнтральнай Расіі і трапілі сюды... Але палякі не мелі ні з кім ніякіх кантактаў, многія з іх за дзесяць гадоў у Расіі не ўмелі (не хацелі ўмець?) ні слова па-руску і г.д. Герцэн піша, што такім было практычна ўсё пакаленне 1830 года, а зусім іншыя адносіны паміж палякамі і рускімі ды агульныя інтарэсы тых і тых рэвалюцыянераў пачынаюцца толькі з канца 40-х гадоў, з пакалення С. Канарскага; потым ужо быў З. Серакоўскі ды іншыя...

Упершыню ад часоў да Люблінскай Уніі беларускі фактар ізноў праяўляецца ў Студзеньскім паўстанні 1863 года. Але спачатку трэба адзначыць другі фактар, падзел паўстанцкіх уладаў на „белых” і „чырвоных” альбо на нацыянал-дэмакратаў і сацыялістаў-рэвалюцыянераў – удзел у гэтым паўстанні не толькі летувісаў, беларусаў і ўкраінцаў (найбольш вядомыя кс. Мацкявічус, К. Каліноўскі і А. Патабня), а нават рускіх афіцэраў, што ў 1830 годзе было не да ўяўлення, тлумачыцца наяўнасць моцнай менавіта сацыяльнай плыні ў польскім нацыянальна-вызваленчым руху. „Белыя” і „чырвоныя” былі і ў Варшаве, і ўВільні, але, калі ў Варшаве дамінавалі „белыя”, то на гістарычнай Літве верх узялі „чырвоныя”! Пасля 1863 года Я. Дамброўскі ды В. Врублеўскі ўзначальвалі армію камунараў у Парыжы ў 1871 годзе, а куды б занесла К. Каліноўскага, каб той не даў сябе павесіць у Вільні, а выехаць у той жа Парыж і да пары да часу пісаць мемуары – гэтак ён зрабіў бы для свае Беларусі значна больш! – аднаму Богу вядома... Нават яго куды менш радыкальныя паплечнікі, Я. Дамброўскі ды В. Врублеўскі, былі не толькі супрацоўнікамі, але блізкімі прыяцелямі першых камуністаў, К. Маркса і Ф. Энгельса. Будучы ўжо дыктатарам Літвы, той К. Каліноўскі троху суцішыўся, а ў якасці толькі камісара Гродзенскай губерні – палявога камандзіра па-цяперашняму – зусім расперазаўся: на яго

загад вешалі за „недапамогу” не толькі праваслаўных святарнікаў (паводле апошніх падлікаў сучасных гісторыкаў з Масквы і Гродна, такіх налічваюць семнаццаць чалавек!), але і „сваіх” браткоў-шляхцюкоў, і мужыкоў нават, якія не хацелі даваць ежу ці коней! Гэты Кастусь далёка б пайшоў... Хіба таму цяпер хваляць яго беларусы не за дыктатарства, але за першую беларускую газету Mużyckaja Praŭada...

Пачатак беларускага падпольнага друку яшчэ ў 1860 годзе заклаў у Гродне і Беластоку інжынер-чыгуначнік Браніслаў Шварцэ, па крыві адначасова немец, француз і паляк – хіба на падставе яго рапартаў і згадзіўся потым Варшаўскі Жонд на выданне „Мужыцкай праўды”, трэба ж было, калі не перацягнуць на свой бок, то хоць нейтралізаваць мужыка... Тая дваістасць першай беларускай газеты, як з шапкі вушы! Беларускай мовай і лацінскім шрыфтам № 6 „Мужыцкай праўды” заклікае хама, якога ў 1839 годзе біскуп Сямашка павярнуў назад на праваслаўе, вярнуцца да Уніі – маўляў, гэта ад праваслаўя ўсе новыя падаткі ды іншыя беды, а як будзе ізноў Унія, дык беды адпадуць самі сабой... Неяк сумніўна, каб сепаратыст ды камуніст К. Каліноўскі заклікаў сваіх улюбёных беларускіх мужыкоў падпарадкавацца польскаму касцёлу, чытай, польскаму пану – ён жа сам загадваў вешаць што паноў, што мужыкоў, бо тыя не спяшалі за ім да светлай будучыні! Сумніўна, што менавіта К. Каліноўскі першы беларус, бо ані дзеячы нашы пачатку XX стагоддзя, ні палітыкі Беларускай Народнай Рэспублікі зусім не паміналі і не ўзвышалі К. Каліноўскага – памянулі яго і заадно з Вікенція Канстанціна зрабілі Кастуся – хоць сам ён ніколі так сябе не называў – менавіта бальшавікі ў 1923 годзе ў Мінску: драма Яўгена Міровіча так і называлася – „Кастусь Каліноўскі”... Справа ў тым, што сам Каліноўскі сапраўды не быў палякам, але наўрад ці быў і беларусам – хутчэй камуністам. Гэта не выдумка, але таксама нешта накшталт рацыі. Гэта толькі пачыналася тады, узмацнела пазней, а існуе па сённяшні дзень – і каб толькі на Беларусі...

Цікавыя і вельмі трапныя назвы дзвюх партый 1863 года – белыя і чырвоныя. Адзіны польскі бела-чырвоны штандар разадраны, пры гэтым „белыя” ў Варшаве, а „чырвоныя” ў Вільні: Карона і Літва, палякі і „тэж-палякі”, багацейшыя і бяднейшыя, Польшча і Крэсы, Польшча А і Польшча Б альбо „панская Польшча” ды „савецкая Беларусь”...

Беларусь была паважна ўспамянутая не так Каліноўскім, як яго асноўным канкурэнтам, генерал-губернатарам Віленскай губерні і камандуючым акругай М. Мураўёвым: той адразу заўважыў, што сацыялізм Каліноўскага больш небяспечны для Расійскай Імперыі, чым чысты польскі сепаратызм. Бо сепаратызм мог адарваць адну правінцыю, а сацыялізм жа разваліць усю Імперыю... І Мураўёў надаў вельмі паважнае значэнне таму Каліноўскаму, на загад генерал-губернатара была створана „камісія палкоўніка Ратча”, следчага справы Каліноўскага, якая першай у Расійскай Імперыі пачала дэталёвае вывучэнне Беларусі як не польскай, але і не рускай правінцыі; „камісія Ратча” фактычна прызнала гэты Край за асобны.

Тое ж самае назіралася і з другога боку. У Кракаве ў 1854 годзе – пачатак Крымскай вайны, інтэрвенцыя ў Расійскую Імперыю яе датагачасных саюзнікаў Вялікабрытаніі і Францыі ды поўная яе ізаляцыя – Вінцэнты Поль выдае паэму „Крэсы”, пра гераізм аднаго ротмістра ў паўстанні 1830 года паміж Дняпром і Збручам; потым сам Юльюш Славацкі апявае ўжо „блэнкітнэ поля Украіны”... Палякі з Кракава і Познані, маючы Галіцыйскі Сэйм і фабрыкантаў накшталт Цагельскага, лічылі сябе чамусьці свабоднымі – бо ў параўнанні з палякамі з падрасійскага Царства Польскага ды Крэсаў; гэтак і ў польскай думцы замацоўвалася, што тыя Крэсы не зусім польскія, але – о, парадокс! – Польшчы належаць... Пачынаўся экспарт нацыянальна-вызваленчага руху з нямецкай і аўстрыяцкай частак былой Рэчы Паспалітай на частку расійскую. Зрэшты, у тых „польскіх Пьемонтах” у Прусіі і, асабліва, у Аўстрыі не было на той час нічога нікому дзіўнага, існавалі аднак два адрасы таго экспарту: ці на Крэсы Польске, ці на Летуву, Беларусь ды Украіну... Да таго ж, справа ўскладнялася тым, што летувісы ды ўкраінцы мелі хоць нешта: адны Данялайціса з яго „Чатырма порамі года”, другія свежага Тараса Шаўчэнку з яго „Кабзаром” ды „Гайдамакамі”. Беларусаў ж не заўважалі, бо Адам Міцкевіч, Ян Чачот, Тамаш Зан і ўсё іх пакаленне пісалі пра Беларусь па-польску... Крэсы як новае паняцце імгненна замацаваліся ў свядомасці шляхцюкоў з-над Нёмана і Віліі, бо адлюстроўвалі мілы іх сэрцу погляд на гэты Край: паляк то пан, а не паляк то хам! Фармавалася з многіх былых ліцвінаў – вечных перабежчыкаў ад слабога да моцнага! – фармацыя крэсавах палякаў альбо касцельных палякаў, што яшчэ больш праясняе праблему. Касцельны паляк ёсць па-

лякам толькі ў нядзелю ў касцёле – астатнія шэсць будніх дзён ён тутэйшы, такі самы, як усе...

1863 год быў гістарычным шанцам усіх народаў на захадзе Расійскай Імперыі, а шанц гэты быў менавіта ў адзінстве на грунце сацыялізму. Цар Аляксандр II, калі накіроўваў М. Мураўёва ў Вільню, гаварыў яму даслоўна:

– Польшу мы уже потеряли, постарайтесь сохранить хотя бы Літву...

Гэта гаварылася ў той час, калі рускія войскі разбілі найбольш буйныя злучэнні паўстанцаў, а сам Мераслаўскі вярнуўся на эміграцыю!

І гэта тым не менш было недалёка ад праўды. Супрацоўнік М. Мураўёва, а потым блізкі да імператара Аляксандра II генерал П. Чарэвін, які ў 1863 годзе быў „першым дарадчыкам” М. Мураўёва ў Вільні, піша ў сваіх пазнейшых мемуарах наступнае:

– На час прыбыцця М. М. Мураўёва ў Вільню 14 мая 1863 года Заходні Край увесь быў ахоплены паўстаннем. Гаварыць, што сяляне не прымалі ўдзелу ў мяцяжы, а частка шляхты нядобразычліва глядзела на гэту справу, могуць толькі тыя, хто зусім не ведае Краю (падкрэслена мною – А. Ч.). Адны толькі стараверы сапраўды заставаліся вернымі свайму абавязку... Але, што значылі гэтыя некалькі тысяч душ на 8-мільённае насельніцтва, калі нават габрэі ўсяляк садзейнічалі паўстанню... Маўчу я аб праваслаўных сялянах Краю – бо нічога не магу сказаць на іх карысць. Паводле статыстыкі, гэтае насельніцтва было вельмі шматлікае, але, як было ў сапраўднасці каталіцкім да Уніі, такім і засталося. Такім і працягвала быць праваслаўе пасля пераводу яго ў 1839 годзе назад на праваслаўе ад Уніі... Адзіны касцельны арган быў больш красамоўным для селяніна, чым усе доказы праваслаўнага святарства (падкрэслена мною – А. Ч.)”.

Далей генерал П. Чарэвін падрабязна апісвае, як М. Мураўёў запрасіў да сябе віленскага біскупа Красінскага (высланага адразу ж у Вятку!) і ўсіх віленскіх ксяндзоў і патрабаваў ад іх сваім словам спыніць мяцеж у Краі, пакуль ён сам не хоча ліць кроў і спыняць яго сілай! Бліскучая рэпліка! Генерал-губернатар М. Мураўёў, празваны „Вешальнікам” – пры гэтым не зусім справядліва, бо на яго загад павесілі сто дваццаць сем чалавек за два гады (літаральна: пяцёх у месяц); паўстанцы ж пакаралі смерцю за гэты перыяд каля дзвюх тысяч, а казакі без усякага суду, следства і загаду сваіх афіцэраў перабілі больш дваццаці

тысяч; сапраўды, гнеў народа – гнеў Божы... – значыць, Мураўёў цудоўна ведаў, што тутэйшы не чытае лісткі паўстанцаў і не слухае абяцанкаў улады, але ў бядзе слухае ён ксяндза і бацюшку! Толькі ў бядзе, бо калі ўсё добра і ёсць што жэрці, то халоп нікога не слухае, а толькі выглядае, дзе што б сцягнуць ці нарабаваць бярэмя... Біскуп Красінскі пачаў нешта гаварыць генерал-губернатару ў сваё апраўданне, маўляў, касцёл не займаецца палітыкай і г.д. Тут М. Мураўёў уставіў папярэднюю шпільку: а вось сярод вас ёсць пралат Баўкевіч, мой добры знаёмы з Гродна, яшчэ з 1830 года, яму я веру, а вам не... Увесь клір паглядзеў на Баўкевіча з нянавісцю: губернатар купіў усіх адной фразай! Пралат быў да канца свайго жыцця дыскрэдытаваны... А следам М. Мураўёў пусціў галоўную шпільку:

– Вы, гаспада, князі – але князі не гэтага свету! І чым хутчэй вы апыніцеся там, – тут ён паказаў пальцам у столь, – тым лепш для вас! Аб гэтым я паклапачуся...

Пасля гэтага ўвесь касцельны запал знік. На ўсялякі выпадак М. Мураўёў справадзіў да той жа Вяткі і Красінскага – на пачатку паўстання біскуп... папрасіў быў дазволіць яму выехаць на курорт пад Рыгу! Мураўёў дазволіў: біскупа пагрузілі ў вагон і... завезлі на Вятку. Загадам Мураўёва былі пакараныя смерцю сем ксяндзоў (Каліноўскі загадаў жа павесіць семнаццаць праваслаўных бацюшак!) – Ішору і Фалькоўскага, адпаведна з Ішкольны і Жалудка, за тое, што зачыталі з амбону пракламацыю Жонда паўстанцаў у Варшаве, астатніх жа пяцёх – у тым Бжозку і Матулявічуса – за партызанку са зброяй у руках і арганізацыю партызанкі. Усіх жа ксяндзоў лічылася больш трох тысяч, з іх выслалі ў Сібір дваццаць сем, а пад Урал яшчэ сто трыццаць дзевяць (паводле таго ж П. Чарэвіна – А. Ч.). Астатніх генерал-губернатар проста настрашыў...

Апошнія бai партызан з рэгулярнай арміяй адбываліся на Беларусі ўжо летам 1863 года – рэшткі злучэнняў Лянгевіча, Нарбута, Врублеўскага, Траугута спрабавалі прабіцца ў карэнную Польшчу. Ужо вясной 1864 года М. Мураўёў падаў Аляксандру II мемарандум наконт будучай палітыкі ў Беларусі: ён прапанаваў зачыніць рыма-каталіцкія кляштары, якія прымалі ўдзел у мецяжы, зачыніць такія ж касцёлы, капліцы і г.д.; прапанаваў зачыніць усе касцёлы, пабудаваныя пасля 1815 года без дазволу ўладаў, бо на прыватных землях – у большасці гэтыя касцёлы будаваліся

паміж праваслаўнага асяроддзя, а большасць з іх не магла набраць і паловы патрэбнай лічбы парафіянаў.

М. Мураўёў прапанаваў скасаваць канкардат з Ватыканам, лічыў той канкардат састарэлым глупствам (у 1860 годзе паўстала Італьянскае каралеўства, на чале якога стаялі сацыялісты, а папа Пій IX быў... выгнаны з Рыма!); М. Мураўёў прапаноўваў неадкладна канфіскаваць у скарб дзяржавы зямлю і маёнткі ўсіх мяцежнікаў, і не прадаваць іх быле-каму, але надзяліць імі мясцовых сялянаў незалежна ад канфесіі; М. Мураўёў прапанаваў тэрмінова завесці ў цэлым Заходнім Краі спецыяльныя жандармскія ўправы з афіцэрамі ад губерні да воласці ды адначасова... адмяніць ваеннае становішча і вывесці з Краю войскі, а казакоў тэрмінова!

Аляксандр II дзіка ўзрадаваўся і падмахнуў рэзалюцыю: „Делайте все, что считаете нужным...” Адзіную такую за ўсе дваццаць шэсць гадоў свайго панавання! А праз менш чым паўгода генерал М. Мураўёў... быў адасланы ў адстаўку: яму нават на далі забраць тыя маёнткі шляхты, якія ўжо мелі быць канфіскаваныя!

Сярод крэсовай шляхты, што вынікае з пазнейшых цьмяных мемураў, кружляла легенда, быцам бы пад Аляксандра II, аматара дамскіх ножак і бацькі пяці шлюбных ды васьмі пазашлюбных дзяцей, лягла ў Санкт-Пецярбурзе нейкая перабяганка з Крэсаў, „другая Валеўская”... Лягла сабе і лягла – кесару кесарава, а жонцы жончына. Толькі праект М. Мураўёва, які меў дзевяць шанцаў на поспех супраць аднаго, быў адхілены бадай па іншых прычынах... Больш таго – ён не мог быць не адхілены!

Чамусьці прынята лічыць, што ў кожнай імперыі ёсць нейкая тытульная нацыя. Так бы мовячы, Расія для рускіх... Менавіта на тым і пакаўзнуўся рускі патрыёт М. Мураўёў, які марыў не пра вялікую Імперыю, але пра вялікую Расію. Але ж любая імперыя стаіць на захопе і рабаўніцтве! Кіруе ёй банда альбо фамілія ці дынастыя (на сіцілійскім дыялекце, трасянцы італьянскай і арабскай моваў, мафія!) – ёй пляваць на любы народ, у тым жа і на тытульны... Само сабой, што супраць М. Мураўёва – а ў 1863 годзе за яго здароўе па ўсёй Расіі ў цэрквах стыхійна служылі малебны, як у 1812 годзе за цара Аляксандра і фельдмаршала Кутузава! – паўсталі палякі пры царскім двары, пусціў у ход усе свае сродкі касцёл, але ж туды далучыліся і шматлікія немцы, шматлікія нашчадкі французскіх эмігрантаў, свае служывыя не-

багатыя чыноўнікі і афіцэры – тыя самі мецілі ехаць на Заходні Край і нахапаць там канфіскаваных маёнткаў! У Расіі наспяваў палітычны крызіс, той М. Мураўёў сваёй выпераджальнай адданасцю Расіі пазбаўляў яе пануючы клас яго спакойных прывілеяў, быў у некаторым сэнсе горшы за сацыялістаў ды палякаў! На тым гэта быў палітычны канец Мураўёва-Вешальніка...

Змяніў яго генерал Патапаў... Божа! Як тады пілі і балявалі на Крэсах! Як лакомліва бралі „на лапу”! Усе будучыя расійскія мільянеры, у тым жа трымальнік абароннай прамысловасці Пуцілаў і нафтовы кароль з Баку армянін Манташыян (Манташев!) пачыналі пры Патапаве дробнымі чыноўнікамі на Крэсах... Калі Патапаў у Вільні начаваў дома, жонка адзначала гэта ў дзённіку, а камердынер (ён жа агент расійскай контрразведкі!) пісаў пра тое спецыяльны рапарт свайму тайнаму начальству... Неяк новапрысланы абсальвент Пецярбургскага універсітэта сказаў губернатару ў вочы горкую праўду.

– Молодой человек! – абурыўся Патапаў. – Сударь мой! На том вся Россия стояла и стоять будет, ибо от сих, – ён пацёр вялікі палец аб паказальны, так рускія просяць грошы, – пошла русская земля!

Патаптаў быў бы тут вечна і прапіў бы Крэсы ў дым. Толькі што не выйшаў з чарговага запою, прастудзіўся, захварэў і... памёр. Жыў чалавек (пакуль быў патрэбны), а потым узяў ды памёр... Хіба і тут не абышлося без нашай крэсавай гасціннасці.

Канчаючы з М. Мураўёвым, трэба сказаць, што напаследак ён паспеў-такі „прабіць” імператарскія Указы ад 1 студзеня 1864 года пра забарону „лацінскага” друку – на вуліцах Вільні паявіліся шыльдкі „Говорить по польски запрещается!” – і 10 снежня 1865 года, пра забарону купляць зямлю каталікамі. Але пры Патапаве Указы фактычна не дзейнічалі – дзесяць гадоў патапаўшчыны знявечылі ўсе намаганні Мураўёва; паколькі ж на хабар пайшлі вялікія грошы, то і на хама пайшлі вялікія казённыя падаткі ды панскія паборы.

Яшчэ перад паўстаннем, у 1855 годзе было закладзена ў Вільні Таварыства Землеўладальнікаў; адразу ж пасля амністыі 1883 года на яго базе Ю. Монтвіл засноўвае Віленскі Зямельны Банк. Найбольш сціслa і ясна пра яго дзейнасць сведчыць карэспандэнт газеты „Московские новости” ў 1892 годзе:

– „Віленскі Зямельны Банк прымае пад заклад выключна польскія маёнткі. Ён трымае ў сваіх руках усе зямельныя багацці

дзевяці польскіх губерняў (падкрэслена мною – А. Ч.) і стаіць на варце польскіх інтарэсаў Краю. На Банк нельга глядзець як на камерцыйнае прадпрыемства. Ён ёсць самай буйной палітычнай сілай у Краі, а галоўная ягоная задача – захаваць польскія маёнткі ў польскіх руках".

Сам Ю. Монтвол крытыкаваў і сацыялістаў, і артадоксаў – нават супер-каталіка віленскага біскупа Эдварда Ропа, але тым і тым... даваў грошы, бо гэта ж былі палякі! Нават выцягваў з-пад следства баевікоў ППС пасля нападу на паштовы вагон у Дукштах, але для біскупа „прабіў" замест высылкі ў Сібір хатні арышт. Хыццёвае credo Монтвіла складалася з банальнае быццам бы фразы „Хто не быў сацыялістам да дваццаці пяці гадоў, той не мае сэрца – а хто застаўся сацыялістам пасля дваццаці пяці гадоў, той не мае розуму!". На практыцы ж гэтакі псеўдаеўрапейскі пазітывізм (сюды ж можна дадаць Э. Ажэшку і іншых) ва ўмовах закансерваванага сярэднявечча і дзікай нацыянальна-рэлігійнай мешаніны вёў толькі да ўмацавання на Крэсах палітычных дзівакоў ды яшчэ больш небяспечных радыкалаў усіх магчымых і немагчымых накірункаў. І ў такім закансерваваным сярэднявеччы, праз якое капіталізм за ноч пралятаў чыгункай з Варшавы ў Маскву і з Санкт-Пецярбурга ў Адэсу, трапляючы сюды сацыялістычныя ідэі ўспрымаліся тут усяго толькі як рабункі мужыкоў...

Адрозненні, здавалася б, ворагаў – радыкалаў з габрэйскіх мястэчак і служачых у царскай паліцыі, зямельных магнатаў і вясковых галадранцаў, багатых мяшчанаў са шляхты і беспрацоўных „русскоязычных" семінарыстаў – былі хіба ў тым толькі, каму мае належаць кавалак. На Крэсах не толькі бедныя, але і багатыя былі сацыялістамі, бо галоўныя для іх былі не рэформы гаспадаркі, але перадзел на сваю карысць таго, што ёсць!

Той Віленскі Зямельны Банк пана Монтвіла гэтак нахабна дзейнічаў на абшары ажно дзевяці губерняў, бо ён цудоўна ўпісаўся ў сістэму агульнарасійскага рабавання вызваленага з прыгону яшчэ ў 1861 годзе агульнарасійскага мужыка. І палітычным цэнтрам Краю гэты банк зрабіўся таму, што гэты Край – Коўеншчына, Валынь і Падолле – быў Краем мужыцкім. У яго рабаванне хітрамудрыя праваслаўныя банкіры з Санкт-Пецярбурга, Варшавы (!) і Масквы (пераважна жыдоўскага паходжання) зацягнулі нават... сацыялістаў! Паралельна сістэме дваранскіх зямельных банкаў, адным з якіх быў банк Монтвіла, засноўвала-

ся быццам бы апазіцыйная сістэма сялянскіх зямельных банкаў. Імперыя ж праз свае праваўвыя нормы забяспечвала куплю-продаж зямлі выключна праз гэтыя, быццам бы прыватныя, банкі, а праз дзяржаўныя крэдыты для гэтых банкаў і розныя працэнты платы за крэдыт (сялянскія банкі, як Мінскі ці Гродзенскі Пазямельныя, плацілі дванаццаць адсотак гадавых, а дваранскія, як Віленскі, толькі чатыры, а пазней шэсць!) не толькі зарабляла на спекуляцыі сродкі на пакрыццё вечнага бюджэтнага дэфіцыту, але і сродкі на ўтрыманне дваранаў-паразітаў, якія за адно пакаленне з гаспадароў і землеўладальнікаў ператварыліся ў смярдзючых рэнтыераў, якіх свет не бачыў...

На Крэсах сітуацыя ад агульнарасійскай адрознівалася тым, што тут яшчэ і пакарысталіся збожжавым крызісам канца 80-х гадоў XIX стагоддзя, калі танны імпарт з Канады, Аргенціны і Злучаных Штатаў збіў у чатыры (!) разы цэны на збожжа на еўрапейскім і расійскім рынках. У канцы 80-х ды пачатку 90-х мужык прадаваў зямлю гэтаксама прыблізна ў чатыры разы танней, чым заплаціў за яе праз выкуп ад прыгонных абавязкаў у 70-я гады. Розніцу ў цэнах пакрывала... дзяржава – для таго і была створана падвойная сістэма зямельных банкаў: сялянскія скуплялі зямлю па сапраўднай цане, перапрадавалі дваранскім, а тыя перапрадавалі шляхце па цане значна ніжэйшай за рынкавую... Калі ж мужык звяртаўся ў дваранскі банк (калі гэта ўдавалася!), то кола круцілася ў адваротны бок: зямлю куплялі па ніжэйшай цане (ну, якасць глебы не тая, і г.д.), потым яе праз сялянскі банк заганялі суседу таго ж мужыка па цане сапраўднай. Гэтак падрабязна распісана зямельную спекуляцыю, бо на Крэсах ліцьвінская шляхта польскай веры не мела тады іншых крыніцаў узбагачэння! Дакладней, маючы такую „халяву”, шляхта нават не займалася пошукам другіх крыніцаў даходу – скажам, Лодзь перажывала тэкстыльны бум, але на Беларусі „малая Лодзь” паўстала ў Беластоку, на ўскраіне Польшчы, далей на ўсход „пяць беларускіх губерняў” – Гродзенская, Віленская, Мінская, Віцебская і Магілёўская – маглі пахваліцца наступным: папяросная фабрыка ў Гродне (жыд Янкель Шарашэўскі), буйнейшая ў Расіі паперня ў Добрушы пад Гомелем (браты Вайнэры і Бранштэйн, сваяк будучага бальшавіка Троцкага), фабрыка тэкстылю „Двина” ў Віцебску (славуты расійскі фабрыкант Сава Марозаў), першы ў Расійскай Імперыі электрычны (!) трамвай у Віцебску (бельгійская Электрык Компані) і г.д. 9-мільённы Край на-

лічваў паводле перапісу 1897 года трыста сорак тры фабрыканты і банкіры (супраць трыццаці васьмі тысяч (!) у Царстве Польскім альбо Кангрэсоўцы, якая афіцыйна менавалася ўжо „Привислинским Краем” альбо Беларусь „Северо-Западным”!) – гэтакай нібы моцнай была „беларуская” буржуазія. Тутэйшая шляхта на пазітывізме Монтвіла і спекуляцыях усіх, хто не лянівы, сядзела і спала, як Айчыну прадаўшы!

Крэсы мелі яшчэ дзве паскудныя асаблівасці.

На Беларусі, на канец XIX стагоддзя дзейнічала чатырыста трыццаць вінных заводаў, якія выраблялі выключна саракапрацэнтную гарэлку. З прычыны дрэннай якасці (гналі з бульбы, а не са збожжа і бурака, як на Волзе і на Украіне!) і жадання сэканоміць на транспартных выдатках, пераважная большасць яе рэалізавалася для ўсіх жадаючых на месцы. Рэформа прэм’ера Сяргея Вітэ і ўвядзенне дзяржаўнай манаполіі на продаж гарэлкі толькі пагоршылі становішча; па-першае, маёнткавыя бровары павялічылі выпуск і пагоршылі якасць (бо манаполь!), а скарб купляў так і так (за хабар!); па-другое, праз той хабар добрая палова гарэлкі ішла праз дзяржаўныя манапольныя крамы ўвогуле без дакументаў, але за жывыя „левыя” грошы з рук у рукі... У Мінску і Гродне гарэлка была самай таннай у Расіі і ў астатнім свеце: папулярны „мерзавчик” (250 г) каштаваў... 15 капеек! Пры сярэднім заробку мінскага пралетарыята прыблізна 1 рубель 20 капеек за дзень – муляр меў 60-70 капеек, слесар металічнага завода альбо чыгуначнік 1,5-2 рублі за дзень...

Другім паскудствам былі непамерныя зямельныя ўладанні тых жа магнатаў і шалёныя цэны на зямлю. Толькі Радзівілам (і гэта пасля паўстанскіх канфіскацый XIX стагоддзя!) належала васемсот дваццаць дзве тысячы гектараў! Гэтаксама было і з зямлёю ў местах – палову Мінска мелі тыя ж Радзівілы, палову граф Чапскі, у выніку кватэрная плата ў даходных дамах была самая высокая ў Расійскай Імперыі, а ноч у гатэлі каштавала столькі, колькі ў Парыжы, ды ў два разы больш за Берлін, Вену, Варшаву ці Санкт-Пецярбург! На Беларусі быў самы вялікі разрыў багатых ад бедных, але не было вялікага капіталізму; у тым уся штука, у тым і фокус, што самы голы і шалёны пралетарыят зусім не там, дзе самы развіты і перадавы капіталізм, больш таго – пралетарыят гэта зусім не рабочы клас, гэта галота самых розных прафесій, а перад усім гэта саматужныя рамеснікі ды беспрацоўная і, часам, бяздомная інтэлігенцыя, а на Беларусі

паводле таго ж перапісу 1897 года было толькі 2,7 тыс. фабрычных рабочых (праўда, да іх можна далічыць 25 тыс. чыгуначнікаў на дзяржаўнай чыгунцы), але 473 тыс. рамеснікаў, „майстроў”, дробных гандляроў ды людзей „свабодных заняткаў”. Калі ж дадаць, што галота ў местах і мястэчках працэнтаў на восемдзесят была з габрэяў, то нічога дзіўнага, што менавіта на Беларусі нарадзіўся канец Расійскай Імперыі ў выглядзе самых розных экстрэмісцкіх партый і рухаў.

Што праўда, пасля забойства Аляксандра II ў 1881 годзе і амністыі паўстанцам 1863 года яшчэ праз два гады, а таксама суцэльных арыштаў сярод падпольнай „Народнай Волі” ў расійскіх сталіцах, у Мінск і Вільню пацягнуліся расійскія сацыялісты – сам інтэлектуальны Г. Пляханаў перавёз сюды тыпаграфію памяркоўнай сацыялістычнай партыі „Чёрный Передел”, а літаральна ў тым жа 1883 годзе сацыялісты-радыкалы з „Народнай Волі” заснавалі тут свой ЦК. Тады ж да расійскага сацыялістычнага руху далучаецца, сярод іншых, і Юзаф Пілсудскі – начытаўся ён, трэба думаць, і рускамоўнай, але беларускай (спецыяльна для тутэйшых робленай!) падпольнай газеткі „Гомон”, артыкулаў Данілы Баравіка ды „Щирого Белорусса” з заклікамі не толькі да сацыялістычнага светлага будучага, але і да... рэспублікі Беларусь у складзе свабоднай федэрацыі ўсіх народаў, што жывуць у Расійскай Імперыі!

У 1887 годзе контрразведка накрыла цэнтр у Пецярбурзе (на чале з А. Ульянавым, старэйшым братам У. Ульянава-Леніна) і ўсе мінскія ды віленскія тыпаграфіі ды філіялы. Трапіў тады пад следства і „таважыш Віктар” (Пілсудскі) – напісаў у пратаколе допыту, што ён, хоць рыма-каталік, але беларус; трапіў дзякуючы таму, як і разлічваў, толькі ў здаля знаёмую палякам з усіх паўстанняў Вятку. Прызнаўся бы ён да польскасці, то мог трапіць у Сібір і не вярнуцца ўвогуле...

Але святое месца пустым не бывае! Калі ў 1895 годзе паліцыя накрыла ў Пецярбурзе ўжо „Союз борьбы за освобождение рабочего класса” на чале ўжо з самім У. Ульянавым-Леніным, яго паплечнік Ю. Цэдэрбаўм паспеў схавацца ў радзімую Вільню, і там вясною 1897 года арганізаваў Усеагульны габрэйскі Бунд ды рабочых у Літве, Польшчы і Расіі, а вясною 1898 года Бунд, кіеўскія сацыял-дэмакраты і кіеўская ж „Рабочая Газета” заснавалі ў Мінску Расійскую Сацыял-Дэмакратычную Рабочую Партыю; расійскую, а не рускую – бо аніводнага рускага там не

было, толькі жыды, палякі, беларусы і ўкраінцы, усе пагалоўна з Крэсаў... Адбываючы высылку на Сібіры У. Ульянаў-Ленін, якога ў Пецярбурзе здалі контрразведцы рускія рабочыя, сарыентаваўся імгненна ў чым справа і разам з трыма дзесяткамі паплечнікаў падаў заяву ў гэтую партыю. На II Кангрэсе РСДРП у 1903 годзе ў Бруселі і Лондане партыя расколецца на меншавікоў і бальшавікоў – гэтак пачнецца незабыўны XX стагоддзю бальшавізм...

Але бальшавізм не быў адзіным сынам Крэсаў. Канцэнтрацыя ў палітыцы XIX стагоддзя „крэсавых элементаў" непазбежна мела прывесці да якаснага скоку. Крэсы з ускраіны рабіліся асобнай краінай, іх мясцовыя інтарэсы нараджалі такія феномены, што задаўлялі сабою на дзесяцігоддзі палітычную думку суседніх дзяржаваў і народаў.

Найперш трэба адзначыць „западноруссизм". Менавіта паяўленне яго ў выніку 1863 года было пачаткам беларускага фактару ў міжнароднай палітыцы. Дагэтуль усебеларускія акцэнты, „ліцьвінства" і літвафільства, ці тая ж літваманія, Чачот і Міцкевіч, нават міністр замежных спраў Расіі часоў імператара Аляксандра І князь Чартарыйскі са сваім праектам рэанімацыі ВКЛ у „асабістай Уніі" з Расіяй зводзіліся да таго, што „ешчэ Літва не згінэла, пукі мы жыемы"... Расійскія мяцежныя дваране 1825 года („декабристы") у выпадку прыйсця да ўлады намерваліся... на захад ад Дняпра і Дзвіны стварыць дэмакратычную Польшчу і заключыць з ёй ваенна-палітычны саюз супраць Еўропы! Павешаны ў крэпасці Санкт-Пецярбурга галава змоўшчыкаў, палкоўнік П. Пестэль, нават меў праект.. вывесці з „дэмакратычнай Польшчы" засталае там праваслаўнае святарства, а уніятаў аддаць касцёлу і зрабіць палякамі! Ці не першы гэта праект этнічнай чысткі ў „цывілізаванай" Еўропе?..

І вось у 1863 годзе выхавацель царскіх дзяцей прафесар Міхал Каяловіч, родам з цяпераняй мяжы Беларусі і Польшчы, з Кузніцы, чытае лекцыі... імператару Аляксандру II: пра Полацкае княства, св. Ефрасінню, праваслаўе з 980 года, „рускую" дзяржаўную мову ВКЛ да Люблінскай Уніі і гадоў сто пасля яе, і пра цяперашні нацыянальна-рэлігійны падзел, які заснаваны на падзеле маёмасным, і... „гістарычную справядлівасць" вызвалення Расійскай Імперыяй беларусаў і ўкраінцаў, як адзінаверцаў! Формула М. Каяловіча трапіла не ў брыво, а ў вока – у ёй мільёны закаханых па сённяшні дзень: у Расіі, у Беларусі і ва Украі-

не... Нічога дзіўнага, што сам імператар Аляксандр II паверыў прафесару з Крэсаў – у таго ўсё зграбна сходзілася. Там не Расія, але там і не польская Літва, але нейкія беларусы ды ўкраінцы, дык гэта ж па-тубыльску так завуцца, а для нашай праваслаўнай брацііі гэта адзінаверцы... І „матушка” Кацярына праводзіла тую генеральную лінію!

Пачатковыя „западноруссы” часоў губернатара Патапава, М. Каяловіча не зразумелі: яны даводзілі, як цяпер нашы мяшчухі – „белорусы это те же русские”... Праваліўся іх друкаваны орган „Вестник Западной России” і ў Вільні, і ў Кіеве. На нейкі час гэты рух падупаў, саступіў месца грашовай асіміляцыі – натоўпы вяскаўні рушылі ў Расію на будаўніцтва чыгунак; моладзь бралі на шэсць гадоў да войска (замест ранейшай пажыццёвай рэкрутчыны аднаго навабранца са ста двароў!); абеззямленыя шаракоўцы папаўнялі мясцовае „русское” чынавенства... І менавіта грашовая асіміляцыя зрабіла падмурак таго „новага народа”, які існуе дагэтуль – „рускія з нацыі, беларускія з паходжання”! Нічым фармальна гэта не адрозніваецца ад „палякаліцьвінаў”, толькі што там паланізавалася шляхта, а тут русіфікавалася люмпенства. Таму там шляхта альбо рабілася патрыётамі Польшчы мацней палякаў, альбо... здольная была вяртацца ў літваманства, а з яго ў сепаратызм – летувіскі, беларускі ці ўкраінскі! А вось новаспечаныя „западноруссы” і самі да канца не хацелі быць рускімі – хацелі быць лепшымі ад рускіх; больш рускімі, чым самі рускія, але ж... былі бедныя, а таму ў карэннай Расіі з іх смяяліся! Але і вяртацца назад „западноруссы” не хацелі – трэба ж было пачынаць тую Беларусь з нуля, а яны рачылі сабе прыйсці на гатовае...

Менавіта па тых прычынах пачынальнікі Беларусі выходзілі з польскае культуры на Крэсах – тыя ж „польскамоўныя” Міцкевіч, Чачот, Баршчэўскі, мяшаныя Рыпінскі, Сыракомля, а нарэшце ўжо роўнамоўныя Дунін-Марцінкевіч, Каліноўскі, Багушэвіч, Абуховіч, Неслухоўскі... Але, калі ад польскай культуры на пачатку XX стагоддзя адламалася купка беларусаў з газетай братоў Луцкевічаў у Вільні „Наша Ніва” і выдавецтвам братоў Іваноўскіх у Санкт-Пецярбурзе „Загляне сонца і ў наша аконца”, то сярод сваіх калегаў па той польскай культуры яны найшлі дзесятак аднадумцаў, а з праваслаўнага, ужо быццам бы „рускага” асяроддзя тут набеглі ўжо тысячамі – былі гэта тыя, хто спачатку трапіў да „западноруссов” і зразумеў, што іх камбінацыя

„мы тут фарпост Расіі!” самім рускім... непатрэбная і смешная, „западнорусс” у Расіі ўсё роўна чалавек другога гатунку!

Тут цікава, што М. Каяловіч, сам таго не жадаючы, сапраўды прыдумаў новую нацыю – не беларусы, але і не рускія! Нацыю без імя, нацыю адмаўлення, нацыю найбольш здатную не на стварэнне „новага справядлівага свету”, але на руйнаванне старога несправядлівага, на рабункі мужыкоў...

„Западноруссизм” быў найменш здольнай інтэлектуальна плыняй на Беларусі пачатку XX стагоддзя, але найбольш масавай... І калі пасля 1905 года вылез з Вільні са сваёй газеткай за грошы маскоўскіх „чарнасоценцаў” нейкі Ванька Саланевіч, то польскія салоны імгненна знюхалі, чым пагражае яго няхітрая просьба да цара-бацюшкі прыняць усіх беларусаў у рускія, а за гэта ўзнагародзіць усіх іх кавалкамі зямлі з польскіх маёнткаў. Вось яно, адрозненне проста рускага ад тутэйшага „западнорусса”, ці па-цяперашняму „тоже-русского”! Рускі і так рускі – бясплатна, а тутэйшы будзе яшчэ неякім рускім, але – за грошы.... У гадах 1917-94 гэтая ідэалогія была на Беларусі пануючай між простых людзей, але прыціснутай ці то „маскалямі-бальшавікамі”, ці то „пшэкамі-пілсудчыкамі”, а з часоў устанаўлення эпохі прэзідэнта Лукашэнкі (пра эпоху кажу без жартаў, многа ён адбудзе ці мала!) гэтая ідэалогія зрабілася таксама ідэалогіяй уладнай эліты, дзяржаўнай ідэалогіяй. У ёй дзіўным чынам спалучаецца „братэрства” з рускімі праз вынішчэнне рэшткаў нацыянальнай культуры – што Маскве глыбока абыякава! – адначасна з катэгарычным адмаўленнем хоць чым-небудзь памагаць той Маскве, ад жаўнераў на паўднёвых войнах да гуманітарнай бульбы, якая пад Гроднам і Лідай так і гніе без патрэбы. А вось Расія дапамагаць Беларусі абавязана – а іначай мы возьмем ды перастанем быць „тоже-русскими”...

Польскія сацыялісты на Крэсах разбіліся на дзве плыні – Польская Партыя Сацыялістычная і Сацыял-Дэмакратыя Каралеўства Польскага і Літвы. ППС пазней практычна ўся адыйшла ў „правіцу”, прыхапіўшы з сабой... частку сацыял-дэмакратаў; СДКПіЛ амаль цалкам з 1906 года далучаецца да расійскіх бальшавікоў, а ў 1918 годзе амаль цалкам уліваецца ў Расійскую Камуністычную Партыю. З ППС выйшаў Ю. Пілсудскі, з СДКПіЛ – Дзяржынскі... Цікава, што дамінуючы ў Царстве Польскім ды Познані з Галіцыяй нацыянальна-дэмакратычны накірунак, на Крэсах... практычна не быў прадстаўлены – на Крэсах розніца паміж

ППСаўцам і НДэкам не існавала, таму што палітыкуючыя польскія „земяне” ў моры праваслаўных тутэйшых і так былі павязаныя сваяцтвам, суседствам і агульнымі інтарэсамі. На Крэсах існавала польская партыя, адзіны вялікі клан – нутраныя сваркі і парахункі не выходзілі за яго межы. „Праграма” клана была кароткай і яснай: мае быць тут Польшча, бо іначай прападуць маёнткі, калі будзе рэвалюцыя; калі будзе рэвалюцыя, нехта мае зберагчы нашы маёнткі, а таму мае быць тут польскае войска. Палякі пачатку XX стагоддзя рэпрэзентавалі на Крэсах мешанку кансерватызма з радыкальным клерыкалізмам, таму будучы дзяржаўны, сацыяльны і нацыянальны парадак паважна не абмяркоўваўся нават на саміх Крэсах, тым больш не разумелі Крэсаў пазнанцы і галіцыйцы! Хіба адзін Ю. Пілсудскі вызначаўся неверагодным нюхам на будучае: калі ў 90-х гадах на Крэсах паявіліся беларускія нелегальныя кніжкі „Дудка беларуская” і „Смык беларускі” Ф. Багушэвіча, віленскага адваката і „бацькі беларускай нацыі”, выдадзеныя дзеячом ППС Ф. Анчыцам за партыйныя грошы ў Кракаве і Познані, а распаўсюджвала іх на Віленшчыне і Міншчыне падпольная сетка ППС, Ю. Пілсудскі рашуча пратэставаў(!); калі ж пайшлі перакладзеныя з польскай мовы сацыялістычныя агіткі тыпу „Куды мужыцкія грошы ідуць”, а перакладалі тыя ж кракаўскія ППСаўцы, абурэнню Ю. Пілсудскага не было канца! У Кракаве нічога не разумелі: маўляў, звычайная рутынная агітацыя, з улікам „крэсовай спецыфікі”... Тады Ю. Пілсудскі патлумачыў выразна: той Францішак Багушэвіч, ён жа „Мацей Бурачок”, хоць у самой кніжцы і выставіў ворагамі мужыка маскаля, казака, немца і жыда, а польскі пан... не памінаецца зусім, як быццам яго няма, дык у прадмове да кніжкі напісаў: „Не пакідайце ж мовы нашай беларускай – каб не ўмёрлі!” Мова – гэта не дыялект ці нейкая „гвара”, а якой гергеча племя тубыльцаў пад стрэхамі... Мова – гэта асобная нацыя. А калі нацыя, то рана ці позна знойдзецца галава, паявіцца граматыка, пойдзе літаратура і журналістыка, напрацуецца нацыянальная ідэя, захочацца спачатку свае аўтаноміі, а калі не дадуць (а хоць і дадуць!), то свае дзяржавы! І што тады супрацьпаставіць гэтаму на Крэсах, дзе „польскасць” толькі ў касцёле ды па фальварках – і то з дзікім тутэйшым акцэнтам і засмечаная „кацапскімі” словамі?! Адну сілу, адно войска... Іначай пра адвечна „польскія” Вільню і Львоў таксама прыйдзецца забыць, бо гэта толькі энклавы ды і тыя на восемдзесят працэнтаў з жыдоў,

а ўся „польскасць” на Крэсах гэта архіпелаг у мужыцкім моры, ціхім толькі да той пары, пакуль нехта не пасее вецер...

Аднак у ППС Пілсудскага не паслухалі, ну, пора гарачку, нейкая фобія... Аргументавалі: Касцёл наш прыціснуты ўладай, польскія школы на Крэсах у падполлі, ідзе „татальная” русіфікацыя (што такое татальная на самай справе, тады яшчэ не ведалі!), зараз мужыкоў пераробяць на рускіх... То няхай прызвычайваюцца, што і „гаворкай” іхняй можна друкаваць, а там і „пальшчызнай” пацiху пойдзе – „гаворка” ж то не мова, а дыялект... Нехта дапусціўся фатальнай памылкі: бо па-польску „język” нешта вышэйшае, а „мова” і „гвара” амаль тое ж самае, а па-беларуску – як у Багушэвіча – „мова” і ёсць той самы літаратурны „ензык”!

Чакаць „Беларускага Лемантара” было не доўга – пры гэтым быў ён надрукаваны адначасова і лацінкай, і кірыліцай! Ці вы дзе бачылі „гвару” кірыліцай?! У Вільні абаранелі з адкрытым ротам... Здурэлі б зусім, калі б ведалі, што кірыліцу завялі сярод беларусаў пасля поўнага знішчэння яе ў XVII стагоддзі... таксама каталікі. Вацлаў Іваноўскі з-пад Ліды ставіў задачу, даставаў грошы і арганізоўваў друк, падручнікі пісаў у лацінскім варыянце наваградчанін Марыян Фальскі – пазней ён выдасць „Элементаж для шкул вейскіх” , па якім уся Польшча будзе вучыцца з 1919 года! – і мінчанін, але сын лідскага паўстанца 1863 года Казімір Кастравіцкі, сваяк Апалінарыя Кастравіцкага, больш вядомага як Гійём Апалінэр...

І першыя газеты ў Вільні „Наша Доля” і „Наша Ніва” братоў Яна і Антона Луцкевічаў, Алаізы Пашкевіч, – усе трое суседзі Іваноўскага, – таксама адначасова выходзілі і лацінкай, і кірыліцай на працягу дзесяці гадоў! Такое мог прыдумаць толькі інжынер Іваноўскі разам з інжынерам Фальскім – філолаг перапалохаўся б самой крамольнай думкі, каб на адну мову ды два шрыфты і дзве граматыкі... Але зроблена ўсё было слушна! Таму, што першыя сацыялісты і газетчыкі, першыя літаратары і палітыкі на дзевяць дзесятых былі каталікамі, выходзілі з польскай культурнай і нават палітычнай традыцыі (праграма заснаванай у 1902 годзе Беларускай Сацыялістычнай Грамады была амаль цалкам перапісаная з праграмы ППС!), але адразу ж за рэвалюцыйны адзін 1905 год ясна ўбачылі, што тыя беларусы, да каго яны звярталіся, гэта праваслаўныя на тыя ж дзевяць дзесятых; каталікі ж прызнаюцца да беларускасці хіба ў тых парафіях, дзе

беларусаў-ксяндзоў яшчэ не ўзяў за сутану біскуп Э. Роп... Дзве паралельныя граматыкі мелі, калі не запабегчы, то прыгладзіць рэлігійны раскол. Падмацаваны расколам у культуры ці палітыцы, ён лёгка мог перарасці ў нацыянальна-дзяржаўны. Што мы і бачым сягоння паміж сербамі ды харватамі – тыя і тыя сваю мову называюць серба-харвацкай, але які ўжо раз паміж сабой ваююць не на жыццё, а на смерць, вынішчэнне. Хаця ў 1918 годзе ядналіся ў адну дзяржаву, быццам бы на роўных... Што ж атрымалася ў Іваноўскага і Фальскага? Прыхаваны раскол існуе дагэтуль, але ні тады, ні пазней ажно да такой разні не дайшло, але і хатняя вайна на Крэсах загаралася не сама па сабе, але з прыходам якога-небудзь чарговага войска! Калі коратка, то да 1917 года і моцны польскі дух, і слабы беларускі былі на Крэсах нацыянальныя, а таму больш-менш маналітныя, бо заклапочаныя выключна сваімі нацыянальнымі інтарэсамі ва ўмовах Імперыі. Што датычыцца „агульнарасійскіх” партый, то яны закраналі на Беларусі толькі жменьку заезнага чынавенства – што сацыялісты, што канстытуцыйныя дэмакраты, што правыя, што левыя.... Як і цяпер, нават, быццам бы рускамоўнае места Расіяй цікавілася мала, а лёс Крэсаў па-ранейшаму вырашалі падзеі, што адбываліся недзе далёка-далёка... Грымнула ў 1914 годзе вайна, перакруціла і расцерла мільёны людзей, а праз тры гады грымнула рэвалюцыя, яшчэ праз год другая рэвалюцыя, зваліліся тры імперыі, і на тых руінах, дзе кожнаму было хоць нейкае месца раней, цяпер зрабілася цесна ўсім – багатым і бедным, каталікам і праваслаўным, палякам і беларусам, рускім і палякам, беларусам і рускім; а ўсе ўзброеныя і голарукія гарлапаны гарлалі кожны сваё, але неяк выходзіла ў іх адно і тое ж, бо кожны клікаў ісці за ім, абяцаў цэлы свет у свабодзе і шчасці толькі пры адной лёгкай і простай да выканання ўмове, маўляў,

> *і вось, калі ты паклонішся мне,*
> *дык усё будзе тваё.*
> Лука IV, 7.

Дзейнічае тым часам Беларускае Таварыства Дапамогі Ахвярам Вайны, а на чале буйнейшай украінскай партыі, замаскаванай пад выдавецтва „Украинская Жизнь” стаіць... С. Пятлюра, будучы прэзідэнт Украінскай Народнай Рэспублікі. Нават без лішняй агалоскі з восені 1915 года, калі расійская армія адсту-

пае з-пад Варшавы ажно да Рыгі, возера Нарач і Мінска, фармі-руюцца новыя палкі з мясцовых жыхароў, у тым жа афіцэраў; працэнтаў восемдзесят у мінскай 15 Арміі генерала Кандратові-ча беларусы, а на Украіне тое ж робіць генерал Скарападскі, будучы гетман Украіны пад нямецкай акупацыяй...

У канцы 1916 года, калі кіраўнічыя эліты ваюючых краінаў ды ўсіх колераў рэвалюцыянеры ўжо адчуваюць блізкі канец гэтага свету, у Швейцарыі адбываюцца дзве малапрыкметныя канферэнцыі. На адной радыкалы на чале з У. Леніным пастанаўляюць стварыць фактычна Камуністычны Інтэрнацыянал, кожная з асобных партый якога мае дабівацца паражэння свайго ўраду. На другой жа – дэлегаты сацыялістычных і нацыянальных партый Расіі (дэ-факто такія ж радыкалы!) вырашаюць праблему... падзелу тэрыторыі былой Імперыі пасля яе ўпадку.

Лідэр беларускіх сацыялістаў Ян Луцкевіч прапануе... утварыць канфедэрацыю незалежных Летувы, Беларусі ды Украіны. Летувісы адмоўчваюцца – у Вільні ідуць нейкія падазроныя перамовы купкі газетчыкаў, адвакатаў і мясцовых фальваркоўцаў з камандаваннем 10-й нямецкай арміі... Украінцы супраць! „Хахлацкі сепаратызм" некуды знік... Аказваецца, спачатку трэба пабіць немца (ясна, сіламі расійскай арміі!) ды вызваліць... Львоў, Цярнопаль і Чарнавіцы! А вось ужо потым... Ні расійскіх, ні польскіх сацыялістаў на нарадзе няма, і няма каму спытаць Луцкевіча пра адносіны гэтай „канфедэрацыі" да Расіі ці Польшчы. Што гэта такое ўвогуле? Новае Вялікае княства Літоўскае?! Ды ні Польшча, ні Расія не пагодзяцца з яго новым існаваннем!

Але Луцкевіч, які прыехаў з Вільні, не надта ведае, што сабе думаюць тыя калегі з Грамады, якія цяпер за расійскім фронтам, у Мінску і Санкт-Пецярбурзе. Хіба тое ж самае, што да вайны: рэальна мець аўтаномію ў складзе федэратыўнай Расіі – на незалежнасць няма проста мінімальнай колькасці сваіх афіцэраў ды настаўнікаў пачатковых школаў, не гаворачы пра больш адмысловыя прафесіі...І фронт стаіць пад Мінскам! Так што справа можа быць вырашана толькі пасля вайны...

Ніхто не ведае яшчэ, што партыям у Петраградзе рупіць скінуць цара і дайсці да ўлады цяпер... Арганізаваны недавоз хлеба, раней яшчэ нагнана ў сталіцу дзвесце тысяч (!) жаўнераў запасных палкоў, Балтыцкі Флот стаіць у ільдах Кранштата, а дзесяткі тысяч узброеных матросаў „гуляют" у сталіцы... У канцы зімы стыхійныя дэманстрацыі канчаюцца разгонам паліцыі,

арыштам ураду і... адрачэннем імператара дынастыі Раманавых! У краіне, дзе дзве тысячы кіламетраў фронту, дзе ўзброены восем мільёнаў чалавек, дзе жывуць дзесяткі вялікіх і малых народаў, дзе праваслаўныя, каталікі, лютэране, мусульмане і іншыя моляцца кожны іншаму Богу, дзе за стагоддзі зблытаны і запушчаны і адносіны людзей да зямлі, і адносіны людзей да людзей, у такой краіне пачынаецца рэвалюцыя. Што гэта была за „дэмакратычная” рэвалюцыя, як яна выглядала на самай справе – чамусьці тая рэвалюцыя лічыцца сапраўднай, а бальшавіцкі захоп улады ў кастрычніку 1917 года злачынствам, якое пацягнула мноства бязвінных ахвяраў! – сведчыць меншы брат Іваноўскага, акадэмік і „бацька летувіскай біялогіі” Тадас Іванаўскас, які быў тады ў Петраградзе дацэнтам Універсітэта і экспертам аднаго з расійскіх міністэрстваў:

„12 сакавіка 1917 года быў захоплены Арсенал у Петраградзе. Пад вечар я там праходзіў і бачыў мноства салдат і цывільных, пераважна рабочых. Бярэмямі, як дровы, з Арсенала выносяць вінтоўкі – навенькія, яшчэ ў вазеліне. Пад сцяной падлетак гадоў чатырнаццаці трымае поўную кардонку „браўнінгаў” і прадае амаль што дарам усім жадаючым. На Неўскім і Ліцейным нават у час вайны былі шыкоўныя крамы – у першы ж дзень многія ўжо разрабаваныя; каля разбітых спартыўных і паляўнічых вітрынаў ходзяць абарванцы з цудоўнымі навюткімі карабінамі і стрэльбамі на плячах, чутны стрэлы, на снезе валяюцца гільзы і пыжы... Далей разбіваюць крамы з алкаголем, льюць проста ў горла на месцы, набіваюць кішэні пляшкамі дарагога віна, каньяку, рому, валакуць скрынкамі, самыя спраўныя падганяюць фурманаў на санках і грузяць колькі конь пацягне. Следам рабуюць усе спрытна, урываюцца ў багатыя дамы, шукаюць „ворагаў рэваюцыі” (!); месцамі швайцары і старажы спрабуюць замыкаць падворкі і парадныя сходы, але ад таго яшчэ горш – страляюць, выломваюць, урываюцца і валакуць на снег усіх, хто трапіць у рукі! Сівога генерала ў поўнай форме з узнагародамі вывалаклі з дома на маіх вачах, збілі да крыві, растапталі нагамі і расстралялі з рэвальвераў. Ноччу пачынаецца паляванне на маладых паненак, служанак і гімназістак – прастытутак, якімі ваенны Пецярбург быў набіты бітком, ужо не хапае!..

У першы дзень паўстання там-сям можна было ўбачыць афіцэра ў форме. На другі дзень усе пахаваліся, ці пераапрануліся ў цывільнае... Аднаго з афіцэраў затрымала група рабочых

чалавек дзесяць, усе з вінтоўкамі і з чырвоным сцягам, нешта крычалі і размахвалі рукамі. Тут падышоў матрос, моўчкі ўзяў у рабочага вінтоўку са штыхом, моўчкі ўсадзіў афіцэру ў жывот і пайшоў не аглядаючыся.... Салдаты найбольш любілі катацца на аўтамабілях і страляць у ліхтары і вітрыны, другой „народнай забавай" былі пагромы шматлікіх у сталіцы рэстаранаў і кавярняў – там абіралі абслугу і рэдкую публіку, часам стралялі і збівалі да смерці чысцей апранутых, выпівалі і выжыралі ўсё, што было...

На пачатку рэвалюцыі практычна ўсе яе віталі, плакалі ад радасці і цалаваліся на вуліцах, нават незнаёмыя людзі. Але вельмі хутка тая радасць змянілася агідай і страхам... У рускага народа і рускай інтэлігенцыі заўсёды былі і застаюцца нейкія крайнасці: да рэвалюцыі большасць інтэлігенцыі выступала нават за дыктатуру пралетарыята – цяпер жа яны ўбачылі ўсю „прыгажосць" той дыктатуры і дружна хіснуліся назад..."

Прыблізна тое самае адбывалася на пару дзён пазней і ў прыфрантавым Мінску, набітым войскам і бежанцамі – паўсюдна ў Імперыі адно толькі і хацелі скінуць цара, а ніхто не думаў, што будзе далей! Але ў Мінску адразу пачаліся і другія канфлікты: як толькі салдатня пачала пагромы, на абарону сваіх кварталаў сталі баявыя дружыны прафсаюзаў (тады палова Мінска была з яўрэяў-рамеснікаў) і... падпольныя да таго часу групы POW на адным з кварталаў Мінска, які так і называўся – Ляхаўка! Адтуль у Мінску былі ажно да восені 1917 года дзве ўлады: вакзал і казармы кантраляваў Савет салдацкіх дэпутатаў Заходняга Фронту, а другую частку – міліцыя Мінскага Савета. Усе палітычныя партыі, усе нацыянальныя і іншыя групы інтэнсіўна збіралі і куплялі зброю... Тады ж – задоўга да бальшавікоў! – Доўбар-Мусьніцкі фактычна выйшаў з-пад улады расійскага камандавання, сцягнуў большасць сваіх палкоў у раён Жлобіна-Бабруйска, абвясціў іх Польскім Корпусам, а сябе ўпаўнаважыў таксама і да цывільнай улады – польскім маёнткам рэальна пагражалі рабункі мужыкоў! Так на Беларусі выглядаў пачатак свабоды і дэмакратыі...

*І сказаў: праўду кажу вам:*
*ніякі прарок не прымаецца ў сваёй Айчыне.*
Лука IV, 24

Наступіў час, калі Бог быў на баку мацнейшых батальёнаў! Гісторыку магчыма наракаць на адсутнасць вопыту і палітычнай волі ў Часовага Урада ці асобных палітыкаў, спасылацца на адсутнасць дэмакратычных традыцый і г.д. Але ж, калі няма іншых традыцый, то праяўляюцца тыя самыя традыцыі рабунку! Самыя народныя традыцыі... І найбольш боездольнымі ў Расіі 1917-18 гадоў аказаліся нацыянальныя войскі – латышскія стралкі і польскія легіянеры. Спрацавала не еўпарейская культура, а хіба інстынкт самазахавання, бо іначай выжыць у расійскім крывавым моры не было як... З легіёнаў і POW (Polska Organizacja Wojskowa) пачалася Польшча, на латышскіх штыхах утрымалі ўладу бальшавікі. Уласна хатняя вайна ў Расіі паміж рускімі і рускімі ўзнікла толькі летам 1918 года, узнікла на яе ўскраінах, на Урале, Волзе, Каўказе, і была гэта не так вайна чырвоных з белымі, але вайна рэгіёнаў супраць цэнтральнай улады, а ў значнай ступені вайна нацыяў супраць Крамля. Пры гэтым у кожнай з нацыяў былое Расійскай Імперыі адбыўся раскол...

Летам 1917 года новапаўсталы Беларускі Нацыянальны Камітэт у Мінску апанавалі сацыялісты, выкінуўшы „памешчыкаў” (дэпутатаў расійскай Гасударсцвеннай Думы) на чале з Р. Скірмунтам. У снежні Усебеларускі Кангрэс быў разагнаны сіламі ВЧК і бальшавіцкіх войск Заходняга Фронту; сацыялісты апынуліся ў падполлі, улада ў Мінску і на ўсёй Беларусі перайшла да „военно-революционного комитета” з латышоў, габрэяў, палякаў, армянаў і Бог ведае каго... Тым часам наступіў час сепаратнага міру бальшавікоў з немцамі ў Брэсце – немцы занялі Латвію, Эстонію, усю Беларусь да Дняпра і Дзвіны і ўсю Украіну. 25 сакавіка 1918 года Рада Усебеларускага Кангрэсу заявіла пра незалежнасць Беларусі ад Расіі, узнікла Беларуская Народная Рэспубліка. Акупацыйныя нямецкія ўлады напачатку яе не прызнавалі, потым прызналі як прадстаўніцтва беларусаў у Мінску. У тым жа годзе былі яшчэ дзве падзеі ў той шалёнай каламыйцы: у маі 1918-га немцы раззброілі корпус Доўбара-Мусьніцкага, а ў кастрычніку... аддалі бальшавікам частку Беларусі ад Дняпра да Бярэзіны. Сусветная вайна дагарала, заходнія саюзнікі праламалі Салоніцкі Фронт – капітулявалі Турцыя, Балгарыя, Аўстра-Венгрыя. Нарэшце ў лістападзе 1918-га капітулявала Германія, Вільгельм II уцёк у Галандыю, у Варшаве выбухнула паўстанне і 11 лістапада паўстала II Рэч Паспалітая ды пачала фарміравацца польская армія. Немцы эвакуіраваліся з Беларусі, захоўваючы за сабой толькі чыгункі ў раё-

не Брэста і Гродна – следам за імі ішлі бальшавікі. 1 студзеня 1919 года была абвешнана Савецкая Сацыялістычная Рэспубліка Беларусь, праз некалькі дзён войскі Чырвонай Арміі зламалі польскую самаабарону ў Вільні і занялі амаль усю Беларусь. А ўжо праз месяц, у раёне Слоніма і Картуз-Бярозы, пачаліся баі з польскай арміяй. У красавіку 1919 года палякі занялі Вільню, а да восені выйшлі на Дзвіну і Бярэзіну-Дняпроўскую. Тут фронт прастаяў да мая 1920 года...

Сутнасць польскай палітыкі на Крэсах была выкладзена ў добра вядомай адозве Начальніка Дзяржавы Ю. Пілсудскага „Да грамадзянаў былога Вялікага княства Літоўскага!”. Праект Пілсудскага мала чым адрозніваўся ад памянутага праекта Луцкевіча: у Луцкевіча была канфедэрацыя Летувы, Беларусі і Украіны, а ў Пілсудскага федэрацыя тых жа краін і Польшчы – альбо аднаўленне Рэчы Паспалітай у межах 1772 года, толькі на прынцыпе „роўныя з роўнымі, вольныя з вольнымі”. У Коўне гэты праект адразу адкінулі – там разлічвалі на падтрымку Германіі і... Расіі! У Кіеве думкі падзяліліся – частка палітыкаў, з пэўнымі заўвагамі была схільная яго падтрымаць, частка была катэгарычна супраць (з прычыны Львова і Усходняй Галіцыі). Што ж датычыцца Мінска, то найбольшы супраціў тут выказалі не беларусы, але... палякі! Прысутны на прамове Ю. Пілсудскага ў 1919 г. у Мінску Рдултоўскі сведчыць:

„– Шчыра дзякую за выказаныя мне прывітанні, – гаварыў Пілсудскі. – Як сын гэтай зямлі, я добра ведаю яе гаротнае становішча. Дзяды нашыя не бачылі нічога лепшага за мукі, здзек і злачынства. Кожнага прымушалі тут прызнаваць тое, што яму гвалтоўна накідалі (падкрэслена мною – А. Ч.)... Польскае войска, якім я маю гонар камандаваць, усюды нясе вызваленне і свабоду. Польшча ідзе на Крэсы не для таго, каб навязваць сваю волю. Польскі Сэйм пацвердзіў маю віленскую адозву, што гэтай зямлі ніхто і нічога накідаць гвалтам не будзе – будзе яна свабоднай, і насельніцтва яе свабодна вырашыць формы свайго бытавання.

Я даў слова і трымаю яго моцна: насельніцтва будзе паклікана да выбараў мясцовага самакіравання, а потым надыдзе час выказаць свае думкі пра дзяржаўны лад (падкрэслена мною – А. Ч.). Я буду ганарыцца Польшчай, польскім войскам і самім сабой, калі змагу даць гэтай зямлі найвышэйшы дар, якога яна дагэтуль не мела – дар волі. Пакуль я буду камандаваць польс-

кім войскам, я гарантую вам свабоду. Я веру і спадзяюся, што гэта зямля, як асобная адзінка, зойме належнае ёй месца ў сусветным ліку дзяржаўных народаў...

– Для большасці нас, мінскіх палякаў, – піша далей Рдултоўскі, – не знаёмых з палітычнымі праектамі Пілсудскага, абедзве яго гэтыя беларускія прамовы (на вакзале і ў Шляхецкім Доме ў Мінску Пілсудскі гаварыў па-беларуску! – А. Ч.) зрабілі дзіўнае і прыкрае ўражанне. Нават той факт, што прывітанне было сказана не па-польску, быў для нашых вушэй непрыемны. Столькі гадоў мы чакалі яго па-польску! І да таго ж, Начальнік Дзяржавы ведаў, што ўсе прысутныя дасканала разумеюць па-польску!

А тая „аўтаномія"!!! Як практычна яна мела выглядаць?! У гэтым „аўтаномным Краі", дзе мы, палякі, у дамінуючай меншасці?! Калі аўтаномія будзе „шырокай", ці здолеюць гэтыя землі супрацьстаяць камуністам і сацыялістам-рэвалюцыянерам? Хоча той аўтаноміі жменя нацыяналістаў, а большасць насельніцтва пра яе і не думае..."

Рэакцыя Рдултоўскага, „міньскего поляка", вельмі паказальная. Па-першае, ён адрознівае камуністаў і сацыялістаў-рэвалюцыянераў – „камуністы" тыя, хто ў Маскве, а „сацыялісты" гэта беларускія арганізацыі ў Мінску, настроеныя супраць Расіі. Але паколькі палякаў на Міншчыне „дамінуючая меншасць", то любое самакіраванне і тым больш аўтаномія гэтую меншасць проста змятуць. І ў тым, што аўтаноміі хоча толькі „жменя нацыяналістаў", ёсць святая праўда – бо вёска нават не ведае, што гэта такое, а „нацыяналісты" наўзабаве расколюцца на тры партыі. Урад БНР В. Ластоўскага заявіць пра „польскую акупацыю" і выедзе ў Коўна, Урад БНР А. Луцкевіча (раскол адбыўся адразу ж пасля адозвы Ю. Пілсудскага вясною 1919 года!) паспрабуе з дапамогай Варшавы ўправіць мазгі крэсавым ксяндзам і „зямянам", а левацрадыкальная група У. Ігнатоўскага (будучы прэзідэнт Акадэміі Навук Беларусі) утворыць Беларускую Камуністычную Арганізацыю і распачне... антыпольскую партызанку! Сам Ігнатоўскі ў 1920 годзе будзе кааптаваны ў ЦК Камуністычнай партыі Беларусі. З насторожу мемуараў Рдултоўскага выразна відаць не расчараванне, а паніку і страх, якія ахапілі „міньскіх полякув" – справа была не ў „беларускім нацыяналізме", але ў магчымых...

рабунках мужыкоў пры няпольскіх самаўрадах і няпольскай аўтаноміі! Без рэгулярнай арміі і падтрымкі Варшавы „польскасць” на Крэсах знікла б за які месяц-другі!

Цікава, што, на пачатку сустрэчы, Пілсудскага віталі праваслаўны мітрапаліт Мельхіседэк і старшыня Беларускага Нацыянальнага Камітэта А. Прушынскі (Алесь Гарун), але перад імі вылез нейкі М. Ярашэвіч і... па-руску накінуўся на Пілсудскага з абвінавачаннямі ў „польскай акупацыі” і патаканні „местным националистам”, бо ўвесь тутэйшы народ „рускі”, гаворыць „па-руску” і „хочет жить в России”. Цікава, як гэты „западноросс” Ярашэвіч прайшоў усе пастарункі, усю ахову, хто яго прывёў, пусціў наперад і навучыў, куды і якімі словамі калоць Начальніка Дзяржавы? Каму была патрэбна правакацыя?! Самотная асоба ў такіх выпадках ніколі не бывае самотнай – нехта яе рыхтуе беражэ да пары і да часу...

І вось, пасля гэтай абразы Пілсудскі цудоўна зразумеў, каму гэта трэба, і сказаў тое, што пададзена вышэй! Тым болей, прысутнічалі і сам генерал Шаптыцкі, і генеральны камісар Усходніх Земляў Асмалоўскі, і камісар Мінскай Зямлі Рачкевіч, будучы прэзідэнт Польшчы на Захадзе з 1939 года... У тым і адрозненне Пілсудскага ад будучых пілсудчыкаў на Крэсах, што маршалак быў практыкам, а яны рамантыкамі! Яны вырашылі, што Польшча ўжо моцная і вялікая, вайна ўжо скончаная, у той Польшчы жывуць адны палякі – у тым жа і толькі „дамінуючая меншасць” на Міншчыне! У тым і ўся справа, што вайна не была скончаная, што яшчэ былі патрэбны жаўнеры, што – самае галоўнае! – лёс II Рэчы Паспалітай пасля вайны залежыць ад таго, дзе будуць яе межы і якія ў ёй будуць парадкі, бо гэта вайна яшчэ не апошняя... Але тым і адрозніваецца дзяржаўны дзеяч ад засцянковага патрыёта, што ён абавязаны яшчэ і думаць, і рабіць, а не толькі кахаць Айчыну без памяці! Ды дзе там – калі гэта на Крэсах каму была да спадобы развага і калькуляцыя?! „Паляцы міньске” не пачулі ў словах Пілсудскага ніякіх тактычных абяцанак, прынялі ўсё за чыстую манету, адным словам,

*пачуўшы гэта,*
*усе ў сынагозе напоўніліся гневам,*
Лука IV, 28

*і ўстаўшы, выгналі Яго прэч з горада*
*і павялі на вяршыню гары,*
*на якой горад іхні быў пабудаваны,*
*каб скінуць Яго,*
Лука IV, 29

Не, тады восенню 1919 года Пілсудскі з Мінска паехаў як мае быць! І праводзіны былі – як сустрэчы! Але, пад федэралізм Пілсудскага пачалі інтэнсіўна капаць „поляцы міньске”, і ўзнік нейкі дзіўны сімбіёз паміж „крэсовымі” ды тымі, хто ў Варшаве – Грабскі, Домбскі і К°– не хацелі мець ніякіх Крэсаў... І ўзнікла быццам бы разумная, а нават кампрамісная формула: „праглынуць на Усходзе роўна столькі непалякаў, колькі Польшча здолее асіміляваць за адно пакаленне”, гэта значыць, за дваццаць гадоў, бо менавіта толькі тое і ёсць дзейсны час аднаго пакалення. У палітычна-вайсковых, значыць, больш канкрэтных формулах тое самае акрэслівалася як „заняць і ўтрымаць толькі тыя тэрыторыі былога Вялікага княства Літоўскага, дзе большасць насельніцтва каталікі”.

У тую ж восень прыступілі да рэалізацыі гэтага плану – так хутка, бо на „Літве Ковеньскей” „федэралізм” Пілсудскага і „праглынанне каталікоў на Усходзе” ў яго апанентаў цалкам супадалі. Але паўстанне ў Коўні сіламі аднаго POW было правалена! І нічога дзіўнага – кіраўнік польскага падполля ў Коўні капітан Р. Кавалец дакладваў рэзідэнтуры ў Вільні – між іншым, узначальваў яе Леан Васілеўскі – што паўстанне абсалютна не падрыхтавана, на ўсю Ковеншчыну ён мае ўсяго тысячу чалавек і здольны пры добрай удачы заняць Коўню толькі на адны суткі, а таму настойваў, каб за гэты час пад Коўню паспелі дайсці самае меншае некалькі батальёнаў рэгулярнай польскай арміі...

Таксама ён папярэджваў, што „ўрад прэм’ера Сляжавічуса карыстаецца поўнай падтрымкай сярод летувісаў, а нават значнай часткі палякаў (!). Што ж датычыцца генерала Жукаўскаса, на якога спадзяваліся ў Варшаве, бо зусім нядаўна той генерал быў палкоўнікам Жукоўскім і гаварыў па-польску, то Р. Кавалец акдрыта пісаў, што гэтаму чалавеку нельга верыць, бо свае погляды ён мяняў ужо некалькі разоў... Дарэчы, Тамаш Зан, праўнук Тамаша Зана-„Прамяністага”, пазней палкоўнік АК, а тады ўлан 211-га палка ротмістра Дамброўскага, пісаў у сваіх мемуарах, што іх суседам пад Коўняй быў нейкі былы паляк, капітан царскай арміі

Жукоўскі, які гаварыў толькі па-руску, палякаў старанліва абыходзіў, а сябраваў толькі з, наехаўшымі на канфіскаваныя пасля 1863 года маёнткі, рускімі памешчыкамі! Такі Жукаўскас быў не адзін – і ў Коўні, і ў Вільні, і ў Мінску, і ў Варшаве...

Але, ці то Васілеўскі не змог пярэчыць Пілсудскаму, які вясною 1919 года даў ясныя інструкцыі, што сярод летувісаў можна знайсці „разумных людзей", бо ўсе яны ўчарашнія мужыкі і любяць грошы, ці то кола круцілася само па сабе, але сігнал да паўстання быў дадзены і... шавулісы за адну ноч яго зліквідавалі; было некалькі забітых з абодвух бакоў, а сотні арыштаваных палякаў напоўнілі ковенскую, панявежскую і ўсе астатнія турмы. Аказалася, што нават шчырыя каталікі, якія дасканала разумеюць па-польску, то не заўжды шчырыя палякі... Ідэнтыфікацыя паляка за каталіка, а каталіка за паляка была справядлівай толькі для карэннай Польшчы і крэсавай магнатэрыі ды „зямянства" – але нават „на Крэсах" гэты закон выконваўся не паўсюдна і не заўжды, нават у 1919 годзе, а таму і цяпер „новыя крэсавякі" на Беларусі хочуць надаць паляка-католікам характар усяленскага ды універсальнага!

Правал тае „ковенскай авантуры" і разрыў усялякіх адносінаў з Літоўскай Рэспублікай канчаткова развялі Пілсудскага і астатніх палітыкаў у Варшаве. Маршалак меў непадважальны аўтарытэт толькі сярод простага народа ды армейскіх афіцэраў і шэрагоўцаў – палітыкі, генералітэт і зямельна-фінансавая алігархія ўжо тады глядзела на „водза", быццам на таго „маўра, які зрабіў сваю справу і можа быць вольны"... А на Беларусі наступствы візіта Пілсудскага ў Мінск былі непапраўныя для далейшых польска-беларускіх адносінаў!

Польскія вайсковыя і цывілныя ўлады ў Мінску і на беларускіх землях перакрэслілі і той малы даробак, чаго дамагаліся беларусы з БНР нават пад нямецкай акупацыяй, з чым вымушаны былі лічыцца, нават прадэкляраваўшыя Савецкую Беларускую Рэспубліку маскоўскія бальшавікі!

Былі зачынены рэдкія беларускія школы, зачынены амаль усе газеты, распушчаны вайсковыя камісіі, педагагічныя і афіцэрскія курсы, арыштаваны дзесяткі дзеячаў беларускіх партый, спынены ў касцёлах імшы на беларускай мове і г.д. Гэта хоць трапляла да якой-небудзь грамадскасці ў вушы! Пра гэта ў Варшаве стараліся консул БНР інжынер Л. Вітан-Дубейкаўскі і... спецыяльны высланнік Ураду БНР княгіня Магдалена Радзівіл-Заві-

ша: княгіні неяк удавалася, але калі варшаўскія газеты сталі празрыста ківаць на яе „прарасійскія” (!) сімпатыі да называць не іначай як „Магдалена Івановна”, княгіня ўзяла ды купіла дом, у якім арандавалі памяшканні амаль усе тыя варшаўскія рэдакцыі, і... павыкідала ўсіх прыткіх журналістаў на вуліцу. Na zbity pysk! Газеты хутка збавілі тон, але, нават княгіня Радзівіл не магла выкінуць з упартых галоваў тое, што пазней сталі называць „польскай глупотай”, хаця купіць тыя задніцы, на якіх выраслі такія галовы, магла лёгка... Чалавека і дурнога не купіш! Нельга купіць тое, чаго ў ім няма... Значыць: розуму.

Але „хоць нейкай грамадскасці” траплялі ў вушы хоць нейкія факты пра крыўды эліты – газетчыкаў, настаўнікаў і вайсковых. Крыўды вёскі нікому не траплялі ў вушы! Ну, што ж – ідзе вайна, войска жэрці хоча, і бабаў, людзі могуць пацярпець, а коні не могуць і г.д. Так то яно так, толькі бралі выключна з вёсак – а не з маёнткаў! І, каб хоць бралі! Праваслаўныя вёскі трактаваліся як... бальшавіцкія, да таго ж, часова захопленыя; сказаць, што іх абіралі, гэта не сказаць нічога – іх пляндравалі, як у казацкіх і шведскіх войнах XVII стагоддзя! Пустошылі!

І гэтага не чуў ніхто ў Польшчы па-за... II аддзелам Генштаба, чые афіцэры на Беларусі ў тую ж восень 1919 года даносілі ў Варшаву, што „пачатковы энтузіязм насельніцтва знік, настала разгубленасць і непрыязнасць да войска, якая вельмі хутка перарасла ў нянавісць да ўсяго польскага”. Але ў Варшаве II аддзел Генштаба таксама не слухалі – яго інфармацыя не адпавядала кабінетным канцэпцыям і канструкцыям...

Палітычныя ж польска-беларускія кантакты былі перапыненыя да вясны 1920 года. На працягу гэтага часу Ю. Пілсудскі спрабаваў загуляць яшчэ далей на ўсход. Двойчы яго міністр для спецыяльных даручэнняў Ежы Іваноўскі (старэйшы брат Вацлава і Тадэуша) ездзіў да „главнокомандующего вооруженных сил Юга России” генерала Антона Дзянікіна – і абодва разы Дзянікін... „згаджаўся” (!) на існаванне Польшчы. Але, як аўтаноміі ў межах Расіі, і на правах ды на абшары былога Царства Польскага! „Белая армія” Дзянікіна дайшла ажно да Тулы, што за 200 км ад Масквы; далейшае яе наступленне пры падтрымцы палякаў ад Бярэзіны паклала б фізічны канец бальшавізму, але – як усе прайгранцы! – тыя генералы і палітыкі з абозу нічога не разумелі і нічаму не навучыліся... Дзянікін быў адкінуты на Дон і Кубань, там у лютым 1920 года яго армія была разбіта каля ста-

ніцы Егарлыкскай – біліся сорак пяць тысяч кавалерыі з абодвух бакоў на снежным стэпе сто на сто кіламетраў, як у часы Напалеона! І да вясны 1920 года рэшткі „белай арміі” былі загнаныя ў Крым – грамадзянская вайна ў Расіі фактычна скончылася, а пры ўсёй разрусе і голадзе ў бальшавіцкай Расіі яе армія налічвала да 1,5 млн чалавек, пры гэтым „інтэрнацыяналістаў” у ёй – немцы, венгры, чэхі, палякі, татары, кітайцы і г.д – было больш паловы. Фактычна другім чалавекам у бальшавіцкім кіраўніцтве быў Леў Троцкі, тэарэтык „перманентнай рэвалюцыі” альбо „экспарта рэвалюцыі”; спецслужбы ВЧК узначальвалі палякі Ф. Дзяржынскі і В. Мянжынскі, намеснікамі Л. Троцкага ў вышэйшым дзяржаўным органе ВРК (Ваенна-рэвалюцыйны Камітэт) былі нямецкія габрэі К. Радак і В. Уншліхт, венгр Б. Кун і іншыя радыкалы з усяго свету... Цесна і нецікава было ім у „азіяцкай” Расіі, добра вядома было ім, што пасля вайны яны рана ці позна акажуцца ў Расіі лішнімі і паляцяць іхнія галовы. Як толькі вясною 1920 года суцішылася полымя грамадзянскай вайны, ЦК РКП(б) у глыбокім сакрэце заняўся падрыхтоўкай „сусветнай рэвалюцыі” – планавалася ажыццявіць узброеныя інтэрвенцыі ў Кітай, Турцыю, Афганістан і... Еўропу. У разбуранай Германіі „левыя” па-ранейшаму мелі моцныя пазіцыі, для фінансавання і каардынацыі дзеянняў туды паехаў К. Радак, і нават, калі ён быў арыштаваны контрразведкай і засаджаны ў Маабіт, то ў Берлін імгненна прыйшла дэпеша, што К. Радак... прызначаны народным камісарам замежных спраў чырвонай Украіны! Камера Радака была перароблена немцамі на выгодную кватэру, а на сустрэчы з ім заспяшалі не адны камуністы, а і нямецкія генералы, дыпламаты. Ішоў ціхі гандаль усіх з усімі... Шлях да Германіі з Расіі быў адзін – праз новапаўсталую ІІ Рэч Паспалітую. Не было гэта асаблівым сакрэтам і для польскай разведкі, толькі што міністры і генералы не заўжды належным чынам успрымалі яе інфармацыю...

Вясною 1920 года было дасягнута польска-ўкраінскае (з Пятлюрам) пагадненне пра наступленне на Кіеў. Прэзідэнт Украіны Сэмэн Пятлюра згаджаўся на будучую мяжу з Польшчаю па рэках Збруч на захадзе і Прыпяць на поўначы – далей на ўсходзе Украіна мела быць датуль, дакуль дойдуць польскія і ўкраінскія войскі.

Вясною 1920 года ў Варшаве і ў Мінску абываліся перамовы польскай дэлегацыі на чале з Л. Васілеўскім і прадстаўнікамі

беларускіх партый на чале з В. Іваноўскім – II аддзел Генштаба сакрэтна даносіў, што Іваноўскі мае найвышэйшы аўтарытэт у беларускай Вільні і ў Мінску; а хто ж яшчэ мог яго мець, калі палітычны рух быў расколаты і абезгалоўлены ў 1919 годзе дзеяннямі польскіх мілітарыстаў, касцёла і „крэсовых зямянаў”?! Толькі беспартыйны д-р Іваноўскі, чый брат да таго ж займаў у польскай адміністрацыі міністэрскія пасады... Федэратыўны праект ужо Іваноўскага, у тым жа справы адміністрацыі і асобнай беларускай арміі, быў прыняты, але.... для „разгляду і вывучэння” без акрэсленага тэрміну; канкрэтна ж за тыдзень дамовіліся толькі на вяртанне „статус кво” ў справе беларускай асветы і друку. Але і гэтыя дамоўленасці сабатаваліся на месцы польскай адміністрацыяй... Пілсудскі не мог адкрыта ні падтрымаць, ні адкінуць „беларускую праблему” – ён манеўраваў і чакаў. Пры гэтым ён па-ранейшаму камбінаваў далучэнне да Польскай Федэрацыі Летувы, Беларусі і Украіны як абмежаваных аўтаномій, але пра Беларусь ён выразна не хацеў гаварыць з Урадам БНР, нават з такімі памяркоўнымі і „прапольскімі” дзечамі як Іваноўскі. У Пілсудскага былі іншыя людзі для сваіх планаў – ён разлічваў на некалькіх генералаў і свой аўтарытэт у арміі. Ужо вясною быў нагатаваны план рэалізацыі федэратыўнага праекта Пілсудскага выключна збройнай сілай і без ведама ўраду ў Варшаве; „паход на Кіеў” быў пачаткам гэтага плана.

Аднак падзеі беглі іначай. З поўдня і ўсходу бальшавікі перакінулі некалькі свежых армій, у тым жа семнаццаць (!) кавалерыйскіх дывізій С. Будзённага і Г. Гая; ужо ў канцы мая быў адбіты Кіеў, прычым генерал У. Сікорскі ледзь паспеў вывесці галоўныя сілы з поўнага акружэння, а летам Чырвоная Армія пачала генеральнае наступленне і праз месяц была пад Варшавай і Львовам. Былі ізноў прадэкларававаныя не толькі Беларуская ССР у Мінску, але і.. Польская ССР у Беластоку на чале з Ф. Конам і Ф. Дзяржынскім! Цікава, што Дзяржынскі – рыхтык як „белапалякі” па тагачаснай савецкай тэрміналогіі! – спрабаваў мець у складзе „чэрвонэй Польскі” таксама Гродзенскую, Віленскую і Мінскую губерні; спрабаваў расстаўляць там у адміністрацыі сваіх людзей з мясцовых палякаў (!), друкаваць бальшавіцкія газеты па-польску і г.д.

Потым быў „цуд над Віслай”, развал савецкага фронту, новае паражэнне рэзерваў „чырвоных” у Нёманскай аперацыі і во-

сенню 1920 года польская армія ізноў заняла Мінск, а перадавыя батальёны былі за 20 км ад той самай Бярэзіны...

У час самых крытычных і напружаных баёў, фактычна на правабярэжным наваколлі Варшавы, брытанскі ўрад і прэм'ер Лойд-Джордж звярнуліся з ультыматумам... адначасова да Польшчы і Расіі. Мяжа прапанавалася на гэтак званай „лініі Керзана” – сам Керзан, які значальваў тады палату лордаў, наўрад ці добра ўяўляў сабе, дзе менавіта праведзена тая лінія; усё было апрацавана ў канцылярыі самога Лойд-Джорджа! – якая... мала разыходзілася з мяжой Царства Польскага ад 1815 года! „Еўрапеец” Лойд-Джордж аказаўся вельмі падобным да „расійскага імперыяліста” Дзянікіна, хоць прычыны таго былі, ясная справа, іншыя: брытанцы не хацелі, каб паміж Германіяй і Расіяй былі ўвогуле якія-небудзь дзяржавы, а калі ўсё ж нейкія дзяржавы ёсць, то хай будуць як можна меншыя, каб Расія і Германія былі ўсё роўна побач; каб мелі спрэчныя інтарэсы, каб пачалі новую вайну, а Брытанская Імперыя з таго б ізноў скарыстала...

Урад Польшчы – як сцвярджаў сам Лойд-Джордж у ноце ў Маскву! – на гэтыя прапановы „згадзіўся”; урад Савецкай Расіі адказаў, што ён годам раней прапаноўваў Польшчы мяжу на Бярэзіне, але тая не згадзілася... Хлусілі ўсе – брытанцы, палякі і бальшавікі. Кіравалі не ўрады і нават не штабы, усё было ў руках палкавых камандзіраў – хто каго!

Савецкая дыпламатыя на самай справе не збіралася моцна выстаўляць сваю мяжу на захад. Як дамова з летувісамі ў Маскве ад 1 ліпеня 1919 года аддавала Літоўскай Рэспубліцы Гродна, Ліду, Смаргонь і Ашмяны, гэтаксама і восенню 1920 года ў Мінску палякам ізноў прапанавалі забраць усё да Дзвіны і Бярэзіны – у Маскве ўсе межы лічылі часовымі, бо ад „перманентнай рэвалюцыі” ніхто не адмаўляўся, да таго ж, бальшавікі мелі сябе за вучняў рымлянаў з іх правам „дзялі і кіруй!”: беларусаў ужо аддалі Летуве, а цяпер амаль усіх прапаноўвалі Польшчы, каб падкласці бомбу на будучае... Трэба думаць, што польскі камуніст і прыяцель У. Леніна Ю. Мархлеўскі, які з вясны 1919 года да вясны 1920 года нелегальна матляўся паміж Варшавай і Закапаным у кампаніі генералаў і дыпламатаў, і вёў патаемныя перамовы, за гэты час добра зарыентаваўся і ў будучай польскай палітыцы на Крэсах, у яе ксяндзоўска-шалёным наступальным характары, а яго начальнікі ў Маскве прааналізавалі магчымыя наступствы і прыйшлі да высновы, што чым бо-

лей ад Беларусі і Украіны адкусіць Польшча, тым прасцей ім будзе потым праглынуць усю Польшчу з вантробамі!

*але Ён, прайшоўшы сярод іх,*
*пайшоў.*
Лука IV, 30.

Пасля прэлімінарнай паперкі, перамовы з галоднага Мінска перанеслі ў нейтральную Рыгу. Зона прыблізна ў 50-70 км шырынёю ачышчалася польскай арміяй у якасці „нейтральнай"; адразу за апошнімі адступаючымі польскімі патрулямі Мінск занялі бальшавікі...

У тыя ж дні кастрычніка 1920 года „узбунтаваўся" корпус генерала Л. Жалігоўскага (19-я і 22-я дывізія з „тутэйшых!"), які заняў Вільню і Віленшчыну. Генерал абвясціў пра стварэнне „незалежнай" Сярэдняй Літвы, але ўрад самі ж віленчукі ахрысцілі „ўрадам трох братоў" – дэпартамент замежных спраў узначальваў Ежы Івanoўскі, тры гаспадарчыя дэпартаменты Вацлаў Івaноўскі, а наборам у войска ў дэпартаменце абароны загадваў Станіслаў Іваноўскі; трэба абавязкова дадаць, што беларускі аддзел дэпартамента асветы ўзначаліў Браніслаў Тарашкевіч, аўтар нормаў і правілаў літаратурнай беларускай мовы і будучы лідэр ненавіснай „крэсавякам" і падкасцельным фанатыкам Грамады 1926 года...

„Мяцеж Жалігоўскага" быў толькі часткай глыбока заканспіраванага плана Пілсудскага, апошняга шанцу „федэралізма"... На Палессі ў савецкі тыл мела рушыць Саюзніцкая Народная Армія генерала Станіслава Булак-Балаховіча, лікам да 20 тыс. чалавек; апроч беларусаў былі там „добровольцы" галавы „Русского Национального Комитета в Польше" Б. Савінкава і ўкраінская брыгада атамана Іскры. Але мэта пахода, як планавалі яе Пілсудскі і Балаховіч, становіцца яснай, калі дадаць, што разам са штабам арміі ехаў... гатовы ўрад Беларусі П. Аляксюка пад назвай: Беларускі Нацыянальны Камітэт; а пасля ўзяцця Мазыра генерал Балаховіч абвясціў сябе Начальнікам Беларускай Дзяржавы і пачаў пагалоўную мабілізацыю ў Беларускую Народную Армію, прычым толькі за два тыдні былі сфарміраваныя з добраахвотнікаў Смаленскі, Хабенскі, Полацкі, Віцебскі і Палескі палкі. Супраць Балаховіча быў кінуты ўвесь Заходні фронт чырвоных – сем пяхотных і шэсць кавалерыйскіх дывізій, войскі

ВЧК, бронецягнікі і авіяцыя; перавага ў людзях на баку чырвоных была чатырохкротнай... А другі эшалон арміі Балаховіча – да 10 тыс. пяхоты, уся цяжкая і амаль уся палявая артылерыя – быў затрыманы... палякамі на дэмаркацыйнай лініі! „Бацьку” Балаховіча выпусцілі, а зброю не – можа, загіне; а няма чалавека, то няма клопатаў... І нават, калі „бацька” прарваў акружэнне чырвоных і перайшоў на польскі бок фронту, то палякі з 18-й дывізіі... патрабавалі здаць зброю! А за парушэнне „пакаёвай дамовы з бальшавікамі” (!) тысячы балахоўцаў фактычна інтэрнавалі і два гады (!), трымалі ў лагерах у Пётркаве і Чанстахове; самога генерала С. Булак-Балаховіча, яго брата палкоўніка Ю. Балаховіча і ўсіх афіцэраў прымусова звольнілі ў адстаўку, сакрэтны мемарандум усё таго II аддзела „не рэкамендаваў” прымаць балахоўцаў ні ў войска, ні на дзяржаўную службу і прасіў (!), каб МЗС падшукаў ім „якую-небудзь краіну (!), куды б яны маглі пераехаць”... І не прайшло года пасля Рыжскай дамовы 18 сакавіка 1921 года, як савецкі амбасадар у Польшчы Карахан і міністр Домбскі патаемна дамовіліся, каб... выслаць братоў Балаховічаў у Германію альбо на верную смерць, бо ў Германіі 1922 года баявікі камуністычнай партыі і агенты ВЧК-ОГПУ хадзілі, як па сваёй хаце... У выніку скандалу, бо пра намеры Домбскага стала вядома Балаховічу і ён падняў на ногі генералітэт і прэсу, цэлы ўрад В. Вітаса пайшоў у адстаўку. Сам генерал паспеў яшчэ паваяваць на баку генерала Франка ў Гішпаніі, у вераснёўскай кампаніі 1939 года і ў падполлі; загінуў ён у 1942 годзе ў наваколлі Варшавы, трапіўшы ў засаду СД.

Жалігоўскі выйграў, а Балаховіч – не (па розных прычынах). З адным біліся (сімвалічна!) толькі заслоны шавулісаў, другі меў перад сабою Чырвоную Армію ў значнай перавазе. Аднаго бесперашкодна забяспечвалі зброяй і амуніцыяй, а палітыкі ездзілі і збіралі „дабраахвотнікаў”, другому адабралі нават ужо падрыхтаваныя рэзервы. Але галоўнае было ў тым, што генералітэт падтрымаў Пілсудскага толькі часткова: ну, Вільня то ўсё ж былая сталіца, настальгія, памяць etc. А што з таго Мінску? Ды і наступаюць на Вільню „палякі”, а на Мазыр і Мінск нейкія „хамы”... Яшчэ больш паскудна, але і больш шчыра пісалі варшаўскія газеты:

– „тое, што адбылося ў Вільні, і тое, што хіба адбудзецца ў Мінску-Літоўскім (падкрэслена мною – А. Ч.), нішчыць падмурак

спакою ўжо ў гэтую хвіліну, калі нават не падпісаная дамова з Масквою...”!

Тых „мінскіх полякув” накшталт памянутага вышэй мемуарыста Рдултоўскага, сытыя Познань і Кракаў, якім „надакучыла” шасцігадовая вайна, проста кінулі, а за імі кінула іх і Варшава, на якую тыя ў Мінску так спадзяваліся... А той Пілсудскі, чыімі „беларускімі” прамовамі яны абураліся годам назад, цяпер застаючыся галоўнакамандуючым мала не ў канспірацыі мусіў камбінаваць з нейкімі „хамамі”, каб не кінуць „міньчукув” і „надбэрэзыньцув”! О так, пане-браце!!!...

*быў у сінагозе чалавек,*
*які меў у сабе дэмана нячыстага,*
*і той закрычаў немым голасам.*
Лука IV, 33

Пасля рыжскага дагавору 18 сакавіка 1921 года паміж РСФСР, Украінскай ССР і Польшчай беларускія землі былі раздзелены дзяржаўнымі і адміністрацыйнымі межамі на чатыры кавалкі. Заходняя частка адышла Польшчы з выняткам „Сярэдняй Літвы”, чые далучэнне да Польшчы было таксама справай часу; усходнія землі ўваходзілі ў Віцебскую, Смаленскую і Гомельскую губерні РСФСР, а з шасці(!) паветаў Мінскай губерні была зноў утворана Беларуская ССР. Што ж, фармальна, і гэта дзяржаўка была суб’ектам міжнароднага права – летам 1921 года ў Мінску адчынілася пасольства Германіі. Плошча БССР складала 52,3 тыс. кв. км., а насельніцтва толькі 1,64 млн чалавек. Першапачаткова планавалася, што да БССР будуць належаць і заходнія землі: Ліда, Баранавічы, Пінск, Брэст і Гродна – дэкляравалася ж яе „другое абвяшчэнне”, хоць і пасля разгрому Чырвонай Арміі пад Варшавай, але фронт на нейкія два тыдні стабілізаваўся тады прыблізна на цяперашняй мяжы Беларусі і Польшчы. У 1921 годзе БССР яшчэ не была буферам паміж Польшчай і Расіяй, пакінулі ж ёй „самастойнасць” бальшавікі толькі таму, што наступствы „палескага паходу” Булак-Балаховіча выразна адчуваліся яшчэ некалькі гадоў – у лясах былі тысячы „зялёных” (мужыцкая самаабарона), увесь Заходні фронт быў задзейнічаны ў карных акцыях, па-за Мінскам, Слуцкам і буйнейшымі мястэчкамі цывільнай савецкай улады фактычна не існавала, „зялёныя” былі мілітарна не пагрозлівым, але вельмі

дакучлівым ворагам, тым болей, што ніякіх „сваіх” камуністаў на Беларусі практычна не было, да 1924 года ўся партыя налічвала толькі тысячу дзвесце чалавек (для параўнання: у 1917 годзе Беларуская Сацыялістычная Грамада налічвала восем тысяч!), а ўся рэальная ўлада належала арміі і ВЧК-ОГПУ. Ваеннае становішча ў Беларусі на савецкім баку „рыжскай мяжы” захоўвалася да вясны 1924 года, тут працягвалася грамадзянская вайна, апошні ж рэгулярны атрад „зялёных” быў знішчаны пад Рудзенскам (50 км на ўсход ад Мінска) ажно ў 1929 годзе...

На „польскім” баку тае рыжскай лініі фармальна ваеннага становішча не існавала, але войска несла службу ў падвышанай гатоўнасці да канца 1922 года, так што першыя паваенныя выбары ў беларускіх ваяводствах Польшчы, як і плебісцыт у Сярэдняй Літве, адбываліся пад дуламі карабінаў. Палескае, Беластоцкае, Навагрудскае і Віленскае ваяводствы мелі агульную плошчу 112,9 тыс. км2, а насельніцтва налічвалася 4,6 млн. чалавек. Заходняя Беларусь перажывала не так грамадзянскую вайну, хоць і „ковенскі ўрад” БНР В. Ластоўскага арганізоўваў баявыя групы (Г. Шыманюк-„Скамарох” і інш.), і ўрад БССР высылаў дыверсантаў (будучыя генералы ОГПУ-НКВД Арлоўскі і Ваўпшасаў), але страшную галечу ў выніку нямецкай акупацыі, прымусовай эвакуацыі праваслаўных у Расію ў 1915 годзе і пазнейшай савецка-польскай вайны.

На абодвух баках „рыжскай мяжы” панаваў хаос, беларусы не былі настаўленыя прыхільна ні да бальшавікоў, ні да палякаў – Расія і Польшча мелі прыблізна роўныя шанцы кожная на падкантрольнай тэрыторыі стварыць „беларускі Пьемант”, з дапамогай якога падтрымваць і гадаваць сепаратысцкія настроі на супрацьлеглай тэрыторыі суседа.

Адчай панаваў на цэлым абшары. Але з адчаю расце не адна роспач і смерць, расце і надзея. Прычым тая надзея ў чалавеку скіравана не на светлую будучыню альбо на дабро Айчыны, але на рэальную і хуткую паправу свайго побыту, існавання. І сталася так, што пастунова перавага схілілася на бок бальшавікоў...

Ужо вясной 1921 года саветы былі змушаны адмовіцца ад палітыкі т.зв. ваеннага камунізму, і „продразвёрстки” альбо суцэльнага рабунку вясковых гаспадарак. Шматлікія паўстанні (Кранштат, Тамбоў, Сібір і інш.) змусілі ўлады і да самай шырокай амністыі – хаця саміх паўстанцаў Троцкі і Тухачэўскі нішчылі

авіяцыяй і газамі, расстрэльвалі палонных, палілі вёскі і не пакідалі ў жывых ні старых, ні малых! А брак кваліфікаваных работнікаў адміністрацыі і тэхнічнага персаналу патрабаваў лібералізацыі парадкаў і адмаўлення ад вынішчэння „классовых врагов”, „богачей” і г.д. Дастаткова сказаць, што вярнуліся з эміграцыі лідэр украінскіх сацыялістаў Віннічэнка (другі чалавек ва ўрадзе С. Пятлюры!), начальнік штаба арміі Врангеля на Крыме генерал-лейтэнант Слашчоў, празаік з сусветным імем А. Талстой і інш. На Беларусі гэта праяўлялася ў масавым наплыве да РКП(б) і дзяржаўнага апарату... былых сацыялістаў, у тым жа дзеячаў БНР, а таксама ў найпершым пачатку эміграцыі з Польшчы беларускай інтэлігенцыі, хаця гэтая плынь і не была шматлікай. Але – паказальна! На працягу 1923 года, калі ў СССР бальшавіцкае кіраўніцтва грызлася за спадчыну хворага У. Леніна і вызначаліся лідэры двух асноўных груповак, І. Сталін і Л. Троцкі, ішла падрыхтоўка да пашырэння БССР коштам Расіі – тут галоўную ролю адыгралі менавіта былыя сацыялісты, а знайшлі яны падтрымку ад сталінскай групы. З 1918 года І. Сталін узначальваў Народны Камісарыят па справах Нацыянальнасцей і здолеў стварыць апарат большы за ОГПУ і партыйныя камітэты губерній разам узятыя. І. Сталін фактычна ажыццяўляў падбор людзей ува ўсе дзяржаўныя інстанцыі на месцах – нават утварэнне Савецкага Саюза ў снежні 1922 года, калі замежныя справы, войска і спецслужбы ды замежны гандаль цалкам адышлі Маскве, мала што змяніла. Пасля смерці У. Леніна ў студзені 1924 года сепаратызм у савецкіх рэспубліках дасягнуў найбольшага размаху. Ужо ў сакавіку 1924 года да БССР далучана Полацк, Віцебск, Оршу, Магілёў і Бабруйск, а яшчэ праз паўтары гады Гомель і Рэчыцу – так канчаткова афармілася сягонняшняя мяжа Рэспублікі Беларусь з Расіяй. Да восені 1939 года БССР займала тэрыторыю 125,9 тыс. кв. км., на якой жылі 5 млн. чалавек – многія суверэнныя дзяржавы тагачаснай Еўропы былі яшчэ меншыя.

На польскім баку „рыжскай лініі” беларусы не атрымалі не тое, што нацыянальна-культурнай аўтаноміі – гэта прадугледжвала фармальная дамова польскага ўрада з Найвышэйшай Радай БНР (Я. Лёсік, А. Смоліч, І. Серада, С. Рак-Міхайлоўскі, В. Іваноўкі, А. Цярэшчанка) ад 24 сакавіка 1920 года – але згубілі нават тое, што яшчэ было. Як у Мінску ў 1919 годзе, так цяпер у Вільні, Гродне і па ўсёй Заходняй Беларусі ліквідаваліся бела-

рускія арганізацыі, школы, курсы, выдавецтвы, а іх актывісты часта арыштоўваліся за... „бальшавіцкую прапаганду”! Плебісцыт 1922 года пра далучэнне Сярэдняй Літвы да Польшчы ў якасці Віленскага ваяводства без усялякага следу абяцанай аўтаноміі штурхануў беларускіх лідэраў альбо на адыход ад палітычнай дзейнасці ўвогуле (В. Іваноўскі), альбо на выезд у БССР (Я. Лёсік, А. Смоліч і інш.), ці на рэзкі паварот да „левых” (Б. Тарашкевіч, С. Рак-Міхайлоўскі).

У кастрычніку 1923 года на базе Беларускай Рэвалюцыйнай Арганізацыі, гэта значыць: левых сацыялістаў з таго самага БНК, чый старшыня А. Прушынскі (Гарун) выступаў з афіцыйнай прамовай пад час памятнага візіту ў Мінск Ю. Пілсудскага, была створана падпольная КПЗБ, чые сакратары ўваходзілі ў ЦК КП(б)Б! Без сацыялістаў, адкінутых ад супрацоўніцтва польскімі ўладамі, ніякага камуністычнага падполля на Заходняй Беларусі проста не магло быць – з 4 млн. чалавек было толькі... 86 тыс. рабочых, калі не лічыць 25 тыс. беспрацоўных, ды і тыя амаль цалкам былі габрэі! Тое, што было ў КПЗБ на пачатку чалавек усяго трыста, істотнага значэння не мела – важна, што літаральна праз два-тры гады польскай улады на Крэсах нават „прапольскія” беларусы павярнуліся да бальшавікоў. Гэта быў самы першы вынік найноўшай польскай палітыкі – такі вынік, якая і сама палітыка; за апошнія дзвесце гадоў палякі на Крэсах не прыдумалі нічога новага. „Пераважная (дамінуючая) меншасць”, падмацаваная наезным войскам і паліцыяй, абсела на сто працэнтаў і адміністрацыю, і дзяржаўныя прадпрыемствы (транспарт, сувязь etc.), і дзяржаўны гандаль, і асвету, і культуру, і суд, і палітыку... „Дамінуючая меншасць” ўяўляла сябе за большасць – бо гэта толькі яна была „праўдзівымі палякамі”; непалякаў на Крэсах дэ-факто не існавала, значыць, не існавала і ніякіх нацыянальна-гістарычных асаблівасцяў рэгіёна, рэлігійнага падзелу, гаспадарчага заняпаду... Беларусы былі людзьмі другога гатунку; прававыя нормы і Канстытуцыя распаўсюджваліся на católікаў-палякаў, астатнія даставалі тое, што ім гарантавалася правам, выключна з ласкі мясцовай адміністрацыі.

Дыскрымінацыя непалякаў была асноўнай рысай ІІ Рэчы Паспалітай 1919-39 гадоў. Вось што на самай справе азначае падзел на Польшчу А і Польшчу Б! Катастрафічнае становішча прамысловасці і сельскай гаспадаркі, трактаванне Крэсаў як сыравіннай базы ды аператыўнай прасторы на выпадак новай вай-

ны з СССР былі не асновай, але надбудовай менавіта той дыскрымінацыі, вынікаючай з касцельнага місіянерства і шляхецкай настальгіі па мінулым. Станіслаў Цат-Мацкевіч, у тыя гады рэдактар віленскага „Слова”, абсалютна слушна пісаў, што Крэсы былі адзіным месцам у цэлай Еўропе, дзе феадалізм XVIII стагоддзя пратрываў некранутым да верасня 1939 года...

*І напала на ўсіх жудасць,*
*і разважалі паміж сабою:*
*што гэта азначае, што Ён з уладаю*
*і сілаю загадвае нячыстым духам,*
*і яны выходзяць?*
Лука IV, 36

Пасля лістападаўскіх выбараў 1922 года ўсе беларускія арганізацыі ўтварылі Беларускі Пасольскі Клуб: сацыял-дэмакраты А. Аўсянік, П. Мятла, Б. Тарашкевіч, Ф. Ярэміч, хрысціянскія дэмакраты А. Станкевіч, Б. Багдановіч, сацыялісты С. Баран, У. Каліноўскі, С. Якавюк, С. Рак-Міхайлоўскі, беспартыйныя М. Кахановіч, В. Рагуля. Фактычна кіраваў БПК, хоць і не быў паслом Сойма, экс-прэм'ер БНР А. Луцкевіч. Гэта была цалкам легальная арганізацыя, якая пачаткова адмаўляла і супрацоўніцтва з бальшавікамі ў Мінску, і аперціся на эміграцыйны ўрад БНР у Берліне, Празе-Чэшскай.

І менавіта БПК з першага дня сталі абвінавачваць палякі... у антыдзяржаўнай дзейнасці! На думку пілсудчыкаў, якія на Крэсах усталявалі сваю санацыю без Пілсудскага за чатыры гады да перавароту 1926 года, сама беларуская нацыянальнасць азначала „антыдзяржаўную дзейнасць”! Дайшло да таго, што паслы С. Баран і У. Каліноўскі былі... арыштаваны без пазбаўлення іх пасольскага імунітэту, а Сойм адхіліў нават разгляд пратэсту БПК і іншых пасольскіх клубаў у гэтай справе! З цяперашняга часу, калі чытаеш стэнаграмы, газеты і рапарты контрразведкі, складваецца ўражанне, што практычна ўсе палітычныя плыні Польшчы імкнуліся ад пачатку ліквідаваць менавіта легальны нацыянальны рух, загнаць яго ў падполле, прымусіць шукаць замежнай падтрымкі.

Але асноўнай праблемай для Заходняй Беларусі была зямля. Ажно пяцьдзесят пяць тысяч гаспадарак мелі 1-2 га зямлі, кожны шосты мужыцкі двор у сярэдзіне 20-х не меў нават ка-

ровы, кожны трэці двор не меў каня. Тут ужо не тое, што не магло быць ніякага рынку, тут можна было гаварыць толькі пра фізічнае выжыванне. Рэформы 20-х гадоў складаліся: з парцэляцыі (на продаж ішла пераважна „нічыя зямля”, якую кінулі ў вайну памешчыкі з Расіі); з ліквідацыі сервітута (пры гэтым землі супольнага карыстання двара і вёскі ішлі на продаж, а не на падзел, і даставаліся таму ж багацейшаму двару!); і з камасацыі (або: рассяленне гаспадароў на хутары, ліквідацыя „шахаўніцы”). Рэформа ажыццяўлялася – зрэшты, як і любая рэформа! – у інтарэсах саміх „рэфарматараў”. Але тыя „рэфарматары” былі тою ж „дамінуючай маншасцю” – „крэсовымі зямянамі”! – а калі дадаць, што зямельная рэформа спалучалася з павелічэннем дзяржаўных падаткаў і фактычным аднаўленнем даўно забытых павіннасцей – будаўніцтва і рамонт дарог, і мастоў, падводы, праца „на скарб паньства” і г.д. – аднаўленнем шарварка, падарожчын, ловаў (!), „гвалтаў” і „згонаў”, а ўсе з таго ж XVIII стагоддзя, то няцяжка ўявіць, які настрой панаваў на вёсках... II Рэч Паспалітая, менавіта, на беларускіх Крэсах была ахрышчана Панскай Польшчай – гэта ўжо потым тыя словы з вясковай хаты пад саломай і з глінянай падлогай трапілі да маскоўскай прапаганды! Хам не разумеў і не хацеў разумець мэтаў палітыкі – ён разумеў яе тэхналогію. А практычная ўладная рэалізацыя той палітыкі кожны дзень нагадвала яму адно і тое ж: „поляк то пан, а не поляк то хам”!... У адным трэба прызнаць рацыю санацыйнікам – яны здолелі бядоце Крэсаў надаць нацыянальна-рэлігійны колер: біскупскія каталіцкія вёскі, дзе па-польску адмаўлялі толькі пацеры, а ў будні дзень не разумелі ні настаўніка, ні паліцэйскага, таксама адчувалі сябе ў варожым атачэнні. Але дасягалася гэта не ільготнымі крэдытамі ці іншым заахвочваннем да Польшчы мясцовых каталікоў, бо на тое не было сродкаў, а калі былі, то не даходзілі, але дадатковым адміністрацыйным уціскам, ксяндзоўска-маёнткавым самадурствам над праваслаўнымі. Чым ваяваць з жабрацтвам, то лепш распаліць вайну паміж жабракамі! Дагэтуль на Крэсах – праз шэсцьдзесят-семдзесят гадоў пасля, не гавораць „палякі – беларусы” ці „каталікі – праваслаўныя”, але з поўнай узаемнай знявагай дзеляць на нашых і вашых... Санацыі даўно няма, але справа яе жыве і квітнее!

Тады ж – хоць і пачалося тое раней! – замацаваўся тып новага чалавека: „касцельны паляк” альбо „крэсовы поляк”... Ужо памянуты акадэмік Тадас Іванаўскас адзначаў у сваіх мему-

арах яшчэ пра часы царызма: „Якой нацыі былі мясцовыя людзі? Не буду гаварыць пра буйных землеўладальнікаў – то ж паны-каталікі, а панскі каталіцызм абавязваў да польскасці! Сяляне часткай цягнуліся да „рускіх”, часткай да „палякаў”. Калі спытаць мясцовага пра нацыянальнасць, той адказваў: „тутэйшы”... Вось тыповая размова з мясцовым гаспадаром пра веру: „Хто ты будзеш?” – „Э-э, там! Няма чым хваліцца: праваслаўны...” Нават, калі за цара-бацюшкі праваслаўны „не меў чым хваліцца”, бо цудоўна ведаў, што царскага жандара ён бачыць раз у год, а ад „польскага пана” залежыць кожны дзень, то можна толькі ўявіць, як мацней гэты сам мужык стаў залежаць ад пана, падмацаванага польскімі войскам, паліцыяй, судом, адміністрацыяй, касцёлам, школай, Богам і Чортам!!!

Той жа Іванаўскас працягвае: „Пры царызме па ўсёй Летуве і Беларусі існавалі толькі рускія школы. Лацінскі ж алфавіт забаранялася вывучаць нават прыватна... Асобныя памешчыкі – дакладней, іх жонкі (падкрэслена мною – А. Ч.) – трымалі падпольныя школкі, дзе вучылі польскай граматыцы; праўда, канчатковая мэта навукі была няхітрая – абы мог чытаць польскі малітоўнік ды паўтараць у нядзелю за ксяндзом пацеры... Тое ж засталося і пры II Рэчы Паспалітай: па-за Вільняй і Гроднам ды асобнымі мястэчкамі такі ж узровень адукацыі давала „школа польска” – ну, бо хто ж хацеў ехаць з Познані ды Варшавы на тыя, забытыя людзьмі і Богам. Крэсы?! Паланізацыю – як і шарваркі! – адраблялі мясцовыя „касцельныя палякі” з дзікім крэсавым акцэнтам альбо mikkką grodzieńską polszczyzną... Гэтаксама, пазней саветы мясцовымі ж недавукамі рабілі тут русіфікацыю! У выніку сягоння маем ні два „языка”, ні паўтара, ні нават адзін і семдзесят пяць сотых. Пануе псеўдамова трасянка – корм жывіне, трасянка сена з саломай! – а сягоняшні касцёл ужо пры Гарбачове і яго „перестройке” пускаў на Крэсах „польскія” малітоўнікі кірылічным шрыфтам і з пастаўленымі націскамі... „Касцельны паляк” альбо kresowy Polak гэта такі псеўдапаляк, чыя польскасць трывае гадзіну на тыдзень, на імшы ў касцёле. Больш ні яму (но-о бо-о по-о цо-о?!), ні касцёлу не трэба: адзін чуе сябе „вышэй хама”, другі піша ў сваю касцельную статыстыку яшчэ аднаго „праўдзівэго поляка”...

У 20-я і 30-я гады зямельны голад на Крэсах не яднаў, але дзяліў галодных! Быў той падзел падмацаваны ў імя Айца, і Сына, і Святога Духа... Зрэшты, а ці можа хоць што-небудзь паяд-

наць двух галодных?! Хіба што рабункі мужыкоў... Сацыялізм ішоў па Крэсах у след за санацыяй!

*І разнеслася чутка пра Яго*
*па ўсіх навакольных мясцінах.*
Лука IV, 37

Ужо 24 чэрвеня 1925 года Б. Тарашкевіч, датыхчасны лідэр БПК, сам разарваў гэты клуб і заявіў пра паўстанне клуба новай Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады. Як выразна відаць, БСРГ нават абрэвіятурай мала чым адрознівалася ад БСГ, Беларускай Сацыялістычнай Грамады, заснаванай Луцкевічамі і Іваноўскім ажно ў 1902 годзе і добра памятнай мужыкам з 1917-22 гадоў! Што цікава – праграма БСРГ была такой самай радыкальнай, як і праграма БСГ, толькі што „першая" Грамада выступала супраць Расійскай Імперыі, а „другая" Грамада супраць Польшчы.... Нядаўні дзеяч ураду Сярэдняй Літвы такім чынам узначаліў антыпольскі рух!

БСРГ узначалілі яшчэ паслы Сойму – акрамя Тарашкевіча – П. Мятла, П. Валошын, С. Рак-Міхайлоўскі (!) – апошні быў фактычным кіраўніком антыбальшавіцкага Слуцкага Паўстання ў лістападзе-снежані 1920 года ў „нейтральнай зоне", інспіраванага ўладамі БНР. Гэта здаецца парадоксам толькі на першы погляд: але ж у 1925 годзе канферэнцыя беларускай палітычнай эміграцыі ў Берліне прызнала БССР адзіным палітычным прадстаўніком усяго беларускага народа – у Мінск вярнуўся і кіраўнік „ковенскага ўраду БНР" В. Ластоўскі, які быў адразу ж прызначаны... сакратаром Беларускай Акадэміі Навук! Вектар беларускай апазіцыі ў Польшчы выразна павярнуўся на Мінск... Фармальна Грамада патрабавала таго ж, чаго ўсе левыя ў цэлай Еўропе: канфіскацыя памешчыцкіх зямель без выкупу і перадзел іх паміж беззямельнымі і малазямельнымі, стварэнне „працоўнага" ўраду, устанаўленне роўных для ўсіх дэмакратычных свабод, васьмігадзінны працоўны дзень, аднаўленне беларускай школы і г.д. Але былі два параграфы, якія кожны ўрад у тагачаснай Еўропе трактаваў бы, як антыдзяржаўныя: па-першае, ліквідацыя „асадніцтва", па-другое, самавызначэнне Заходняй Беларусі.

„Асадніцтва" было праявай, так паміж намі, малаістотнай з пункту гледжання зямельнай праблемы. Ветэраны вайны 1920 года атрымвалі на Крэсах коштам дзяржавы альбо за невялікія

сумы кавалкі 15-30 га, на хутары; да 1934 года было іх асаджана толькі восем тысяч семсот сорак два, а і тыя ўздоўж савецка-польскага пагранічча. Але асаднікамі былі нават не тутэйшыя панове, а выключна каланісты з цэнтральнай Польшчы; тыя асаднікі мелі права трымаць неабмежаваную колькасць зброі і права ўжываць яе для самаабароны, былі фактычна рэзервам КОПу і паліцыі... Скасаванне інстытута асадніцтва фактычна азначала б патрабаванне аўтаноміі Крэсаў – бо згодна з пастуламі БСРГ выходзіла, што зямлю тут мог атрымліваць ці купляць толькі тутэйшы! Самавызначэнне Заходняй Беларусі, калі нават на пазнейшым судзе сам Б. Тарашкевіч трактаваў гэта не як „далучэнне да СССР", але як самавызначэнне беларусаў у межах СССР і Польшчы адначасова, падрывала ўжо тэрытарыяльную цэласнасць Рэчы Паспалітай! Не будзем, аднак, наіўнякамі – не будзем думаць, што сам Б. Тарашкевіч таго не разумеў...

Сам Тарашкевіч сваім разрывам пасольскага клуба адназначна сігналіў Мінску, што беларускія партыі ў Польшчы вычарпалі ўсе магчымасці супрацоўніцтва з Варшавай і таму гатовыя прыняць умовы Мінска! Ужо ў лютым 1926 года ў Сопаце пад Вольным Гданьскам адбылася законспіраваная нарада лідэраў Грамады і... мінскіх функцыянераў з ЦК і ОГПУ. Там былі абмеркаваныя тактыка і парадак дзеянняў, шляхі фінансавання і ўсе астатнія тэхнічныя праблемы. Але, калі нават Тарашкевіч пабег у мінскае ОГПУ, гэта магло значыць толькі адно: ІІ Рэч Паспалітая растаптала ўсе „федэралістычныя" абяцанкі і робіць Польшчу для палякаў, хоць у той Польшчы украінцаў, жыдоў, беларусаў, немцаў, рускіх і татараў можа больш паловы.

Фармальна Б. Тарашкевіч – з 1925 г. у КПЗБ? – заявіў пра паўстанне Беларускай Сялянска-Работніцкай Грамады ў маі 1926 года – за два тыдні да ваеннага перавароту Ю. Пілсудскага! Трэба прызнаць – яго арганізацыйнай групе папярэдні год не прапаў дарэмна: у Вільні і на месцах былі прыцягнуты да работы некалькі сот чалавек, наладжаны легальны і падпольны друк, ажыццяўлялася хуткае і па нашых крэсавых мерках немалое фінансаванне... праз спецыяльна заснаваны Беларускі Банк, якім распараджаўся экс-прэм'ер Ураду БНР Ан. Луцкевіч! Хм, дайце людцы веры... Беларусы раптам скінуліся і заснавалі банк?.. Палітычны крызіс у Польшчы, калі не выклікаў параліч улады, дык быў да таго блізкі, таму інструктары БСРГ мелі пэўны час цалкам дэмакратычную свабоду – хоць і боек з паліцыяй і нанятымі

за злотыя хуліганамі гэтаксама не бракавала. Прынятую на сягоння лічбу сяброў Грамады ў дзве тысячы чалавек можна лічыць больш-менш блізкай да праўды. Гэта ажно ў 60-я яны ператварыліся ў 2 тыс. „гурткоў”, а сама БСРГ нібы налічвала аж... 120 тыс. чалавек! Адна, кажуць, з буйнейшых у Еўропе і цэлым свеце сялянскіх партыяў... БСРГ была сапраўды масавая – на Крэсах, па вёсках, сярод мужыкоў! – але ў пазнейшым савецкім разуменні „масавасць” і тыя дзве тысячы ніяк не супадалі... Ім давай дзесяткі і сотні тысяч! Зрэшты, гэтыя прыпіскі, як і ўсё савецкае, не вартыя сур’ёзнай увагі. З гістарычнага пункту гледжання цікавае што іншае.

Забарона БСРГ 21 сакавіка 1927 года, сутычкі вёсак з паліцыяй – у Косаве-Палескім паліцыя ўжывала ўжо не палкі, але кулямёты! – арышты па вёсках, судовыя працэсы (разам асуджана 547 чалавек!) спіхнулі да камуністычнага падполля не толькі інструктараў-грамадоўцаў, але і тых, хто не лез у палітыку раней! Палітычнае значэнне Грамады і наследнага ёй „Змагання” было хутчэй прапагандысцкім, але ж для вёскі не так яе „дзейнасць”, як разгром меў рашальны паварот у сэнсе псіхалогіі: па ацэнках паліцыі, на пачатку 30-х падпольная КПЗБ лічыла 4-5 тысяч чалавек – і гэта – увага! – па вёсках... Масавая падпольная партыя ў баязлівай беларускай вёсцы?.. Трэба было ўмець таго дамагчыся! Але ж, бо ўмелі – суды скончыліся, ваеннае становішча адменена, але паліцэйскі мардабой працягваўся, як і раней... І тыя арышты, пабоі, затрыманні і пагрозы былі скіраваныя супраць некаталікоў.

Людзі пакутавалі за тое, што яны іншае веры!

А ў пастарунках убівалі ім у галовы і задніцы, што яны... камуністы і кацапы!

І ў гэтых сялянскіх галовах узнікала новая вера – як у любых мучанікаў! – што ёсць нейкая „светлая жизнь”, ёсць Савецкі Саюз, дзе ўсё добра, і ёсць мудры бацька Сталін… Зразумела, такая вера не была масавай, але яна мела перспектывы, як усё новае і прывабнае для маладых...

Калі гаварыць пра культурны ўплыў, ці больш слушна: пра ўплыў аднаго народа на псіхалогію другога, і паглядзець на цяперашні непахісны запал Беларусі згуртавацца вакол чарговага бацькі ды паслаць к чортавай матцы астатні свет, то трэба прызнаць, што не Міцкевіч і не іншыя геніі польскай культуры зрабілі ўплыў на цяперашняга сярэдняга беларуса, але ліхія санацыйнікі!

Што ж, калі вёску ачапляе паліцыя і гэтак спрабуе выбіць падаткі, а ў суседнім двары з паркам граюць на фартэпіянах, то не так проста выбіць з той жа галавы, што адрозненне паміж Шапэнам і крэсавым прыдуркам усё ж такі ёсць... Дарэчы, пра падаткі. Гэта згаладалым чырвонаармейцам з раскулачанай Расіі заходнебеларускі Яська ці Кузька здаваўся мала не панам, а як першых вызваліцеляў змянілі другія, то нямецкая калькуляцыя паказала, што, каб мець пастаўкі збожжа і сала без карных аперацый і не руйнаваць пры тым хоць тое, што ёсць, то падатак магчыма накласці ў чатыры разы меншы за даваенны польскі.

Справядлівасці гістарычнай дзеля: санацыйнікам ні трохі не саступалі бальшавікі!

*І вось калі Ты паклонішся мне,*
*дык усё будзе Тваё.*
Лука IV, 7

На тым баку „рыжскай мяжы" ў тых жа 1926-27 гадах набываў моц той самы новы міф, новая вера – і неўзабаве ў яе таксама паявіліся новыя мучанікі! – што ёсць новае „сьветлае жыцьцё" (беларусізацыя-ж!), ёсць Савецкі Саюз, ёсць мудры Сталін... Камуністычнай вярхушцы канчаткова абрыдлі вечныя з'езды ВКП(б), кампаніі, лініі і грызня наверсе – людзі хацелі знаць ясна: што можна, што не і перад кім выструньвацца. Вясковым хлебасеям гэтак абрыдла і вечная грызня паміж сабою: хто багаты, хто бяднейшы, хто каго падстрэліў у ваенную растатурыху; і надакучылі ім усе тыя „смычки города с деревней", што на справе азначала ціхую ліквідацыю дэфіцыту на месцы коштам мужыцкай зямелькі ды таго, што яна родзіць... На пачатку таго ж 1927 года, калі з-за польскай мяжы д-р Тарашкевіч разлічваў на Мінск, тады ўжо ў Маскве смутна пераканаліся ў поўным правале „эскпарта рэвалюцыі" Л. Троцкага, распачатага вайною 1920 года, абхапіўшага потым паўстанні ў Гамбурзе ў 1923, Балгарыі ў 1923-25, Эстоніі ў 1924... „Афера Тарашкевіча" была канцом сусветнай рэвалюцыі. І канцом Троцкага! Восенню 1927 года ён быў выкінуты з усіх пасадаў і высланы ў Алма-Ату, што пад мяжою з Кітаем, а потым яму ж... прапанавалі па-ціхаму выехаць у Амерыку: маўляў, з рэвалюцыяй нічога ў цябе не выйшла, а там чытай сабе лекцыі, як чытаў у 1907-17 гадах... Прыблуда ты тут!

Троцкі хацеў у Еўропу! Самай горшай абразай для Троцкага-Бранштэйна было нагадаць яму пра яго віленска-адэскае жыдоўскае паходжанне... Троцкі быў сам па сабе – так што не магу назваць яго нават касмапалітам. „Сусветная рэвалюцыя" з дапамогай збройнай інтэрвенцыі Чырвонай Арміі, змоваў і мяцяжоў у Азіі і Еўропе правалілася; больш таго – дальнабачны семінарыст Сталін знюхаў у сваім народным камісарыяце па справах нацыянальнасцей, што кожны нацыянал-камуніст рана ці позна будзе больш нацыяналіст, чым камуніст, будзе не падпарадкоўвацца яму, Сталіну, у камунізме будзе раскол і яму прыйдзе канец... І да захавання камуніста і камунізму ўвогуле, і яго, Сталіна, у прыватнасці, можа прывесці толькі новая Расія. Усяленскі носьбіт камунізму можа быць толькі адзін, таму што камунізм немагчымы без дыктатуры, а дыктатура без партыі, а партыя без ЦК, а ЦК без правадыра. А з усіх нацыяў, што не маглі абысціся без правадыра, была вось разбітая, растрэсеная, пазбаўленая адукаванай эліты, галодная Расія... Накарміць, супакоіць, запарадкаваць, навучыць яе Сталін не мог – але мог зрабіць яе мілітарнай, вялікай і страшнай усяму свету.

Місійнасць камунізму і „русской идеи" супадалі ў Сталіна ідэальна! Але спачатку трэба было рэалізаваць тры заданні:

– па-першае, лікідаваць усялякую апазіцыю ды іншадумства ў ЦК ВКП(б) і Камуністычным Інтэрнацыянале ў Маскве;

– па-другое, ліквідаваць усялякі нацыяналізм (паказальна, што камуністы ў савецкіх рэспубліках вынішчаліся за нацыянальную дэмакратыю, якую ад нараджэння не вызнавалі!); спачатку ў СССР, а потым за яго межамі – у камуністычным руху;

– па-трэцяе, пакуль Еўропа ліжа раны пасля вайны, стварыць такі мілітарны патэнцыял, пры якім можна будзе абыходзіцца без саюзнікаў наогул...

Грошы на гэты патэнцыял можна было ўзяць толькі там, дзе іх брала даваенная Расія – прадаваць хлеб. Прадаваць хлеб было нельга, таму што не было за што купіць яго ў вёсцы. Нарошчваць прадукцыю тэкстылля, сельгастэхнікі і г.д. было нельга, таму што тады прыйшлося б адмовіцца ад мілітарызацыі гаспадаркі. Заставалася адно – вынішчыць усіх, хто супраць такой лініі, задушыць магчымую грамадзянскую вайну ў самым яе зародку і атрымаць... на Захадзе тэхналогію і машыны.

І ўсё гэта для гэтага... Сталін ужо меў! ОГПУ, войска і адзічэлы за шэсць гадоў вайны народ... Ліквідацыя праваслаўнай

царквы ў СССР у 1921-26 гадах не выклікала ніякага супраціву... і калі ў 1926 годзе „раптам" памёр Дзяржынскі, а ОГПУ узначаліў выхаванец Сталіна, Гэнрык Ягода, і калі ў тым жа годзе іерархі царквы заклікалі паству маліцца за бальшавікоў і забаранілі(!) нават памінаць іх ахвяраў, Сталін зразумеў, што ягоны час надышоў...

Тое, што раптоўна стала рабіцца на Беларусі з 1928 года, рабілася „раптам" толькі з пункту гледжання беларускіх патрыётаў – у нас і дагэтуль вынішчэнне нацыянальнай інтэлігенцыі і разбурэнне вёскі калектывізацыяй лічацца неяк асобна спланаванай антыбеларускай акцыяй вялікадзяржаўных расійскіх шавіністаў. Гэтак жа плачуць сабе ўкраінцы, казахі і ўсе астатнія „братнія народы"... На самай жа справе былі гэтыя ахвяры нават не пачаткам нейкага „новага свету", але канцом старога – камунізм была апошняя універсальная рэлігія, здатная на ўсе выпадкі жыцця. Пачатак <u>практычнага</u> камунізму і азначаў канец старога свету, у якім ідэя значыла ўсё, а чалавек нічога...

І цэлы народ можа не значыць нічога ў тым свеце, дзе нічога не значыць хоць адзін чалавек!

А між тым трацкісты, сталіністы, беларускія нацыяналісты, нямецкія нацыянал-сацыялісты, польскія санацыйнікі і хто там яшчэ не лянівы, гатовы былі самі аддаць жыццё – за Айчыну, за ідэю, за мову, за правадыра, за фюрэра і за шчасце на ўсім свеце...

Чакаць канца свету было нядоўга, бо:

*Ён навучаў у сінагогах іх,*
*і Яго ўсе ўслаўлялі.*
*Лука IV, 15*

Тым часам у Мінску беларускія сацыялісты зусім распераліся: у канцы 1927 года на вышэйшым партыйным зборышчы народны камісар земляробства, гарачы прыхільнік Сталыпіна і рассельнік вёскі з „шахаўніцы" і шнуроў абапал дарогі на былы панскі двор, а цяперашні прапіты савецкі казённы маёнтак, гэты ж рассельнік на на культурныя хутары па... 15-30 га, – вось гэты сам Прышчэпаў заявіў, што хопіць маскоўскім таварышам лезці ў беларускія зямельныя справы. Што ніякага саюзнага зямельнага права не мае быць.

– Уся зямля, яе натуральныя багацці, маёмасць Беларусі належыць ёй, Беларусі, а не Савецкаму Саюзу! Толькі новае

размеркаванне адказнасці паміж рэспублікамі і цэнтрам прывядзе нас да перамогі камунізму па ўсім свеце! – гэтак камісар ляпнуў на тамтым форуме. Канец яго прыйшоў у самую першую чыстку. І нічога дзіўнага – бо пра развал „такой страны” гаварылася задоўга да „вялікага Горбі”, гаварылі нават у правінцыі, якая толькі другі год нажынала збожжа і накопвала бульбы больш, чым у 1914! З „прышчэпаўшчынай” на Беларусі расправіліся раней, чым з „нацдэмаўшчынай” – Прышчэпаў як камісар земляробства залез са сваім збожжам у самую тхлань палітыкі, пайшоў, нечакана для сябе самога супраць ідэі, супраць новай веры, супраць Месіі...

*І загарнуўшы Кнігу і аддаўшы слузе, сеў:*
*і вочы ўсіх у сінагозе былі скіраваныя на Яго.*
*Лука IV, 20*

*І ўсе засведчылі Яму гэта,*
*і дзівавалі са словаў мілаты,*
*якія зыходзілі з вуснаў Ягоных*
*і казалі: ці не Язэпаў гэта сын?*

„Новае жыццё” ў цэлым СССР і ў адной асобна ўзятай Беларусі пачалося менавіта дзесьці восенню 1927 года – раней пачатку калектывізацыі і голаду, і вынішчэння нацыянал-камуністаў і нацыянальнай эліты. ЦК ВКП(б) пастанавіў правесці „хлебозаготовки по твердым ценам” – ну, у сувязі з нейкімі клопатамі па забеспячэнню люду, недасканаласцю гандлю, неўраджаем і г.д. Каб справа не правалілася, на дапамогу „местным советским органам” – дзяржаўнай адміністрацыі – накіроўваліся „партийные работники”, пакуль што таксама з мясцовых, але з адміністрацыі партыйнай альбо наддзяржаўнай (можа, лепш „антыдзяржаўнай”?!)... Стварaўся канфлікт наверсе. Ясная справа, што гаспадар прадаваў хлеб на рынку і па рынкавых цэнах, а на тыя пастановы ды „продразверстки” пляваць хацеў – ну, бо пакуль не было ў вёсцы „чужых” і ніхто не лез табе з наганам да морды, як дзесяць гадоў назад, ды і свая вінтовачка была акуратна прыхаваная... І тут выходзіць другая пастанова ЦК ВКП(б): у сувязі з пагрозай голаду ды спекулянцкімі настроямі часткі вёскі мус правесці „дополнительную заготовку” (усё яшчэ па-добраму!). Але – на дапамогу паслалі рабочых з места (былі

гэта не выканаўцы, але кантралёры: на ўсю Беларусь з 5 млн. чалавек прыслалі... сто пяцьдзесят „рабочих” з Н. Ноўгарада, папраўдзе афіцэраў ОГПУ-НКВД), але чацвярціну ўсяго канфіскаванага хлеба... каб пакінуць на месцы і раздаць мясцовай беднаце, для чаго неабходна стварыць групы „актывістаў”, якія маюць „кантраляваць справядлівасць” нарыхтоўкі і раздачы... Ствараўся канфлікт на доле, у нізах. Вось пра што забылі Троцкі і Ленін, калі рушылі ў 1918 дрэнна вышкаленыя атрады рабочых адбіраць хлеб сілком! Палыхнула так, што праз тры гады востра павярнулі назад і мала не раскалолі сваю дыктатуру пралетарыята: хто за „часовае адступленне”, а хто супраць... А Сталін не забываў пра папярэдні раскол канкурэнтаў і ворагаў, ніколі. І першыя кулі засвісталі з першым снегам у канцы таго ж 1927 года – і на Беларусі! Перад суцэльнай калектывізацыяй частка вёскі сама пайшла вайною на другую...

І, калі да вясны 1928 года вёска раскалолася хата на хату, тады і прагучала знаёмае ўсяму свету колхоз.

Колхоз быў непазбежны. Гады 1921-28 гадоў былі спробай бальшавікоў паяднаць непаяднанае – няхай будзе гандаль з рынкам, няхай будзе прыватная ўласнасць, але няхай будзе адна партыя, а ўсе разам давайце будаваць агульнае шчасце... Гэткая „Унія бязбожнікаў”: кажа, давайце паяднаемся – вы прымаеце маю веру, я пакідаю вашы абрады, але камандаваць буду я і рабіць з „адступнікаў” ісцінных вернікаў... Так і рэлігійная Унія скончылася гвалтам ды развалам, так і матэрыялістычная Унія скончылася гвалтам і развалам!

Звернем увагу толькі на тое, што ў жніўні 1937 года СНК і ВКП(б) прынялі пастанову „Об оказании помощи колхозам в БССР” – спісваліся запазычанасць, даваліся новыя крэдыты і г.д. Як за нармальным савецкім панам да нашых дзён... Але там ёсць адна, зусім несавецкая, лічба, а менавіта план сяўбы скарачаецца на трыста тысяч гектараў... Бальшавік не можа скарачаць які-кольвек план! Калі нават Масква – і то ў знакамітым 1937 годзе! – пастанаўляе скараціць план сяўбы пры хлебных пайках, нормах, картках і г.д., значыць, здарылася нешта надзвычайнае... Значыць, тыя 300 тыс. га не на тое, што няма чым і на чым (парэзалі коней, пакралі збожжа), але няма каму сеяць! Пустыя вёскі, без людзей пасля вывазаў у Сібір. Палічым паводле тых 300 тыс. вельмі прыблізна: на адну сям'ю выпадала 10-15 га – атрымаем 20-30 тыс. сем'яў – а было ў сярэдняй сям'і па

5-7 чалавек – атрымаем разам сто пяцьдзесят тысячаў сама меншальбо сама больш (а, можа, яшчэ больш, хто ведае...). Відаць, было каля дзвесце дзесяць тысячаў загінуўшых... На „белых мядзведзях”?

Блюзнерства не блюзнерства, але мне чамусьці хацелася б – ім усё роўна! – каб яны ляжалі ў тых Курапатах з куляй з нагана ў патыліцы, каб яны прапалі ў тым сібірскім лагерным пыле, бо ніхто ніколі не скажа, колькі ж іх загінула якраз у сваёй хаце, бо нават ніхто не страляў у вакно, а проста прыйшла банда са сваёй вёскі і адабралі ўсё да скарынкі, „каб ты з голаду здохла!” – як дагэтуль адзін аднаму жадаюць суседзі з суседкамі пры дробных штодзённых непаразуменнях, пасля якіх жыццё круціцца далей...

Але на тым быў яшчэ не канец, і вёска ўжо з колхозом жыла сабе гэтаксама, як і жыла, бо:

*І сказаў: праўду кажу вам:*
*ніякі прарок не прыймаецца*
*ў сваёй Бацькаўшчыне.*
Лука IV, 24

Вясной 1924 года да БССР быў далучаны амаль увесь беларускі Усход, а з восені таго ж года на беларускую мову пераводзілася практычна ўся сістэма пачатковай асветы, а ў значнай ступені – хоць і не так па-бальшавіцку шпарка – сярэдняя і вышэйшая школа. З 1921 года на Беларусі былі адчынены Універсітэт, Палітэхніка, сельскагаспадарчы і медыцынскі інстытуты (усе ў Мінску), сельскагаспадарчы інстытут у Горках і ветэрынарны інстытут у Віцебску. Была таксама такая вельмі спецыфічная ўстанова, як Камуністычны Універсітэт – меў тры факультэты: партыйных работнікаў, дзяржаўных работнікаў і... журналістаў! Існаваў таксама Інстуытут Беларускай Культуры (пазней Акадэмія Навук) – усе рэктары, дэканы і загадчыкі прызначаліся за згодай ЦК КП(б) Беларусі.

Беларусізацыя мела выразны прасавецкі дух, чын і накірунак – пры гэтым у вёсках яна была поўнай. За 1921-24 гады высветлілася, што калі па-руску пры цары гаварыў жандар, то яго слухалі, а калі цяпер свой Кузька ці прысланы з мястэчка Яшка, то з іх смяюцца. Але ў акруговых цэнтрах і сталіцы беларусізацыя была толькі частковай (беларуская мова як адна з дысцып-

лін) і залежала ад канкрэтнай школы, тэхнікума ці вышэйшай установы. Афіцыйна гэта абгрунтоўвалася недахопам выкладчыкаў, як і наяўнасцю ў БССР аж но чатырох дзяржаўных моваў – беларускай, ідыш, рускай ды польскай. Неафіцыйна ўсе разумелі, што „беларусізацыя" прызначана для вёскі, бо мае яна з вёскі не выйсці і не трапіць на будні дзень у адміністрацыю, суд і на фабрыку – альбо да места ўвогуле. Гэта была, калі так можна сказаць, вясковая беларусізацыя...

Таму ў час разгрому „нацдэмаўшчыны" ў 1929-30 гадах, калі былі арыштаваны сто пятнаццаць (!) прафесараў і выкладчыкаў Акадэміі Навук і Універсітэта, а прэзідэнт АН гісторык У. Ігнатоўскі пусціў сабе кулю ў лоб, адначасова былі зачынены ўсе факультэты, кафедры, аддзелы і курсы па гісторыі, і адноўлены былі толькі ў 1934 годзе. Але як!

Гісторыя Беларусі не вывучалася зусім – ні ў „нацыяналістычнай", ні ў „савецка-расійскай" версіі. Больш таго – ні польскай, ні рускай Беларусь не была таксама: яна да 1917 года проста не існавала... Не існавала і ўсё!

І гісторыю Расіі... таксама не вывучалі. А вывучалі гісторыю рэвалюцыі і пабудовы сацыялізма...

Такім чынам вясковыя дзеці вучыліся на такой мове, на якой іх бацькі гутарылі дома – цяпер гэта цяжка ўявіць, але тады нават Гомельшчына была беларускамоўнай – але калі „выпускнік вясковай сямігодкі" трапляў у тэхнікум ці універсітэт, то там па-беларуску вучылі адных будучых выкладчыкаў літаратуры і журналістаў. Усім астатнім спецыяльнасцям таксама выкладалі літаратурную мову, але спецыяльныя дысцыпліны з 1934 года выкладаліся выключна на рускай мове! Бальшавікі не ўжывалі на Беларусі гвалтоўнай і пагалоўнай русіфікацыі – як тыя санацыйнікі гвалтоўнай паланізацыі! – і бальшавікі не ставілі задачу, каб за дваццаць гадоў не засталося „ніводнага беларуса", як той міністр Скульскі з Варшавы. Бальшавікі цудоўна засвоілі, хто кіруе светам – было непатрэбна абрусачыць дурную вёску за адно пакаленне, было зручней і выгодней адсячы ад вёскі ўсё лепшае... У справаздачах мінскага НКВД 1934 года было спецыяльна падкрэслена, што пратэст мінскіх студэнтаў-гуманітарыяў супраць выціскання беларускай мовы з навучання не знайшоў ні падтрымкі, ні спачування сярод іх калегаў-медыкаў ці будучых інжынераў – у якіх было шчырае неразуменне: і мы ж вывучаем і гаворым, і пішам па-беларуску, але ім, гумані-

тарыям, трэба па спецыяльнасці ўсё па-беларуску, а нам не! НКВД ацэньвала гэта як несумненны поспех „советской национальной политики” Беларусі. І хіба афіцэр, які пісаў гэты рапарт, меў абсалютную рацыю. „Санацыйнікі” ў Польшчы кінуліся на вёску беларускую без належнай падрыхтоўкі тых Крэсаў і ўзяліся за дзяцей, якім і так нідзе не было ходу, але, каб былі з іх „малі поляцы”. Бальшавікі тым часам пакінулі вёску ў спакоі з яе „неправильным языком” – і так яна карпела ў калгасе! – але самым здольным далі перспектыву выйсці ў людзі, атрымаць адукацыю (у тыя часы гэта значыла перайсці ў начальства, стаць панам!), пры гэтым трэба для апошняга параўнання заўважыць, што ў Польшчы праваслаўны не тое што з гімназіяй, а нават з універсітэцкім дыпломам не мог знайсці сабе месца працы – і не так з прычыны беспрацоўя, як з прычыны непольскасці. Пра што існавалі розныя цыркуляры, характарыстыкі, анкеты і г.д. З 1938 года нават на куплю кавалка зямлі ці варштаціка без матора праваслаўнаму былі абавязаны даваць характарыстыку ксёндз і паліцэйскі начальнік, у карпаратыўным войску ж было яшчэ прасцей – капралам быць, калі ласка, але афіцэрам і не думай...

У выніку „татальнай” паланізацыі на Захадзе і „памяркоўнай” русіфікацыі на Усходзе – да верасня 1939 года на Крэсах беларусы былі, а на Усходзе былі толькі тыя, хто не здолеў выбіцца ў людзі... Але ж вельмі хацеў! І такую магчымасць, без жартаў, магла яму даць адна савецкая ўлада... А тая бацькава зямля? А гары яна гарам!

Савецкая школа мела на вёсцы аўтарытэт. Мой настаўнік Давыд Бірулёў, сам родам з Магілёўшчыны, не раз паўтараў, што ніколі не было ў яго лепшых вучняў, як у 1939-41 гадах... Добрая падрыхтоўка ў вясковай сямігодцы па-беларуску давала верагодную магчымасць скончыць які-небудзь тэхнікум па-руску, што ў сваю чаргу давала магчымасць развітацца з той вёскай на вякі вякоў аман!

Канвеер працаваў сам па сабе. І то былі бальшавікі, бо:

*Зрабіўшы гэта, яны злавілі*
*вялікае мноства рыбы,*
*і аж мярэжа ў іх рвалася.*
*Лука V, 16*

Здавалася б, дваццаціпяцігоддзе 1914-39 паклала канец і старым спрадвечным Крэсам і скораспелай Беларусі – новы пан на Мінску Панцеляймон Панамарэнка спехам будаваў новы Дом Ураду ў Магілёве. Тое ажыццяўлялася б прынамсі да канца новага пяцігадовага плану ў 1942 годзе, калі думалі правесці чарговае „ўзбуйненне” БССР коштам Смаленшчыны, пры гэтым сталіцай меў быць найбольш дынамічны тады індустрыяльны цэнтр Магілёў, а Беларуская ССР зрабілася б „Западнорусской ССР”...

Цікава, што ў пасляваенныя гады планавая гаспадарка ў Савецкім Саюзе планавалася не па саюзных рэспубліках, але па эканамічных раёнах, межы якіх толькі часткова адпавядалі межам тых рэспублік, а напярэдадні распаду СССР „Литературная газета” ў Маскве змясціла вялікі артыкул, дзе аўтары прапаноўвалі падзяліць СССР не на пятнаццаць, але на... сорак рэспублік – чытай: эканамічных раёнаў (так ці іначай падпарадкаваных Маскве). Гэта быў усё той самы план канца 30-х гадоў... Нейкі час патакваючы нацыяналам, з тактычных меркаванняў, Сталін паступова ішоў да пераўтварэння СССР у Расійскую Імперыю, толькі што без „инородцев” увогуле! І, як заўсёды, пачалі б з больш зручнай Крамлю Беларусі.

І ў Польшчы 1938 год быў мала не трыумфальны – нарэшце пачаўся гаспадарчы рост, нацыянальны рух на Заходняй Украіне і Заходняй Беларусі быў практычна здушаны, загнаны ў падполле, і ў канцэнтрацыйны лагер у Бярозе-Картузскай. Разам з Гітлерам палякі паўдзельнічалі ў падзеле Чэхаславаччыны, адхапілі сабе „одвечне нашэ Заользе”, пастрашылі летувісаў „маршам на Коўна” і дамагліся нарэшце ўстанаўлення дыпламатычных адносінаў з Каўнасам, і выкідыша з канстытуцыі Летувы артыкула пра тое, што Вільня ёсць сталіцай Летувы, часова акупаванай палякамі. А тут яшчэ і Сталін абвясціў усю Камуністычную Партыю Польшчы цалкам „ворагам”, а НКВД праз савецкага пасла ў Варшаве перадаў польскім калегам „па фаху” з ІІ аддзела адпаведныя спіскі ўсіх тых „ворагаў”, персанальна і з адрасамі. Гэта быў год найвышэйшага ўзлёту ІІ Рэчы Паспалітай, і толькі унікальны на розум чалавек мог прадбачыць больш-менш далейшыя падзеі. Але, калі цяпер гісторыкі не перастаюць здзіўляцца наіўнасце і слепаце заходніх дэмакратый, самаўпэўненасці Бэка ды Рыдз-Сміглага, якія не бачылі відавочнага падабенства бальшавізма і нацыянал-сацыялізма, то са смуткам

мушу я заўважыць, што праз наступныя гадоў пяцьдзесят гэтак-сама будуць здзіўляцца ўжо нашай слепаце і наіўноце, бо спачатку мы не прадбачылі змовы супердзяржаваў коштам малых народаў, потым трухлявасці і неверагоднага па кароткім часе абвалу камунізма, распаду СССР, страшных і працяглых наступстваў гэтага распаду; потым – узнікнення адзіна адной глабальнай супердзяржавы, і потым – чарговага падзелу свету ўсё па той жа праклятай „лініі Керзана", і наступстваў гэтага падзелу...

Не будзем смяяцца з пакалення 1939 года. Яшчэ Мікалай Гогаль слушна заўважыў: „З каго вы смяецеся? – З сябе ж смяецеся..." Бо чалавек можа змяніць цэлы свет, але не можа змяніць самога сябе. І тым рэдкім яснавідцам не было месца нідзе, не было месца і дзеля эміграцыі таму, хто разумеў чарговую катастрофу. Пасля канца арыстакратыі-магнатэрыі дзвесце гадоў назад, пасля канца шляхты сто гадоў назад прыйшла пара канца простага чалавека. Паяднаны ў партыі і дзяржавы, вызвалены ад Бога і капітала, свята веруючы ў сваіх зямных правадыроў – такіх жа простых, як ён сам! – просты чалавек аказаўся здольным усё на тыя ж „Дойчлянд юбэр аллес" і „Пролетарии приобретут весь мир", на тыя ж рабункі мужыкоў! Не было месца чалавечаму розуму...

*А Ён адыходзіў у пустэльныя мясціны*
*і маліўся.*
Лука V, 16

Строга кажучы, верасень 1939 года пачаўся... з XVIII з'езда ВКП(б) на пачатку сакавіка таго ж года. Там Сталін абрынуўся на заходнія дэмакратыі, абвінавацію іх у распальванні вайны і патакванні гітлераўскай агрэсіі... Здавалася б, што тое – звычайная бальшавіцкая прапаганда для ўнутранага спажывання. І так гэта ўспрынялі ў Еўропе, дакладней, не ўспрынялі або ўспрынялі ніяк. Гавораць сабе бальшавікі і хай гавораць... А ў Бэрліне, дзе спосаб мыслення быў такі самы, як у Маскве, зразумелі ўсё з аднаго слова! Праз два тыдні нямецкі флот заняў Клайпеду (Мемель), летувісы капітулявалі, іх брытанскія патроны прамаўчалі – маўляў, што нам да нейкай неістотнай Летувы. Тым болей, Гітлер гарантаваў свабодны экспарт у Вялікабрытанію летувіскага масла і мяса (у брытанцаў хапала сваіх харчоў, але такім чынам Лондан забяспечваў паказны дабрабыт саюзных яму, а эканамічна слабюсенькіх

Летувы і Латвіі)... Між тым, Клайпеда была рэпетыцыяй будучага пакта Молатава-Рыбентропа. Адразу ў красавіку эканамічны дараднік германскага МЗС Шнурэ асцярожна пацікавіўся ў эканамічнага ж дарадніка савецкага пасольства ў Бэрліне Астахава, ці не маглі б яны сустрэцца прыватна і абгаварыць асобныя праблемы германа-савецкага гандлю...

Вясну і лета Еўропа пражыла ў напружанні – „раптам” Гітлер запатрабаваў ад Бэка нямецкі калідор пад Гданьскам у абмен за... вечны саюз, а Бэк выцягнуў дулю пад нос яму: „Не дамы ні гузіка!” Польшча ад таго „гузіка” дастала „бзіка” – і ў кнайпах ужо заязджалі ўланскімі коньмі ў Бэрлін яшчэ да маразоў; тым часам Генеральны Штаб часаў у галаве і паціху збіраў рэзервістаў ды начамі перацягваў войскі з усходу на захад – саюзныя брытанцы ў Лондане гаварылі Варшаве адно пра маральную падтрымку...

Ад мая ў Маскве ішлі англа-франка-савецкія перамовы, пры гэтым на чале савецкай дэлегацыі быў сам народны камісар абароны маршал Варашылаў. Савецкі Саюз браўся выставіць супраць Германіі... дзвесце дваццаць танкавых, кавалерыйскіх і пяхотных дывізій! „Працечка” пра тое была досыць шырокай сярод усіх еўрапейскіх разведак і МЗС – і тут сярод польскай эліты... неяк міжволі стаў знікаць расавы антыкамунізм, гадаваны яшчэ 1920 годам, і імгненна, як эпідэмія, распаўсюдзіўся стары пранафталінены і молю паедзены міф часоў цара-бацюшкі пра „славянскае адзінства”. Не толькі дзеяннямі савецкіх дэзінфарматараў можна тлумачыць тое, чаму гэта ў верасні 1939 года знайшлося нямала дурняў – у тым жа цяперашні „герой”, а тагачасны генерал Вільчынскі, забіты саветамі пад Гроднам – якія замест таго, каб, ці біцца з Чырвонай Арміяй, ці распусціць людзей па хатах, загадалі стаць у шыхт ды вітаць савецкія танкі, рапартаваць пра сваю гатовасць разам „с русскими братьями” біць немца... Не тысячы, а сотні тысяч людзей трапілі ў савецкі ГУЛАГ, а дзесяткі тысяч афіцэраў у Катынь! А хто іх туды здаў?! Усе чакалі вайны з Германіяй, але ніхто не верыў, што яна будзе – ну, бо хопіць з Гітлера адной памюнхенскай Чэхаславаччыны, будзе ж нейкая мера, уся Еўропа супраць яго...

А ў ціхім берлінскім асабнячку сціплыя чыноўнікі ад гаспадаркі Астахаў і Шнурэ гутарылі сабе спакойна пра мазут, бензін, маторы, станкі і г.д. І кожны паціху рапартаваў шыфроўкамі свайму начальству, што агульных гаспадарчых інтарэсаў усё

больш і больш! А тыя і тыя цудоўна кемілі, што ў іх дзяржавах і партыях не бывае нічога асобнага – і калі супадаюць хоць якія інтарэсы, то супадаюць і ўсе астатнія! Молатаў і Рыбэнтроп так імгненна пасля дамовіліся пра палітычныя інтарэсы таму, што Астахаў і Шнурэ пару месяцаў раней акуратна запарадкавалі інтарэсы гаспадарчыя! Трэба думаць, не спалі ў шапку і галоўныя штабісты СССР і Германіі, будучы нацыянальны герой Жукаў і будучы нацысцкі злачынец Кейтэль – „зялёная граніца” паміж Вермахтам і Чырвонай Арміяй таксама лягла на стол Молатаву і Рыбентропу ўжо гатоваю, але архівы Генеральнага Штаба і яго выведкі гэта вам не таямніцы канцылярыі амерыканскага прэзідэнта, кітайскага ці савецкага ЦК і, нават, неабмылковага Форыйн Офіс – тэрмін сакрэтнасці на іх вечны. Так што не ад сціплага літаратара дабівайцеся папераў; наколькі вядома, такія паперы проста паляць. Адпаведна інструкцыі...

Народы не хацелі вайны – і рыхтаваліся да яе.

Рыхтаваліся даўно. Ад Версаля, Трыянона і Рыгі. Было ж там не так падзелена. Не дадзена адным і занадта дадзена іншым. Ніхто з простых людзей не хацеў вайны, але спяваў ваенныя песнячкі, дэкламаваў баявыя вершыкі, вучыўся страляць і машараваць, любіў вайсковую форму – то ж мужчыны, а не акулярнікі! – любіў дужасць, бо думаў, што ў ёй гэта дабро і прыгажосць... Бачыў тую залежнасць просты чалавек у свайго правадыра і пана. Тое, што можа быць – і хіба добра, каб так было – наадварот: каб дабро і прыгажосць былі не так сабе сілай, таго просты чалавек не разумеў і не хацеў разумець, бо дабро і прыгажосць трэба ствараць і пераўтвараць у сілу, а таго ён не мог, а мог толькі чакаць, каб тое яму нехта даў... І слухаў сваіх правадыроў з вусамі і ў паўвайсковых фрэнчах – заўважым: Сталін і Гітлер не паказваліся перад публікай па-цывільнаму, але і рэдка апраналі мундуры: меў быць для простага чалавека нейкі гібрыд – і такі, як я, і вялікі пан адначасова! – і вось слухаў просты чалавек сваіх правадыроў, і што ж тыя ўрэшце мелі рабіць з тым бядулем, бо:

*што лягчэй сказаць:*
*даруюцца табе грахі твае,*
*альбо сказаць:*
*устань і хадзі?*
Лука V, 23

І што ж было таму простаму чалавеку рабіць?! Эх, каб ён ведаў...

Казалі б яму рабіць што іншае — і ён бы рабіў. І яму ж казалі! Але ён не разумеў. Бо не хацеў разумець... А тут і яму казалі з трыбун – як з Нябёс!!! – і, галоўнае, ён сам гэтак хацеў і мроіў, думаў і сніў, але толькі не мог сказаць. А тут нехта такі самы, як ён, вылез і сказаў так, як быццам падслухаў яго,

*І ён, пакінуўшы ўсё,*
*устаў і пайшоў за Ім.*
Лука V, 28

Надыходзілі апошнія дні... Свет застыў у напрузе і чаканні. Быццам і верыў, і не. Будзе, ці не будзе? Божа, як шмат тады гаварылі! А як пісалі! А кахалі як! Не аднаму Яраславу Івашкевічу ў „Хвале і славе" апошняе лета перад вайной здалося самым прыгожым>х>. Хіба і прыслоўе мужыцкае, што перад вайной грыбы родзяць не з таго, што яны родзяць, а з таго, што апошняя радасць прачынаецца ў людзях, як быцам бачаць і бяруць яны тыя грыбы апошні раз...

Надыходзілі апошнія дні. 15 жніўня 1939года маршал Варашылаў заявіў, што англічане і французы з немцамі ваяваць не хочуць і разарваў перамовы. 17 жніўня 1939 года ў Берліне тыя ж нашы знаёмцы, менавіта Астахаў і Шнурэ падпісалі савецка-германскі гандлёвы пратакол на дзесяць гадоў. Праз дзень германскі пасол у Маскве граф Шуленберг папрасіў старшыню савецкага ўраду і народнага камісара замежных спраў СССР Молатава прыняць яго і перадаў пасланне Гітлера з прапановай заключыць Пакт аб ненападзе на дзесяць гадоў. Праз пяць дзён самалёт Рыбентропа сеў на маскоўскі аэрадром, суткі без перапынку на Крамлі ішлі перамовы – а ранкам 23 жніўня 1939 года савецкія газеты выйшлі з поўным тэкстам таго Пакту аб ненападзе. Сакрэтны пратакол да яго будзе апублікаваны на захадзе праз восем гадоў, у СССР ажно „вялікі Горбі" ў 1989 (!) годзе будзе не сароміцца казаць з трыбуны, што таго пратакола не было, а ў той жа далёкі дзень 23 жніўня 1939 года стары Лойд-Джордж скажа свайму гэтак жа старому сакратару: вайна выбухне да канца лета, рускія і немцы падзеляць Польшчу... па „лініі Керзана", а нашы дурні-бараны не цемяць таго і толькі Чэрчыль яшчэ ў 1920 годзе разумеў разам са мною, што старой добрай

Еўропы больш няма, за што нас абодвух і выперлі ў адстаўку. Наракаў Лойд-Дордж у хатнім зацішку.

Бэк у Варшаве інтэнсіўна звязваўся з Лонданам. А Лондан маўчаў. Генштаб польскай арміі лічыўся з магчымым нападам Германіі ды... перакідваў рэзервы з усходу на захад, але загаду войскам не аддаваў; найбольш абачлівыя камандзіры польскіх палкоў падрыхтоўвалі падначаленых да поўнай баявой гатоўнасці, і паціху паведамлялі жонкам, каб забіралі дзяцей ды ехалі на вёску. У СССР з Масквы на правінцыю пайшла сакрэтная дырэктыва паклікаць на вайсковую службу яшчэ мільён рэзервістаў „в первых числах сентября по особому указанию”. Адстаўныя генералы і палітыкі ўсіх армій і ўрадаў прыгадвалі лета 1914 года, пілі знакамітае бардо і каньяк у садках прадмесцяў і ўздыхалі, што:

*ніхто не налівае маладога віна*
*ў мяхі старыя,*
*а інакш маладое віно парве мяхі*
*і само выцеча, і мяхі прападуць,*
Лука V, 37
*а маладое віно*
*трэба ўліваць у мяхі новыя,*
*тады зберажэцца і тое, і тое*
Лука V, 38

*і ніхто, піўшы старое віно,*
*не захоча віна маладога адразу,*
*бо кажа: старое лепшае.*
Лука V, 39.

Перапынак у святых дзеях Еўропы скончыўся 1 верасня 1939 года – калі на Варшаву пасыпаліся бомбы. Прыблізна праз тыдзень стала ясна, што ўжо позна рабіць што-небудзь чалавеку, а спадзявацца можна толькі на Бога... А 17 верасня 1939 года ўсходнюю мяжу II Рэчы Паспалітай пераступіла Чырвоная Армія, у якой служылі пагалоўна камуністы і атэісты, што ў Бога не верылі, а таму спадзявацца ім не было на каго зусім...

У рамане беларускага пісьменніка Вячаслава Адамчыка „Год Нулявы” ёсць сцэна, калі натоўп вясковых акружае „панскі двор”, гэта значыць, суседні фальварак, і яшчэ нічога не робіць

– ну, у такіх выпадках адзін заўжды штурхае суседа: „ідзі ты першы, а я за табою!” – а ў тым фальварку гаспадар, у якога адна абойма ў пісталеце, дык мужыцкай касою (!), бо з пісталета можна схібіць і куляў у ім на ўсіх не хопіць, сам зарэзвае панадную жонку і дзвюх дачок, каб не гомталі іх лапцюжныя „жарабцы”, і потым выходзіць на ганак, страляе сам сабе ў рот...

Гэты раман доўга не хацелі друкаваць у часы савецкай цэнзуры, менавіта, з увагі на гэту страшную сцэну – у рэшце рэшт раззлаваны Адамчык сказаў, што былі ў верасні 1939 года на тых Крэсах сцэны яшчэ страшнейшыя, і што, калі б натоўп тае вяскаўні ўвайшоў-такі ў той дом у фальварку, ды, каб гаспадар узяўся мужна страляць у банду, бараніцца, і каго-небудзь зачапіць... Што б тады зрабілі б лапатнікі з маці і дзвюма яе дочкамі! І гэта Адамчыкава праўда так аглушыла маладых функцыянераў, не ведаючых вайны, што раман пайшоў у друк... Не разумею, як літаратура можа быць страшнейшай за жыццё – што б ты не выдумаў гідкае, страшнае, паскуднае і дзікае, заўсёды знойдзецца такая сволач, якая выдумае яшчэ жудаснейшае: і не проста выдумае, але і зробіць, учыніць! Пасля рамана „Год Нулявы” я не разумею, як і чаму абвінавачваюць літаратуру ў тым, што яна патурае цёмным звярыным праявам у чалавеку. Ці чыталі што падобнае тыя, хто расстрэльваў за адну змену ў працы (службовай!!!) па пяцьсот чалавек (былі ж такія „віртуозы” ў НКВД і ў СС! – ці трохі чыталі яны гэтак званую „садысцкую літаратуру”?) Дагэтуль усе судовыя працэсы над эсэсманамі – з „чэкистов” у нас так і не судзілі ніводнага! – сведчаць пра адно і тое ж: альбо такі сукін сын не чытаў нічога з прычыны свайго амаль анальфабэтызму, альбо з прычын свае вышэйшай адукацыі чытаў філосафаў-гуманістаў ці сентыментальныя раманы якога-небудзь Дыкенса... Так сказаць, здымаў з сябе псіхалагічны стрэс пасля нечалавеча цяжкай (расстрэльнай) працы, беручы вечарам у рукі вершы пра каханне.

Але вернемся да самазабойства на фальварку, дзесьці на заходняй Беларусі, восеньскай ноччу 1939 года. Пагромы пачаліся праз суткі, як толькі стала вядома, што бальшавікі перайшлі мяжу, і былі яны, пагромы, за рэдкім выключэннем паўсюдна, апроч... паласы шырынёю 50 км на захад ад савецка-польскай мяжы. Чырвоная Армія практычна не сустракала на дарогах арганізаванага адпору польскіх атрадаў, а тэмп наступлення дасягаў 50-70 км за суткі. Гэта значыць, што ўсе „народныя мсціўцы”,

па-першае, арганізоўваліся самі, як толькі бачылі, што паліцыя пераапранаецца ў цывільнае і ціха знікае хто-куды, па-другое, спяшаліся гвалціць, паліць, разрабоўваць, што трапіць пад руку, але перад прыходам рэгулярнага войска і ўстанаўленнем новага парадку. Крывавы быў верасень 1939 года на Крэсах, як быццам тубыльцы помсціліся на каланізатарах... І як пры любой „народнай помсце”, трапілі пад тую касу не вайскоўцы, паліцыянты, КОПаўцы і нават, часта, не „асаднікі”, але найбольш безабаронныя чужыя. У большых мястэчках, дзе палякі складалі дзесяткі і больш чалавек, і былі здольныя да самаабароны, тых пагромаў не было – гэта ацалелыя местачкоўцы трапілі страшнай зімою 1940 года (мароз пад сорак!) на сібірскія вывазкі... Тыя ж, што „ўпраўлялі санацыю”, калі перажылі першыя пагромныя тыдні, адсядзеўшыся на глухіх хутарах ці, наадварот, канспіруючыся ў Брэсце, Слоніме, Лідзе ці Гродне, сталі „помсціць за помсту” – і зноў, ясная справа, на тых, хто трапіў пад руку... Гэтак і выглядала на Крэсах „грамадзянская вайна” добрых дзесяць гадоў – хто б з кім ні ваяваў, і якія б акупанты ні былі...

Спіскі цяпер збіраюць... Тыя і тыя – дакладней, нашчадкі тых і тых... Чаго збіраеце?! Каб памянуць у абедню – ці, каб помсціць?!

*Што ты глядзіш на цярушынку*
*ў воку брата свайго,*
*а калоды ў сваім воку*
*не адчуваеш?*
Лука VI, 41

Кароткі адрэзак часу з верасня 1939 года да чэрвеня 1941 года быў для Крэсаў роўны ў іншых народаў дзесяцігоддзям або і вякам. Усе папярэднія падзеі, звычкі, парадкі, адносіны – і дрэнныя, і добрыя – разляцеліся ў дым. Гэта не быў яшчэ канец Крэсаў, як думалі адны, але гэта і не быў толькі яшчэ адзін кароткі наезд, як думалі другія. Гэта прырода адвечнай хісткай раўнавагі аказалася надламанай непапраўна. Тое, што ўчарашні ганарысты пан цяпер палахліва хаваўся ад смерці, а ўчарашні аброслы хам пачуваў сябе панам, хоць саветы да панства і яго не дапусцілі, не было новым. Новым было тое, што да хамаў прыраўнялі ўсіх – і цяпер канкурэнцыя ішла не за сваё лепшае

жыццё, але за тое, каб той ненавісны сусед меў жыццё яшчэ горшае, чым тваё горкае...

Ніхто не рабіў з учарашніх хамаў новую шляхту!

З былое КПЗБ да ВКП(б) прынялі – па асабістым хадайніцтве П. Панамарэнкі і з дазволу самога І. Сталіна! – толькі ўсяго адзінаццаць чалавек... Астатнія ж, як прыналежныя да „варожай” ад 1938 года КПП (з 1934 года КПЗБ арганізацыйна ўваходзіла ў кампартыю Польшчы!), трапілі ў „ворагі” і... у засраны лагер. Ужо вашыва-савецкі. У тым жа і шмат-хто з тых, хто выйшаў з Картуз-Бярозы... Асабліва падазронымі здаваліся „другім саветам” („першыя” з 1919-20 гадоў) тыя КПЗБоўцы, хто перад надыходам Чырвонай Арміі і пасля ўцёкаў польскай адміністрацыі і паліцыі, займаў кінутыя будынкі, вешаў чырвоныя сцягі і патруляваў па мястэчку з кінутымі дэзерцірамі карабінамі... Спрытнейшыя, напрыклад, як „ревком” у Скідзелі, да той КПЗБ лічылі лепш не прызнавацца: маўляў, былі тут нейкія, але тых капэзэбоўцаў забралі яшчэ палякі, а мы тут самі па сабе, бо „крэпка любім-кахаем савецкую ўласць”... Навошта ж ім быў чырвонасцяжны, але свой „ревком”?! На тое, вось, што там, дзе „ревкома” не было, НКВД перш-наперш ставіла свой пастарунак і рабіла т.зв. шмон, а потым з’яўляўся туды гатовы райком, прывезены аднекуль з Магілёўшчыны і... запісваў у „кулакі”, значыць, заможных гаспадароў, тых, хто меў хоць каня і кароўку! Затым гэтыя спіскі былі асновай дзеля вывазак... І вывазкі 1940-41 гадоў выглядалі як вывазкі амаль выключна палякаў – у тым жа з такой жа вясковай галоты! – па той простай прычыне, што тыя „ревкомы” рабіліся пераважна ў праваслаўных мястэчках і большых вёсках – а галоўным у савецкай машыне ёсць бюракратыя з яе „бумажками”...

Навадалучаныя да СССР Заходняя Беларусь і Заходняя Украіна разглядаліся перш за ўсё як харчовая і людская база. Вывазкі зімой 1939-40 г.г. суправаджаліся канфіскацыяй усяе маёмасці, а з таго, што траплялa ў казну – бо так, як савецкія вайскоўцы і цывільныя ўмелі браць перш за ўсё сабе, нават польскія злодзеі не ўмелі! – на месцы пакідалі частку жывёліны ды інвентар, рабілі совхозы ў былых маёнтках, астатняе ж эшалонамі кіравалі на ненаедны Усход. Вясною 1940 года ў маскоўскіх крамах паявіліся „микояновские булочки” (ад імя народнага камісара гандлю СССР А. Мікаяна) – нават сталіца СССР не бачыла белага хлеба з 1930 года, ад пачатку калектывізацыі. Гэта

– тыя „булочки”быў вынік таго „вызвалення беларусаў і ўкраінцаў”. На вышэйшым партыйным зборышчы восенню 1940 года, расхвальваючы геній „сталінскай палітыкі”, В. Молатаў абмінуў і бяспеку, і палітыку, і „вызваленне”, а перш за ўсё „ўзахлёб” рапартаваў радасна, што Савецкі Саюз адразу павялічыўся на... 17 мільёнаў чалавек! Альбо: амаль на дзесяць працэнтаў – і ўсе гэтыя „працэнты” неадкладна павінны былі пачаць працаваць „на всю страну”... Гэтаксама, як у БССР пасля 1929 года, у галовах НКВД было зусім не вынішчэнне „беларускасці”, але забеспячэнне „генеральной линии партии” на ўмацаванне цэнтральнай улады ў Маскве, гэтаксама і на Заходняй Беларусі нікому спецыяльна не прыходзіла ў галаву асабліва вынішчаць „польскасць”... Інструкцыя па вывазе „нежелательных лиц” прадугледжвала наступныя сорак катэгорый чалавечага тлуму.

Палітычныя дзеячы, члены ўсіх палітычных партый (у тым ліку і апазіцыйных!). Адміністрацыйныя служачыя ўсіх узроўняў (у тым ліку паштовыя тэлеграфісты і выкладчыкі школ). Служачыя паліцыі, жандармерыі, пагранічнай і лясной (!) службы. Вайсковыя афіцэры і унтэрафіцэры рэзервы. Члены сем'яў вышэйнаменаваных. Члены ўсіх афіцыйных арганізацый (у тым ліку літаратурных, мастацкіх, спартыўных, прафесійных і г.д.). Гаспадары фабрык, заводаў, банкаў і г.д. Гаспадары і ўладальнікі ўсіх прадпрыемстваў з колькасцю наёмных часовых і сталых работнікаў больш пяці(!) (млынары, фальваркоўцы і г.д.). Асобы „свабодных заняткаў” (адвакаты, журналісты, гандлёвыя агенты і г.д). Землеўладальнікі з памерам надзелу больш пятнаццаці гектараў... Апошнімі ў тым рэгістры новапаўсталых „ворагаў народа” ішлі... калекцыянеры.

Як туды калекцыянеры трапілі?! Ну, адзін збірае паштовыя маркі, а іншы, скажам, манеты... О! А то ж — і ад іх і да скарбу савецкага панства мус хапануць, і ў сакрэтны фонд НКВД, ну, і сабе ў кішэню! Ды і тыя ж паштовыя маркі бываюць розныя...

Савецкая ўлада ў 1939 годзе займалася на Крэсах не вынішчэннем „польскасці”, але „рабункамі мужыкоў” на дзяржаўным узроўні.

Тыя „польскасць”, „беларускасць”, „украінскасць” і г.д. трапілі ёй, так сказаць, па дарозе... Самі падлезлі пад удар. Раз былі на Крэсах багацейшымі палякі, то і ў быдлячыя вагоны трапілі гэтак жа палякі. І ўсе іншыя, і хопіць ужо пра гэта — бо і ў людзей нашых нейкая дзіўная логіка, усе мы думаем, што нехта ці-

кавіцца намі персанальна, а ў камуністаў жа свая логіка. Пра яе коратка пісаў рускі класік Іван Крылоў, незаслужана невядомы ў Еўропе, бо па моцы таленту магутны і роўны Эзопу і Ляфантэну:

*Ты виноват уж том,*
*Что хочется мне кушать.*
*Сказал – и в темный лес*
*Ягненка уволок.*

Пра памеры савецкага грабежніцтва на Крэсах яскрава сведчыць тое, што і ў савецкіх кінафільмах пра даваенныя часы (па-савецку „даваенны" значыць да 22 чэрвеня 1941 года, і гэта ў масавай свядомасці), і ў мастацкай, і мемуарнай літаратуры „вся Москва" на развітальных вечарынках танцуе пад патэфон з кружэлкаю „Рые-Рыта". Можна толькі ўявіць, колькі чаго іншага ў афіцэрскіх чамаданах вывезлі з „бедных" Крэсаў, калі адных патэфонаў адгэтуль хапіла на ўсю Маскву! І ніхто з аўтараў ані памянуў, адкуль паявіліся раптам у Маскве тыя патэфоны і „Рые-Рыта" – вайны 1939 года там не заўважаюць і па сённяшні дзень. Парадаксальна, але цяперашнія „палякі на Беларусі" таксама як быццам без памяці, хто ўсё ж такі напаў на Польшчу ў верасні 1939 года; прэтэнзіі на кампенсацыю выстаўляюцца імі выключна беларусам – маўляў, гэта вас вызвалілі, і гэта ваш доўг... Не-не, грошы „то ніц", гэта ваш маральны доўг – бо і як ён будзе неадплатны! I o to chodzi...

Між іншым, з прыблізна пяцідзесяці тысяч чалавек віленскіх, лідскіх, баранавіцкіх ды слонімскіх палякаў будзе ў тых падмінскіх Курапатах самае меншае палова. У Курапатах пачалі расстрэльваць толькі з 1936 года, але нават пры самых масавых рэпрэсіях толькі стотысячны на той час Мінск і наваколле (пры кожным акружным месце на Беларусі былі „свае" курапаты!) ніяк не маглі даць аж столькі ахвяр. У магілах і ямах праблізна палова знойдзеных і хоць неяк індывідуалізаваных рэчаў маюць польскія ці заходнееўрапейскія пазнакі.... Масавыя вывазкі пачаліся не раней як зімою 1940 года, таму што „живой товар" прызначаўся для працы на шахтах і дастаўляўся на месца кампактна, а перад зімой НКВД „часала" памянутыя вышэй сорак катэгорый і пасылала іх у яму, такім спосабам пазбаўляла будучую рабочую скаціну галавы і запабягаючы бунтам і паўстанням у лагерах.

Але хоць ты гавары, хоць не – засланіла Катынь тыя Курапаты! Так прасцей для розуму і сумлення. Такія мы людзі – на Крэсах і на „скудзелі” – так мы ўзгадаваныя па-боску і не па-боску,

*бо ўсякае дрэва пазнаецца з плоду ягонага,*
*бо не збіраюць смокваў з цярноўніку*
*і не збіраюць вінаграду з хмызняку.*
Лука V, 44

1939 год быў годам суцэльнага авечага бляяння і воўчага выцця – і хто ноччу быў ваўком, днём рабіўся авечкаю, а хто ноччу дрыжэў авечкаю, той днём ляскаў зубамі, як воўк. І кожны на кагосьці спадзяваўся і чакаў, праклінаў і ўхваляў, ганьбіў і славіў... І ўсе паміналі пры гэтым нейкага Бога, і ніхто не заўважаў, што замест Адзінага Бога даўно маюць у руінах сваіх душаў Адзінага Пана, які адбярэ чужым і дасць сваім, які некалі быў і потым знік, але ён вось-вось вернецца і вось тады, нарэшце, падзеліць справядлівасць. Гэта значыць, дасць нам адным,

*бо ён любіць народ наш*
*і збудаваў нам сінагогу.*
Лука VII, 5

Як некалі на заснежаным полі пад Ашмянамі чакаў Агінскі падмогі ад рускіх палкоў, а Сапега шведскіх – абое ж стараліся і для сябе, і для Краю, і абое хацелі як лепей! – так і цяпер чакалі кожны свайго. Адны, каб усё было так, як раней; другія ж, каб ніколі не было так, як раней... А па Краю зноў хадзіў і правіў баль той, хто не лянівы, рабіў па-свойму і свой парадак – і кожны знаходзіў сабе часовых і сталых слугаў, і кожны з тых слугаў любому мог давесці, што інакш не магло быць, што гэта адзіны шлях, што менавіта, вось, гэта і ёсць той Адзіны Пан, і што, якая, у рэшце рэшт, такая вялікая розніца паміж панам і Богам, тым болей, што Бог невядома дзе, а пан тут, у мястэчку...

*бо любіць народ нас*
*і збудаваў нам сінагогу.*
Лука VII, 5

Што, паночкі, даскакаліся?! Дапанаваліся?! А цяпер паскачы-павыдзыгай! Пабудзь і ты на лесапавале, як мы зімою ў Белавежу хадзілі, пакармі і ты вош у рускіх, як мы кармілі ў тваіх пастарунках! Пажыві і ты на тры грошы ў дзень, паеш і ты хлеба з апілкамі, паплач і ты над хутарам сваім, і над дзецьмі, і над усёй Польшчай!!!

І гэтак было да чэрвеня 1941 года...

План вайны супраць СССР „Barbarossa” Гітлер у канчатковым варыянце зацвердзіў ужо ў снежні 1940-га. Месяцам раней Берлін наведаў старшыня Савета Народных Камісараў СССР (намінальны кіраўнік дзяржавы, бо І. Сталін увогуле не займаў дзяржаўных пасадаў і быў „толькі” сакратаром ЦК ВКП(б)), Вячаслаў Молатаў – спрабавалі да канца падзяліць яшчэ не падзелены свет. І як трэба было чакаць, не падзялілі... Спачатку Молатава ўгаворваў у сваім кабінеце Рыбентроп – размову перарваў налёт англійскай авіяцыі на Берлін, і працягвалася ўжо ў бамбасховішчы. Цэлы час Молатаў маўчаў, і толькі, калі Рыбентроп сказаў адкрыта, маўляў, на што яшчэ вы разлічваеце, вайна жа так і так скончылася, мы, немцы, даўно ўжо ў Парыжы, тады Молатаў гэтак жа адкрыта спытаў:

– Калі вайна скончылася, то чаго мы сядзім у падвале і чые гэта самалёты бамбяць Берлін?!

На другі дзень абодва паехалі да Гітлера. І там да нічога не дайшлі... Потым Молатаў успамінаў, як Гітлер, ужо на развітанні, нечакана выбег за ім у прыходжую, дзе Молатаў апранаў паліто, узяў за руку і спытаў:

– Добра, мы агрэсары... Добра, вы занялі палову Польшчы толькі дзеля вашых украінцаў з беларусамі. Але, як вы растлумачыце свету, што вы занялі Літву, Латвію, Эстонію і частку Румыніі?!

– Растлумачым, – коратка адказаў Молатаў і выйшаў.

Праз два тыдні план „Barbarossa” быў падпісаны і запушчаны ў штабную работу.

Лета 1941 года магло ўразіць любога!

На пачатку вайны Чырвоная Армія мела на заходніх граніцах СССР 2,5 млн. войска, 22 тыс. танкаў, 12 тыс. самалётаў. Вермахт разам з арміямі Венгрыі і Румыніі меў больш 2 млн. чалавек, толькі 3,5 тыс. танкаў і каля 4 тыс. самалётаў... Сцвярдэжэнні савецкіх вайсковых спецыялістаў і ваенных гісторыкаў, што савецкая тэхніка была састарэлая, а немцы напалі раптоўна, выглядаюць смеш-

на. Савецкія танкі „старых” мадэляў БТ ці Т-28 мелі мацнейную браню і большы калібр гарматаў, чым асноўны нямецкі танк T-III. Асноўны савецкі знішчальнік И-16, хоць і саступаў „Месэршміту” ў хуткасці, але меў супраць двух кулямётаў „Месэршміта” аж чатыры кулямёты, а частка мадэляў яшчэ і дзве гарматы калібрам 20 мм, да таго ж И-16 быў адзіны на той час у свеце знішчальнік, які меў браніраваную кабіну пілота... Што да раптоўнасці ўдару, то нават, калі за першы дзень на аэрадромах і было знішчана больш тысячы савецкіх самалётаў, то і так перавага ў паветры заставалася трохкратнай... Летам 1941 года быў пабіты савецкі спосаб думання, дакладней, бездумання. На рэальнай вайне імгненна праявіўся параліч розуму „вінціка” гіганцкай машыны, якога старанна адвучылі думаць і прымаць рашэнні самастойна. Несамастойнасць думкі застаецца самым цяжкім грахом чалавека цяпер на ўсёй, гэтак званай, постсавецкай прасторы. Поўны правал постсавецкіх дзяржаў пры спробе засвоіць хоць пачаткі рынку нагадвае сабою тое лета 1941 года...

Але, староннягa назіральніка тая катастрофа магла скалануць да глыбіні душы! На Крэсах кінутай тэхнікай былі забіты ўсе дарогі. Ад Беластока да Ваўкавыска амаль адзін за адным стаялі танкі, цягачы, гарматы, аўтамабілі. Першае акружэнне немцы замкнулі на Шчары – трапіла ў „беластоцкі кацёл” чатырыста тысяч чалавек альбо тры палявыя арміі. Другое акружэнне немцы замкнулі ў раёне Мінска – там апынулася зноў сто тысяч чалавек. І гэта ў першы тыдзень вайны!.. Эх, і закалаціліся сэрцы заечых душаў на Крэсах – адны страхам, іншыя нянавісцю... Але тыя і тыя калаціліся не толькі ад непазбежных новых парадкаў, да гэтага ізноў трэба было прызвычаіцца. Адны калаціліся, што зараз той 1939 год вылезе бокам, асабліва занадта спрытным і неабачлівым. А іншыя не мелі сумневу, што вось цяпер яны выйдуць з лесу і з канспірацыі ды паквітаюцца з тымі хамамі...

Калі першы ваенны шал крыху аціх і пачало наладжвацца нейкае жыццё, разведка АК стала з Варшавы прабірацца на Усход для пошуку інфармацыі ўвогуле і праверкі, ці ацалеў хоць хто-небудзь з нашых у прыватнасці. Пачаткі ZWZ-AK закладваліся ж у чатырох ваяводствах, што апынуліся пад саветамі, яшчэ з восені 1939 года. З канца 1940 года ў Вялікабрытаніі рыхтавалі cichociemnych – у тым жа і для Крэсаў: генерал Сікорскі лагічна прадбачыў, што вайна паміж СССР і Германіяй выбухне вельмі хутка. Лонданскія палітыкі з эміграцыйнага польскага ўраду тады ж выпрацавалі і спусцілі

дырэктывамі кіраўніцтву АК у Варшаве канцэпцыю „вайны з двума ворагамі”. І вось цяпер высланцы з Варшавы ішлі на Усход пагля-дзець, як гэта вайна выглядае на практыцы...

Рапарты ашаламілі Варшаву!

„На Беласточчыне польскае насельніцтва вітае немцаў як вызваліцеляў...”

„У Беластоку і ваяводстве амаль уся адміністрацыйная ўлада ў руках палякаў. Акупант вяртае на працу тых, хто займаў гэтыя ж месцы да восені 1939 года...”

„Апарат акупантаў у Гродне выключна польскі. Служба па-радку з сямідзесяці двух чалавек складаецца выключна з былых супрацоўнікаў паліцыі...”

„У Вілейскім павеце паявіліся дзіўныя шыльдачкі накшталт: Posterunek Polskiej Policji Państwowej...”

„На занятыя немцамі абшары вяртаюцца польскія землеў-ладальнікі і пад аховай нямецкай жандармерыі адбіраюць у ся-лянаў былую панскую, а пры немцах ужо падзеленую калгасную зямлю, інвентар, коней. Гэта выклікае канфлікты. Пад Лідай дай-шло да пратэстаў і нават сутычак, жандармы застрэлілі некалькі чалавек...”

„Немцы робяць выгляд і адкрыта гавораць, што „вяртаюць Польшчу” – гэтак вельмі ўдала распальваецца канфлікт паміж палякамі і беларусамі...”

Чаму ў Галоўнай Камендантуры АК у Варшаве не радава-ліся такому перавароту спраў (ха, дурны акупант сам пускае да сябе нашу агентуру!), чаму ўзнікла нейкая няпэўнасць наконт „вайны на два франты” і было вырашана ўмацаваць канспіра-цыйную сетку яшчэ раз?

Таму, што з тых жа рапартаў вынікала, што да немцаў на службу ідуць пераважна тыя, хто два гады адседжваўся пры са-ветах і ні тады не быў звязаны з польскім падполлем, і цяпер не хацеў звязацца! Маўляў, невядома яшчэ, што будзе, а жыць трэ-ба... Вы там у сваім падполлі спачатку пакажыце, што можаце, а вось калі тыя англічане наляскаюць у морду Гітлеру, вось тады і мы гераізм праявім...

Карацей кажучы, як вынікала з першага погляду разведкі,

*Пасланцы, вярнуўшыся ў дом,*
*знайшлі хворага слугу здаровым.*
Лука VII, 10

На Беларусі немцы сталі пераважна запарадкоўвацца з верасня 1941 года. Амаль што ўсе Крэсы – за выняткам раёна Вільні, якую і немцы прызналі летувісам следам за саветамі! – адышлі да Генеральнай Акругі „Беларусь”, на чале якой пастаўлены быў апошні арыгінал нацыянал-сацыялістычнай партыі Вільгельм Кубэ. Быў гэта шлянзак з Брэслаў-Вроцлава, доўга сядзеў у прускім парламенце яшчэ за часамі Ваймарскай Рэспублікі, садзейнічаў легалізацыі Гітлера, калі той пасля мюнхенскай турмы ніяк не мог знайсці сабе месца пад сонцам, потым займаў вышэйшыя пасады ў партыі і адміністрацыі. І раптам, у 1938 годзе нехта падкінуў фюрэру ананімны ліст, у якім сцвярджалася, што антыжыдоўская практыка яго рэжыму падрывае... навуковы патэнцыял Германіі ды яе міжнародны аўтарытэт! Гестапа без асаблівых намаганняў знайшло ананімніка – ім аказаўся Вільгельм Кубэ... Толькі асабістае заступніцтва фюрэра яго ж і адратавала. Што праўда, аднак, ён „загрымеў” у канцлагер – толькі не ў паласатай форме, а ў чорнай: унтэр-афіцэрам СС. З генеральскай пасады...

Чаму магутны міністр па справах акупаваных тэрыторый Альфрэд Розэнберг выцягнуў апальнага „унтэра” ізноў на генеральскую пасаду?! Не мог жа Розэнберг, чалавек з адной гімназіяй, як і ўся гітлераўская вярхушка за выняткам хіба прамыслоўіка Шпэера і банкіра Шахта, ну, Гебельса, сам так хутка даведацца, што ў сваім часе Кубэ ў сваім Універсітэце Брэслаў для цікавасці слухаў лекцыі прафесара Абіхта, амаль адзінага ў Германіі пачатку ХХ стагоддзя спецыяліста па таямнічай Weissruthenien... Хіба Розэнбергу падпіхнулі Кубэ, як гнілую скурку пад ногі, людзі яго адвечнага канкурэнта па грабежніцтве, genosse Гімлера, усемагутнага шэфа СС і тайнай паліцыі. Тым не менш, ашалелы ад нечаканага ўзлёту Кубэ прыбыў у разбураны асамі Герынга Мінск, з напалеонаўскімі планамі... Разабраўшыся, што ад Беларусі як дзяржавы і нацыі ў еўрапейскім разуменні засталося, мякка кажучы, няшмат, гаўляйтэр Кубэ ўзяўся ляпіць аднačасова нацыю, сатэліта і саюзніка Вялікай Нямеччыны...

Гэта было неверагодна! У Львове гаўляйтэр Райхбецырк „Украіна” Эрых Кох першае, што зрабіў, дык разагнаў усіх герояў-украінцаў з ОУН, пазней пазрываў са сцен „жовто-блакітні” сцягі, а Сцяпана Бандэру, хоць і на генеральскіх правах, значыць, з асобным дамком і ад’ютантам, але справадзіў... у Маўтхаўзэн. У Вільні і Коўні яго калега, генерал Лёзэ, хоць і не быў

ажно такім порсткім, але і ён загадаў верным летувісам павыкідаць да чортавай мацеры сваю дарагую сімволіку, паставіў над „свабодным” літоўскім друкам вострую цэнзуру (забараняліся любыя згадкі з гісторыі) і казаў лепш паклапаціцца пра мабілізацыю ў паліцыю і пра пастаўкі харчоў для фронту. У Мінску ж Кубэ адразу прыняў прыехаўшага з Берліна шэфа малакольkаснай і малаістотнай даваеннай беларускай эміграцыі д-ра Ермачэнку і не піхнуў яго нарыхтоўваць збожжа ды бульбу, але даручыў стварыць Беларускую Народную Самапомач – у тым жа з аддзелам культуры і асветы! – і заняцца беларусізацыяй адміністрацыі... У Берліне пры справаздачы Розэнбергу гаўляйтэр Кубэ матываваў, што Мінск да таго ж засмечаны савецкім духам, што перад тым, як разбірацца, хто з іх арыец, а хто нават не untermensch, трэба з тых беларусаў рабіць усё-такі беларусаў. Розэнберг толькі паціснуў плячыма – справа была новая і малавядомая. Чорт яго ведае?!

Гебітскамісарыят займаў Мінск, Слуцк і Заходнюю Беларусь – толькі людзі Ермачэнкі палезлі ў цывільную адміністрацыю і нямецкую дапаможную паліцыю, як аказалася, што там ужо ўсё абседжанае палякамі, якія на nowych przybyszy глядзелі зверам. Як да вайны! Там-сям, і часцей людзі Ермачэнкі сталі атрымліваць або кулю ў галаву, або данос: Herr oficerze, ten człowiek przed wojną znał się z komunistami! Беларусізацыя апарата ішла цяжка. Праўда, у СД таксама не бралі дурняў, і вельмі хутка Ермачэнка атрымаў значную палёгку – з лютага 1942 года, справіўшыся з савецкім падполлем у Мінску, гестапоўцы больш грунтоўна заняліся „сваімі” служачымі і прыступілі да Polenaktion з мэтай чысткі ўсяго апарата ад польскага падполля. Праўда, і немцаў на кожным кроку падпільноўвалі задачкі, ад якіх трэба было ў лысіне скрэбсці. За той жа 1942 год толькі ў Слонімскай акрузе „вычысцілі” (чытай: расстралялі) каля тысячы чалавек за сувязі з АК. Разам з тым западозрана каля пяцісот беларусаў у фальшывай беларускасці... Моцна пахіснуліся пазіцыі Кубэ і Ермачэнкі: у час раскопак featuredрознага кампрамату на канкурэнтаў, людзі з СД (даглядаць за Кубэ Гімлер адаслаў у Мінск генерала Готбэрга) накапалі, што Ермачэнка меў сувязі з беларускай апазіцыяй у Празе-Чэшскай, а праз яе з чэхамі, якія цяпер заселі ў Лондане... Кубэ змог зрабіць толькі тое, што, замест у лагер, Ермачэнку адаслалі назад у Берлін і загадалі яму там кожны дзень адзначацца ў мясцовым аддзяленні гестапа.

На Крэсах у вайну было пекла. Апроч Арміі Краёвай, была савецкая партызанка, пры гэтым яна дзялілася на чатыры ўзаемна канкуруючыя накірункі: армейскія аддзелы ГРУ (Главное Разведывательное Управление Генштаба), спецаддзелы НКВД, і найбольш масавыя атрады, нават палкі Цэнтральнага Штаба Партызанскага Руху пад камандаю ўсё таго П. Панамарэнкі, які быў стаў намеснікам самога І. Сталіна як Вярхоўнага Галоўнакамандуючага; з'явіліся яшчэ і мясцовыя атрады антыфашысцкіх камітэтаў з былога КПЗБ. Часам заходзілі ўкраінскія партызаны з УПА, якія роўна ваявалі і з немцамі, і АК, і з саветамі... Нямецкая адміністрацыя таксама... канкуравала паміж сабою – і то яшчэ як! Апроч адміністрацыі Кубэ, была тылавая служба групы арміяй „Цэнтр", апарат СД, асобныя каманды Абвера адмірала Канарыса, войскі СС і паліцыі Готбэрга – і паміж імі ішла бесперапынная грызня, такі вось ordnung панаваў. На баку немцаў былі яшчэ батальёны РОА (Русская Освободительная Армия) перайшоўшага на бок немцаў генерала Уласава, батальёны ўкраінскай, летувіскай, латышскай і... нават нямецкай польскай паліцыі (211-ы паліцэйскі батальён СС!), атрады Беларускай Народнай Самаабароны і дапаможнай паліцыі, а пад канец вайны батальёны Беларускай Краёвай Абароны. Трэба дадаць да ўсяго таго і накіраваных сюды саюзнікаў немцаў, але ваюючых у залежнасці ад канкрэтнай сітуацыі: венграў, італьянцаў, гішпанцаў і славакаў... Адным словам, меў рацыю той афіцэр СД, які ў другой палове 1943 года ў сваім рэфераце ў Берлін пісаў, што „тут пануе закон джунгляў"!

І ўсё ж на Крэсах галоўным было адно супрацьстаянне – паміж АК і савецкай партызанкай. Вайна ні трохі не змяніла тых самых падрахункаў паміж палякамі і беларусамі...

На пачатку снежня 1941 года, амаль дзень у дзень, адбыліся дзве малавядомыя, але вельмі істотныя падзеі; другая ў стратэгічным Смаленску, аб чым далей. У Маскве І. Сталін прымаў Сікорскага і Андэрса; між іншым, зайшла размова пра тое, што з лагераў НКВД не пускаюць людзей у польскую армію Андэрса. На гэта Сталін заявіў, што такога проста не можа быць – таму, што ёсць ясны загад: усіх жадаючых палякаў з усяго СССР накіроўваць да Андэрса. Усё так, кажа Андэрс, але толькі палякаў, а я гавару пра грамадзянаў Польшчы, у тым жа ўкраінцаў і беларусаў. Пасля кароткай спрэчкі, што палякі і без таго дадатку добрыя жаўнеры, ды пасля рэплікі Андэрса, што калісьці ў яго палку было працэнтаў

восемдзесят беларусаў і гэта быў лепшы полк у польскай арміі, Сталін нечакана заявіў літаральна наступнае: добра, пра межы Польшчы пагаворым, калі польская армія пойдзе на фронт – а Львоў у 39-м мы хіба занялі-такі з гарачкі, гэта ж польскае места, не ўкраінскае, але... служыць у польскім войску аднак маюць адны палякі, а ніякія там польскія грамадзяне...

А ў тыя ж дні ў Смаленску, дзе мясціўся штаб групы арміяў Цэнтр фэльдмаршала Браўхіча, адбывалася строга засакрэчаная нарада начальнікаў тылу ўсяго ўсходняга фронту і вышэйшых афіцэраў Генштаба – па сутнасці, гэтыя людзі і вялі вайну. Праблема стаяла адна: чаго мы дабіваемся гэтай вайною з Расіяй? Ну, не выйшлі мы да гэтай зімы на лінію Архангельск – Астрахань, як прадугледжваў план Barbarossa, ну і нічога страшнага, выйдзем на наступны год... І што далей?! Адным словам, мудрыя нямецкія галовы прыйшлі да таго, што лёс перамогі Германіі залежыць ад лёсу народаў паміж Германіяй і Расіяй, ад Балтыцкага да Чорнага мораў.... Парадаксальным чынам – немцы ў Смаленску – ізноў усплывала нешта накшталт былога і прапашчага Вялікага княства Літоўскага! Але планавікі і стратэгі вайны са свае званіцы глядзелі ў слушным напрамку... Сталін не прызнаў бы паражэння, нават калі б Вермахт заняў Маскву і Ленінград, Волгу, Каўказ і Крым ды затапіў увесь савецкі флот – з Германіяй ужо ваявалі Злучаныя Штаты на баку Англіі. А таму было неабходна стварыць буфер паміж Германіяй і Расіяй, таму нельга ісці да поўнай каланізацыі занятых абшараў, але да ўтварэння на іх і ўмацавання саюзных Германіі дзяржаў – на падабенства Славакіі і Харватыі ў цэнтральнай Еўропе! – і фармавання ў іх рэгулярных арміяў. Пакуль Германія і Расія вядуць вайну, дык з боку тых дзяржаў няма небяспекі, а іх эканамічны патэнцыял так і так будзе працаваць на вайну на баку Германіі. Трымаць жа там бясконцы акупацыйны рэжым ёсць самагубства – магчыма, вельмі хуткае.

Што выбівае наверх, калі пакладзеш побач сябе гэтыя, строга сакрэтныя тады звесткі пра тыя нарады, дык гэта абсалютная пераконанасць у тым – хоць немцы стаяць ужо за трыццаць кіламетраў ад Крамля, на прадмесцях вялікай Масквы! – што, калі вайна будзе весціся так, як вядзецца, то яе непазбежна прайграе Германія. Пры гэтым немцы на той смаленскай нарадзе бачылі нейкую альтэрнатыву, а Сталін быў проста ўпэўнены, што вайна будзе адбывацца менавіта так, як адбываецца –

нічога палітычна новага Гітлер не здолее выдумаць. Гітлера акаляюць такія ж партыйныя фанатыкі, самі веруючыя ва ўласную ідэалогію, якіх ён, Сталін, у сябе канчаткова перастраляў у 1937 годзе... Германіі няма, вайну вядзе нацысцкая партыя, але вядзе яна вайну не супраць бальшавізма, як працягвае крычаць д-р Гебэльс, але супраць Расіі, і ён, Сталін, ёсць не партыйны бажок, але дзяржаўны дзеяч. Ён ужо думае, што пасля вайны будзе, бо пасля вайны паўстане праблема Польшчы ды яе межаў на ўсходзе, з аднаго боку, і як ладзіць усё – ці з тым жа Сікорскім, ці хоць бы з „левымі", калі стаяць у перамовах на той лініі, да якой дайшлі ў 1939 годзе (за Ломжу), гэта з другога боку, прычым трэба думаць, як ты, Сталін, будзеш выглядаць перад сваім народам і арміяй, калі раптам аддасі каму нешта раней заваяванае?! Гэта ж Расія пад табою, а Расія такога адступлення не зразумее... Значыць, мае быць яшчэ адзін шлях вырашэння праблемы Польшчы, значыць, да адсунутых усходніх межаў будучай Польшчы трэба далучыць нешта важнае – заходняе! Гэта прамысловыя нямецкія раёны – такі абмен за Крэсы палякам будзе добры пры любым палітычным рэжыме ў іх...

А якое права мае Польшча на тыя заходнія землі ў гэтак званым гістарычным аспекце, хай пра тое падумае сам Сікорскі – калі гэты герой вайны 1920 года ледзь не ўсю іхнюю польскую незалежнасць прасядзеў у адстаўцы і мала не пад хатнім арыштам, значыць, чалавек ён разумны... Адносіны з Польшчай маюць быць іншымі чым былі; хопіць ужо слухаць байкі пра славутае мінулае, усю тую пыху і мыльныя бурбалкі. Пасля верасня 1939 года ўсе яны эмігранты – і не столькі ў Англіі, колькі ў тым сваім незабыўным мінулым,

*яны падобныя да дзяцей,*
*якія сядзяць на рынку, клічуць адно*
*аднаго і кажуць:*
*мы гралі вам на жалейцы,*
*а вы не скакалі,*
*мы спявалі вам песні журботныя,*
*а вы не галасілі.*
Лука VII, 32

Лёс Крэсаў практычна быў вырашаны ў снежні 1941 года. І быў вырашаны на Крамлі... Пры гэтым Сікорскі мог увогуле нічо-

га не гаварыць, галоўнае ўжо сказаў Сталін: Польшча мае быць не проста ў складзе антыгітлераўскай кааліцыі, але яшчэ і на баку СССР – за гэта яна адновіць намінальны палітычны суверэнітэт, а не будзе шаснаццатай рэспублікай СССР, гэта па-першае, а праблема межаў на „лініі Керзана" вырашаыцца кампенсацыяй за кошт Германіі, бо ці ж не вартыя Шлёнск і Гданьск нейкіх odwiecznie polskich Львова і Вільні?! Потым – ужо па смерці Сікорскага, па Катыні і разрыве Масквы з польскай эміграцыяй – так і сталася ў Ялце ды Патсдаме.

Але, калі б раптам ажыццявіўся той варыянт, які абгаворвалі тады немцы ў Смаленску, – які быў бы лёс Крэсаў?! Сустракаліся мне і такія патрыятычныя беларускія галовы, гарачыя, як печаная бульба з вуголляў, што гатовыя былі атрымаць тую незалежнасць хоць ад Гітлера, абы даў! Аргументавалі яны тым, што Сталін забіў яшчэ больш людзей, чым Гітлер... Аргумент з шэрагу „Дзе Крым, а дзе Рым!" Гітлер табе даў бы незалежнасць, ён табе даў бы, потым дагнаў бы і даў бы яшчэ пару разоў – і ўсё гумай, гумай і гумай, і то па галаве, каб такой дурной не была!

З канца 1940 года ў сейфах Берліна ляжаў звышсакрэтны план Ost – што мае быць на Усходзе пасля плана Barbarossa. Меркавалася... засяліць немцамі не толькі Польшчу, але і той самы абшар ад Балтыкі і да Крыму, працэнтаў восемдзесят тубыльцаў меліся ісці пад нож, астатнія ж на анямечаных слугаў – гэтая мроя сівай кабылы спасылалася на гістарычны вопыт Тэўтонскага Ордэна. Пры гэтым палякі меліся знікнуць ужо ў 1950 годзе, а іх усходнія суседзі да 1960-га... План быў да таго ж дурны, што ведалі пра яго на ўсялякі выпадак толькі... адзінаццаць чалавек, разам з Гітлерам! Распрацоўшчыкаў, ясная справа, ліквідавалі па адным і хавалі са штандарным гонарам. Сакрэтнасць была такая, што міністр Розэнберг пра план Ost яшчэ ведаў, але Франк, Кох, Кубэ і Лёзэ не ведалі анічога!

Так што інтуіцыя не падвяла Сталіна – перад вайной ён паспеў адмовіцца ад камунізма ўзамен за Расію, і Гітлер так і не зразумеў, што інтарэсы Германіі і жыццёвая прастора (Lebensraum) для памнажэння арыйскай расы – гэта зусім іншыя рэчы... Немцы прайгралі вайну задоўга да яе пачатку. Што ж да таго, што сваё выратаванне свет атрымаў з волі другога злодзея, а мільёны людзей з аднае няволі трапілі ў другую, адносіцца гэта да чалавечай маралі, не да чалавечых памылак. Зрэшты, у гіс-

торыі не бывае памылак, у гісторыі не бывае разважанняў на тэму „што было б, каб было не так, але гэтак...” па той прыкмеце, што лічыцца толькі халодны розум.

*І апраўдана мудрасць усімі дзецьмі яе.*
Лука VII, 35

Прыблізна да лета 1943 года Крэсы жылі ў тым самым сонным і напружаным спакоі, як і за польскім часам – толькі пад нямецкай акупацыяй. Нямецкая ўлада датычылася местаў, мястэчак і чыгункі – а далей тыя ж солтысы разносілі каманды і збіралі падаткі, а што рабілася на тых хутарах і ў лясных вёсках, дзе і чалавека з гміны бачылі два разы на год, ведалі толькі тыя, хто там жыў. І мясцовыя, і прышлыя... На правым беразе Нёмана дамінавала польская партызанка, на левым – савецкая. Гэта ізноў-такі тлумачыцца не тым, што менавіта паміж Нёманам і Шчарай загразлі „советские окруженцы” 1941 года – былі гэта людзі ў большасці непрыдатныя для партызанкі; частка іх сама здалася ў нямецкі палон, іншыя ж марадзёрылі па вёсках, паступова іх пералапала нямецкая жандармерыя. Другімі ж наступствамі былі – масавы наплыў мясцовай моладзі да беларускай пранямецкай Самааховы, а таксама... паўстанне першых атрадаў самаабароны АК, скажам, атрад К. Міклашэўскага ў раёне Івянец– Стоўбцы. Падзел на „савецкія” і „польскія” раёны быў той самы, каталіцка-праваслаўны. На месцы ж палітыку рабілі палявыя камандзіры – і варта тут падзівіцца кароткай чалавечай памяці наконт таго. Нямецкая агрэсія супраць СССР парадаксальным чынам зачыніла сабою нават верасень 1939 года, хоць адносны і ўзаемны нейтралітэт АК і чырвонай партызанкі за ўвесь 1942 год можна тлумачыць слабасцю тых і тых (у Ліпічанскай і Рудніцкай пушчах усім хапіла месца).

Але ж, як кажуць, пры жаданні вораг і зброя знойдуцца... Хіба спрацаваў у гэтым нейтралітэце перш за ўсё інстынкт самазахавання: прыйдзе, вось, немец ды паесць тых і тых, так што пакуль кожны з тых двух бакоў заняўся сваімі справамі, галоўным чынам, вынішчэннем konfidentyw і „предателей”, гэта значыць, людзей на нямецкай цывільнай службе, напрыклад, настаўнікаў або чыгуначнікаў. Нагадаем: у немцаў не было беспрацоўя, а наадварот, існаваў працоўны абавязак – рыхтык як у саветаў. Цікава, што з лета 1942 года афіцэры СД у сваіх справаз-

дачах сталі са здзіўленнем адзначаць, што напрамак застрашальнага тэрору чырвоных памяняўся – цяпер яны страляюць выключна служачых немцам беларусаў і... не чапаюць палякаў. Каб не трапіць у каго з агентаў АК... Але тут гестапа хіба пераб- рала меру – ці здалося ім, што ва ўмовах Polenaktion і расстрэлаў палякаў самімі немцамі, чырвоныя прагматычна пераключыліся на беларусаў? Пазіцыя чырвоных адносна Крэсаў ад верасня 1939 года была нязменнай: мы прыйшлі і не пойдзем! На тым жа стаяла і АК – tu będzie Polska, ponieważ tak było... Гэтае зацішша разарвецца громам.

22 чэрвеня 1943 года пленум ЦК КП Беларусі прыняў пастанову „Аб ваенна-палітычных задачах дзейнасці ў заходніх абласцях Беларусі”, де было сказана, што „заходнія вобласці гэта неадрыўная частка БССР” і што тут могуць дзейнічаць толькі тыя, хто „кіруецца інтарэсамі СССР”, а дзеянні тых, кім кіруюць „польскія буржуазна-нацыяналістычныя цэнтры”, гэта „незаконнае ўмяшанне ў інтарэсы нашай Айчыны”.

З гэтага лагічна вынікала „шырокае развіццё партызанскага руху” і „далучэнне да яго ўсіх слаёў насельніцтва, у тым жа і палякаў”, а таксама „неабходнасць усялякімі сродкамі весці барацьбу супраць польскіх буржуазна-нацыяналістычных атрадаў”... Адным словам, саветам не залежала, каб раззброіць ці перабіць Армію Краёвую – але і на гэта (перабіць!) давалася распараджэнне наперад, калі б атрады АК адмовіліся пераходзіць пад савецкае камандаванне.

Прыблізна праз месяц – у Маскву і Лондан з Крэсаў ішлі шыфраграмы „саветы прапануюць падпарадкавацца; што рабіць?” альбо ў другі – маскоўскі – бок „прапанавалі мы ім далучыцца да нас, а свой атрад расфарміраваць; вядзем перамовы”. З двух бакоў паляцелі затым новыя дырэктывы. Масква патрабавала, па-першае, „спыніць супрацоўніцтва з АК”, па-другое, „нейтралізаваць палякаў у нашых (!) атрадах”, па-трэцяе, „раззброіць сілы АК на нашай тэрыторыі”... Жорстка, па-азіяцку, але ясна. А Лондан і ГК АК у Варшаве загадвалі nie współdziałać z Sowietami, ale nie przeszkadzać dla nich!! „Що то ма значыць, до яснэй холеры?!” Як маглі саветы запрасіць на „перамовы”, захапіць і вывезці самалётам (!) у Маскву таго ж К. Міклашэўскага, і яшчэ чатырох яго афіцэраў, больш-менш праясняецца хіба толькі пасля такіх вось загадаў, тыпу strzelać, lecz nie ładować.

А восенню 1943 года на Заходняй Беларусі паявіліся значныя сілы рэгулярнай савецкай партызанкі, перакінутай з усходу – усяго 9 брыгад, 10 асобных атрадаў, якія прайшлі тыламі немцаў, і 15 парашутна-дыверсійных групаў, перакінутых самалётамі з-за фронту. У выніку ў канцы 1943 года на Заходняй Беларусі было ўжо 37 тыс. партызанаў – у тры разы больш, чым год назад. І што не менш істотнае, тады ж узнікла ажно 87 (!) падпольных райкомаў ВКП(б), замест ранейшых 10, і выдавалася 14 пастаянных газет, з іх 4 на польскай мове. Завяліся і „савецкія польскія партызаны”, было іх разам чалавек чатырыста, у трох асобных атрадах, але і іх заўважылі цывільныя, а немцы назвалі іх „зялёнымі”. Трэба прызнаць, што савецкая тактыка на Заходняй Беларусі была больш прадуманай і гнуткай у параўнанні з польскай. Толькі 5 кастрычніка генерал К. Саснкоўскі перадаў з Лондана ў Варшаву наступную агульную інструкцыю ажно ў трох варыянтах:

– калі будуць адноўленыя дыпламатычныя адносіны паміж Масквою і польскім урадам у Лондане (разарваныя вясной 1943 года ў выніку Катыні), то паўстанне супраць немцаў будзе ўзгоднена з савецкім камандаваннем;

– калі нямецкі фронт разваліцца раней, то АК абавязана пачаць паўстанне самастойна і аднавіць польскі кантроль над даваеннай тэрыторыяй, не дапускаючы туды савецкія войскі;

– калі будзе спынены агонь і дасягнуты часовы спакой паміж СССР і Германіяй, трэба заставацца ў падполлі і чакаць на рашаючы ўдар пасля перамогі заходніх саюзнікаў...

Дырэктыва датычылася не актуальнага становішча, але хутчэй 1918 года і часоў Доўбара-Мусніцкага ды Пілсудскага... Генерал Т. Бур-Камароўскі ў Варшаве паціснуў плячыма і аддаў загад рыхтаваць аперацыю „Бура” – а што яшчэ яму заставалася рабіць?!

Немцы не выпадкова раскапалі Катынь менавіта вясною 1943 года, хоць ведалі пра яе з восені 1941 года – у іх рукі трапіў гэтак званы „смаленскі архіў”, дакументы абкома ВКП(б) і ўпраўлення НКВД. Немцы не выпадкова арганізавалі „працёк інфармацыі” пра тую Катынь – запыт у міжнародны Чырвоны Крыж наконт Катыні ад польскага ўрада ў Лондане прыйшоў у Швайцарыю ў той самы дзень, што і аналагічны з Берліна. Хіба выпадкова разбіўся над Гібралтарам генерал Сікорскі... Што мы пра

тое можам ведаць?! Толькі тое, што Крэсы набліжаліся да свайго канца... І сягоння гэта ведае нават малое дзіця,

*Бо няма нічога таемнага,*
*што не выйшла б на яву,*
*ні схаванага, што не зрабілася б вядомым*
*і не выкрылася б.*
Лука VIII, 17

А на Крэсах ішла зусім іншая вайна... У снежні 1943 года з немцамі паступова скантактаваліся камандзіры Стаўбцоўскага і Наднёманскага (Лідскага) злучэнняў АК А. Пільх (пс. Gyra, Dolina) і Ю. Свіда (пс. Lech), а крыху пазней на кантакт з Абверам выйшаў і сам камандзір Віленскай Акругі АК А. Кшыжаноўскі (пс. Wilk). Пагадненне прадугледжвала нейтралітэт і... забеспячэнне АК нямецкай зброяй. Ужо ў сакавіку 1944 года на нарадзе ў Мінску генерал К. Готбэрг, які замяніў забітага ў тым жа снежні В. Кубэ, самазадаволена заявіў, што „на наш бок перайшлі тры польскія банды і ваююць з чырвонымі" (!) – меліся на ўвазе тыя ж злучэнні А. Пільха і Ю. Свіды, а таксама брыгада Ч. Заянчкоўскага (пс. „Рагнэр") з Наваградскай Акругі АК...

„Вынішчэнне чырвоных бандаў" было, аднак, другаснай задачай. Перш за ўсё палякі ўзяліся за апанаванне поўнага кантролю над тэрыторыяй, занялі ўсе вёскі, легалізавалі цывільную ўладу. Пераважна знішчала „чырвоныя банды" хіба толькі злучэнне А. Пільха ў раёне Стоўбцы-Мінск, той апынуўся ў самым цэнтры савецкай зоны, таму цэлы баявы шлях злучэння вызначаюць 82 аперацыі супраць немцаў і 101 супраць савецкіх партызан. Стаўбцоўскае злучэнне АК удзельнічала і ў супольных акцыях супраць савецкіх партызан разам з немцамі зімою 1944 года... Размах такіх, нечаканых для Варшавы, аперацый АК на Крэсах быў такі, што ўжо ў студзені 1944 года (нечуваная аператыўнасць для падполля!) ГК АК у Варшаве загадала правесці следства і пакараць тых камандзіраў, якія супрацоўнічаюць з немцамі... І тут высветлілася, што караць няма каму! „Лонданцаў" на Крэсах было некалькі дзесяткаў чалавек, астатнія ж камандзіры былі ў падполлі яшчэ з 1939 года, многія з іх цудам пазбеглі вывазкі ці смерці „пры саветах"; і што такога зрабілі іх калегі, калі ўзялі ад немцаў зброю, каб даць у карк czerwonym?!

Старшынёй суда над „Лехам” і „Рагнэрам” прыйшлося ставіць... камандзіра варшаўскага УБК VIII Б. Пясэцкага; пазней ён быў кіраўнічым дзеячом РАХ у Варшаве. Абвінавачаных тых судзілі на расстрэл, але тут жа прадстаўнік ГК АК М. Каленкевіч (пс. Kotwicz) заявіў, што... прыпыняе выкананне прысуду да канца вайны. А што яшчэ ён мог зрабіць? Трымацца закона, разваліць партызанку?! Крэсы жылі сваёй логікай, якая даўно не была зразумелай старонняму з Польшчы чалавеку... У выніку „суда” Ю. Свіда-Lech быў адкліка765 ў Варшаву, а на яго месца пастаўлены... другі падсудны, Ч. Заянчкоўскі-Ragner! І гэтак ваявалі далей...

*Пастухі, убачыўшы, што сталася,*
*пабеглі і расказалі*
*ў горадзе і ў селішчах.*
Лука VIII, 34

– Яшчэ спакой. Немцы паціху даюць нам зброю і нас не чапаюць – гэта называецца, што мы зброю „здабываем”. За гэта хочуць, каб мы задушылі савецкую партызанку. Калі наш атрад на дарозе сустракае жандараў, то адны глядзяць у адзін бок, другія ў другі – і гэтак міла разыходзяцца, як лялі. Але вось на днях лідскі гебітскамісар здаў нам увесь свой „гебітс”, каб мы ачысцілі акругу ад бальшавікоў – і мы ачышчаем, як толькі можам! Ужо дайшло да таго, што пан камендант – у поўным мундуры, тры зорачкі на рагатыўцы, маўзэр на пасе, а жаўнер яго ў палявой форме паганяе вазком! – у белы дзень заязджае да места пад камендантуру, выходзіць нямецкі камендант, салютуюць адзін аднаму, ідуць на нараду. Потым выходзяць, адсалютоўваюць, наш сядае ў вазок і едзе ў лес... Вось так гэта робіцца! – гэта быў Юзэф Мацкевіч, „Не трэба гаварыць уголас”.

Ю. Мацкевіч атрымаў ад віленскага АК два смяротныя прысуды: перш за тое, што ў 1939-41 гадах супрацоўнічаў у Вільні ў польскіх газетах, якія выходзілі пры саветах і летувісах; другі за тое, што супрацоўнічаў у Вільні ў польскай газеце пры немцах, на запрашэнне немцаў ездзіў у тую ж Катынь ды напісаў тое, што бачыў... У Катынь у вайну пад нямецкай акупацыяй палякі не верылі! Лічылі гэта „нямецкай правакацыяй”, такі вось парадокс. Ніхто і на хвіліну не задумаўся, куды ж падзеліся тысячы прапаўшых у 1939 годзе афіцэраў, ці хоць тыя вывезеныя

саветамі пазней... Што ж, калі Ю. Мацкевіч да канца жыцця лічыўся чалавекам таленавітым, але тэндэнцыйным і неразборлівым у палітыцы, звернемся да справаздачы прадстаўніка Галоўнай Камендантуры АК па Шчучынскім павеце ў Варшаву:

– Шчучынскі павет уваходзіць у склад Лідскага гебітскамісарыята. Гэта астравок Рэчы Паспалітай, дзе мясцовыя нямецкія ўлады дэманструюць максімум цярплівасці і разумення да арганізаваных і ўзброеных палякаў. Шчучынскі павет нагадвае наваколле Жлобіна і Бабруйска часоў Доўбура-Мусьніцкага. Нямецкая ўлада існуе толькі ў мястэчках, а савецкая на левым беразе Нёмана. Польскія атрады праводзяць рэгулярную мабілізацыю – солтысы афіцыйна разносяць позвы. Кожную нядзелю і ў кожнае свята адбываецца палявая імша. Млыны, маёнткі і гаспадаркі плацяць на войска падаткі, натурай і грашыма. Варшавякі з УБК (Uderzeniowy Batalion Kadrowy) сцвярджаюць, што нідзе ў Польшчы няма такіх добрых умоваў для фармавання падполля як у Шчучынскім павеце. Справа тут не толькі ў настроях людзей, але і ў нямецкай паблажлівасці. Са шчучынскай турмы немцы выпусцілі восем хлопцаў толькі пад слова гонару, што пойдуць да „белых”...

Нямецкі фронт абрынуўся роўна праз тры гады пасля пачатку савецка-нямецкай вайны – 22 чэрвеня 1944 года; 3 ліпеня савецкія танкі былі ўжо ў Мінску. Але высокі тэмп наступлення быў адной з прычын адноснай няўдачы аперацыі Ostra Brama, у выніку якой АК мела авалодаць Вільняй і паставіць тут польскую адміністрацыю. З планаваных 18 тыс. чалавек з Навагрудскай і Віленскай акругаў АК, да начной атакі 6 ліпеня паспелі не больш 4 тыс. – немцы мелі ў Вільні да 6 тыс. чалавек з бронецягнікамі, танкамі, артылерыяй і штурмавай авіяцыяй. Праз суткі частка сіл АК Віленскай Акругі працягвае баі за Вільню разам з войскамі савецкай 5-й арміі – места было ачышчана ад немцаў 12 ліпеня 1944 года. Сярод тых, каго не было пад Вільняй, сустракаем тых жа „Гуру”, „Рагнэра”, „Лупашку” – а кожны з іх меў пад сваёй камандаю 800-1000 чалавек! – у планы якіх, хто супрацоўнічаў паўгода з немцамі, ніяк не ўваходзіў хоць які-небудзь кантакт з саветамі... Трэба думаць, гэтыя палявыя камандзіры так і не збіраліся браць удзел у „Вострай Браме” – агульная канцэпцыя плана „Бура” была больш-менш вядомая ўсім афіцэрам: „план пачынае дзейнічаць, як толькі лінія савецкага фронту дасягне вызначанага аб’екта атакі”... Тры дні генерал А. Кшыжаноўскі-

Wilk патруляваў места і збіраў навабранцаў у 19-ю дывізію пяхоты, як і прадугледжвалася планам адраджэння польскай арміі. 15 ліпеня войскі НКВД шчыльна атачылі Вільню і раззбройвалі ўсе атрады АК, якія ішлі да Вільні. Пачалося натуральнае паляванне з удзелам авіяцыі і самаходаў-амфібій на тых АКоўцаў, хто не склаў зброю і адступаў у лес. Сам Wilk з групай афіцэраў быў арыштаваны ў штабе 3-га Беларускага Фронту і адасланы ў Маскву. На тым палітычна-мілітарнае значэнне Арміі Краёвай на Беларусі можна лічыць у асноўным скончаным – на сваім лёсе яе жаўнеры пераканаліся ў паўтарэнні верасня 1939 года. Тыя ж мроі, тая ж няпэўнасць, тая ж жорсткая рэчаіснасць...

Тыя атрады АК, якія не ўзельнічалі ў „Вострай Браме” альбо не былі распыленыя НКВД летам і восенню 1944 года, часткова былі распушчаны (тыя, каго мабілізавалі зімою 1944 года). Дарэчы, калі 23 лютага 1944 года Готбэрг абвясціў мабілізацыю ў Беларускую Краёвую Абарону, то з плана мабілізацыі была... выключана Лідская Акруга – там мела сваю мабілізацыю АК, саюзнікі; па ўспамінах Я. Праўдзіца-Шляскага, праваслаўныя складалі да сарака (!) працэнтаў мабілізаваных. Часткова сілы АК адступілі на захад (пры гэтым А. Пільх-Gyra перайшоў Буг у нямецкай калоне, маючы ў кішэні „глейт” ад мінскага SD – там Стаўбцоўскае злучэнне менавалася ўжо „антыпартызанскай адзінкай”). З найбольшых адзінак АК на Крэсах засталіся батальён Ч. Заянчкоўскага-Ragnera і ашмянская брыгада Б. Туронка-„Тура”’. Позняй восенню „Рагнэр” спрабаваў рэгулярна ваяваць у тылах савецкай арміі – спаліў ст. Рось, падарваў некалькі эшалонаў на лініі Ваўкавыск – Баранавічы і г.д. Але шчыльнасць савецкага тылу і магчымасці НКВД не ішлі ні ў якое параўнанне з SD і нямецкай фельд-жандармерыяй! Ужо пасля 1 студзеня 1945 года была акружана і знішчана апошняя група на чале з самім „Рагнэрам”, а вясною 1945 года саветы ліквідавалі і апошніх партызанаў з брыгады „Тура”... Цяпер вайна адкацілася на хутары і лясныя вёскі – там працягваліся тыя ж падрахункі, што пачаліся з восені 1939 года. Ішла вайна хата на хату... У мемуарах тагачасных афіцэраў НКВД, 1945-48 гады называюцца не інакш, як кашмарам. Навонак усё выглядала спакойна, але на справе гэта была ўжо нават не партызанская вайна, а нешта такое, што сягоння называецца: тэрарызм. Скажам, па той жа савецкай статыстыцы, за тыя тры гады на Шчучыншчыне і Лідчыне (тэрарызм квітнеў там, дзе ў вайну панавала АК – на правым бе-

разе Нёмана!) загінула 257 партыйных і савецкіх работнікаў, афіцэраў, служачых і г.д. Агульныя ж страты „от рук бандитов” склалі больш за 3,5 тысяч чалавек – гінулі пераважна вясковыя гаспадары, бо тут іншых людзей не было... Пасля 1945 года практычна не засталося ў падполлі і афіцэраў АК, на працягу 1945-47 гадоў выехала ў Польшчу, карыстаючыся часовай магчымасцю (з лютага 1948 года была ўжо „граница на замке”!) легальнага выезду і атрымання польскага грамадзянства, ацалелая інтэлігенцыя – так што нават, калі і быў гэтак званы „стыхійны рух” супраць савецкіх парадкаў, то не было каму той рух арганізоўваць... Мясцовыя ж атаманы, як вынікае з рапартаў НКВД, мелі па... 16-18 гадоў і кіравалі такімі ж падлеткамі. Іх аперацыі былі дрэнна спланаваныя і амаль заўжды вялі да праваладаў... Тыповая гісторыя банды: створаная ў вёсцы Рудзічы ў лютым 1946 года, налічвала 22 чалавекі, мела на ўзбраенні 1 кулямёт, 6 карабінаў, 2 пісталеты; у красавіку забіла двух фінансавых агентаў, што прыехалі ў вёску, і параніла міліцыянера. „Лясныя браты” здараліся ўсё радзей і радзей – не было чаго жэрці, бо фронт і савецкія нарыхтоўкі падмялі ўсё, і не было чым плаціць, як у вайну, калі АК мела і даляры, і рэйхсмаркі; правіянт не куплялі і не адбівалі з савецкіх складоў, бо іх не было зусім, але бралі па вёсках зброяй і гвалтам... Нехта адразу ж крыўдзіўся і... помсціў (чытай: даносіў)! Цяпер ужо стралялі, даносілі не каталікі на праваслаўных, як пасля 1939 года, але і каталікі каталікоў стралялі – крэсавы атэізм таксама ішоў ад галоднага страўніка... Неабходна адзначыць, што цяпер у НКВД былі не наезныя маскоўскія і ўральскія хлопцы, але даволі шмат... „тутэйшых”. Больш таго – Цэнтральны Штаб Партызанскага Руху не быў расфарміраваны, як толькі скончылася савецкая партызанка, але існаваў... да канца 1946 года. З былых партызанаў фарміраваліся спецбатальёны НКВД, якія „прачэсвалі” Заходнюю Беларусь, хутар за хутарам і хату за хатай. Да вясны 1949 года, нават з неарганізаванай стралянінай было скончана – і з восені пачалася тая самая калектывізацыя, што і ва ўсходняй палове БССР. Каталікі пайшлі ў калгас у тых самых ватоўках і гумовых ботах, што і праваслаўныя – цяпер усе былі роўнымі хамамі і думалі толькі пра тое, як і куды з тае вёскі ўцячы. Бог не памог, бо ксяндза забралі, і Амерыка не памагла, бо няма вайны. А жыць жа неяк трэба...

*і сказаў ім:*
*нічога не бярыце ў дарогу:*
*ні кія, ні торбы, ні хлеба, ні срэбра*
*і не майце па дзве вопраткі.*
Лука IX, 3

Паводле рашэнняў Ялты і Потсдама, Крэсы апынуліся амаль што цалкам у межах Беларускай ССР, якая паводле тых жа рашэнняў уключала большасць этнічных беларускіх земляў і фармальна ізноў рабілася суб'ектам міжнароднага права, трапіла аж у краіны-заснавальніцы Арганізацыі Аб'яднаных Нацый.

Але канчаткова Крэсы як асобны рэгіён зніклі на савецкай прасторы, і здавалася б, назаўсёды ў 1950-54 гадах, калі і тут прайшла павальная і суцэльная калектывізацыя. За гэты час Крэсы перажылі яшчэ некалькі міграцый: па-першае, рэшткі палякаў – пакуль яшчэ пускалі да 1948 года! – пастараліся выехаць у Польшчу, на Ziemie Odzyskane пад Вроцлаў, Шчэцін і Гданьск; па-другое, пры першай магчымасці значная частка насельніцтва падалася на новабудоўлі ў Мінск, Ленінград, Данбас і Сібір, што давала магчымасць згубіцца ў безбярэжным савецкім моры і атрымаць чысты пашпарт без штампа-шлагбаўма „Был на оккупированной территории", які ўва многіх выпадках пазбаўляў, скажам, права на вышэйшую адукацыю; па-трэцяе, маладыя мужчыны, пасля тэрміновай службы ў Савецкай Арміі, стараліся там застацца альбо паступіць у вайсковыя вучэльні. Усё гэта ўзятае разам прывяло да міграцыі ў Польшчу і ўглыб СССР больш аднаго мільёна чалавек – у тры раз больш ад прымусовых вывазак 1939-41 гадоў і толькі на траціну менш ваенных стратаў за 1941-45 гады.

Вельмі важнай для Беларусі была тая акалічнасць, што гэтак званая тытульная нацыя, гэта значыць, беларусы панеслі адносна намнога меншыя страты, чым дамінуючыя перад вайною палякі і габрэі. Другі не менш важны вынік вайны – гэта самы шырокі доступ у партыйна-дзяржаўную адміністрацыю – мясцовых партызан. З 1956 года і да апошніх дзён СССР рэспубліку і большасць мясцовых органаў улады ўзначальвалі беларусы. У ЦК КПБ „прыезджымі" былі толькі старшыня КГБ і камандуючы вайсковай акругай; тое ж датычыла складу мясцовых камітэтаў і дзяржаўных устаноў.

З гістарычнага пункту гледжання, II Сусветная вайна была першай вайною за ўсю гісторыю Беларусі, якая нарэшце пайшла ёй на карысць. Тым болей, што вёска пры ўсіх нямецкіх блакадах і партызанскіх акцыях была разбурана менш, чым места. Намінальна беларускай заставался асноўная сямігадовая школа. Але ж узмацнеў і стаў незваротным той падзел на беларускую вёску ды „русский” горад, які быў ва ўсходніх абласцях яшчэ да вайны. Татальная індустрыялізацыя, ад пачатку 50-х і да канца 70-х гадоў знішчыла вёску, а з ёй і старую Беларусь, ператварыла нацыянальную аўтаномію ў адзін з адміністрацыйна-эканамічных раёнаў Савецкага Саюза. У гэтым хуткім працэсе дэнацыяналізацыі, хіба галоўную ролю адыграла... хоць і беларускамоўная, але савецкая школа. Сама мова нічога не вартая, калі служыць выключна прыступкай да прышчаплення і засваення іншай культуры і іншага светапогляду, якімі былі савецкая культура і камуністычная ідэалогія. Але, таксама, трэба прызнаць і тое, што ніколі б на Крэсах так хутка і практычна без заўважнага супраціву не адбылося б акалгашванне і асавечванне цэлай нацыі, калі б тая нацыя не мела спрадвеку ў сваёй свядомасці тых архаічных рысаў, якія аказаліся прыдатнымі і для колхоза, і для коммунизма.

За сваю тысячагадовую гісторыю Крэсы перажылі, па сутнасці, толькі чатыры заўважныя гістарычныя зломы.

Першы – гэта рэформы вялікага князя Казіміра Ягелончыка і яго Судзебнік з 1447 года, які ўпершыню хоць неяк парадкаваў існуючае на адным звычаёвым праве аграмаднае ВКЛ (Вялікае княства Літоўскае).

Другі – гэта „валочная памера” за часамі Боны Сфорцы, калі ўпершыню тут уводзілася трохпалёўка і новы сацыяльны парадак, падмацаваны артыкуламі Літоўскага Статута.

Трэці ўдар Крэсы атрымалі ў выніку скасавання Аляксандрам II прыгону ў 1861 годзе, а надламалі іх – далейшыя рэформы Вітэ і Сталыпіна.

Чацвёрты – нанеслі Крэсам дзве сусветныя войны і экспансія камуністычна-калгаснага ладу з Расіі, якія радыкальна змянілі не толькі эканамічныя парадкі, але і зламалі нацыянальна-рэлігійны падзел.

Пры гэтым, па-за знікненнем магнатэрыі знікла шляхта, прапала мяшчанства і святарства – і запанаваў адзін пралетарыят... Адгэтуль пачатак свету лічылі не ад нараджэння Хрыста,

але ад свайго ўласнага нараджэння. Крэсы пазбавіліся памяці – заўтрашні дзень быў для іх тым самым, што дзень учарашні. Айчына, вера і мова зусім выйшлі з ужытку. Іх месца заняў адзін велізарны народны страўнік, куды трапляла ўсё лепшае з Краю і, альбо прападала там бясследна, альбо ператваралася... самі ведаеце ў што. Бясслаўны канец Крэсаў, іх ціхая смерць ізноў здаваліся быць толькі справай часу.

Паўсюдную „русіфікацыю” Крэсаў правільней назваць паўсюднай саветызацыяй. Але нешта падобнае да таго ўсталявалася тут задоўга да бальшавікоў, хіба з часоў Кацярыны ІІ ды Станіслава Панятоўскага – у выніку і атрымалася такая пачвара, як праваслаўны савецкі беларус, „панская Польшча” дала яшчэ і каталіцкага савецкага паляка... За савецкім часам ўсе зрабіліся роўнымі хамамі – за выняткам тых, ясная справа, хто выбіўся ў савецкіх паноў. На месцы не было выйсця, таму кожны дурань кінуўся „любить Россию”...

Любоў да Расіі – гэта любоў мужыка да панскага двара. Калі ў бядзе можна пайсці і пазычыць, калі раптам будзе нечага трэба, а потым не аддаваць, а плакаць... Савецкі Саюз уяўляўся сярэднестатыстычнаму беларусу з канца 50-х гадоў нейкай бяздоннай бочкай, банкам з неабмежаваным ільготным крэдытам, надзейным спосабам выбіцца ў людзі, месцам прыгодаў і заробкаў, „доўгім рублём”, новабудоўлямі і вайсковымі вучэльнямі, скораспелай кар’ерай і афіцэрскімі пагонамі, і хромавымі ботамі, і пры ўсім гэтым гарантаванай задаволенасцю жыць у Беларусі лепш, чым у Расіі.

Разглядаючы наступствы індустрыялізацыі з 1956-га па 1991-ы год трэба падкрэсліць дзве асаблівасці. Па-першае, індустрыялізацыя была неадлучнай часткай індустрыялізацыі ўсяго СССР, гіганты хіміі і ваеннай прамысловасці былі скіраваныя не на Беларусь, але на ўсю імперыю. Нічога беларускага ў новапаўсталым на роўным месцы Наваполацку ці Баранавічах і быць не магло! Кволая вясковая беларуская школа гінула такім натуральным чынам, што на вёсцы школы зачыняліся, бо не было дзяцей, а ў месце адчыняліся ўжо „русские” школы. Па-другое, індустрыялізацыя ажыцяўлялася на працягу жыцця аднаго пакалення. І гэта не места паціху праглынула і перамалола вёску, як было амаль паўсюдна ў свеце, але сама вёска гвалтам і раптам рынулася ў места, затапіла, стаптала, вывярнула на свой вясковы бок, праглынула тое места-горад і высрала яго! Тут не было

так, як у людзей, што ўчарашні вясковец, а ўжо месціч па волі агульнага лёсу мучыўся і сніў родную хату, а сын яго з усіх сіл імкнуўся тую хату забыць і прыдурваўся культурным чалавекам, унук жа быў нейкі зусім іншы і шчыра не разумеў, пра якую гэта такую вёску заядла сварацца вечарамі бацька і дзед... І цяпер унук не разумее, што гэта я такое пішу, а ён чытае!

Але ж у савецкай Беларусі і першае пакаленне мяшчанаў не разарвала з вёскай, а так і ездзіць па сённяшні дзень капаць-садзіць бульбу; другое ж пакаленне таксама не выдурнялася, хоць і засвоіла марынаркі і гальштукі, бо кругом у месце былі такія самыя свае са сваёй вёскі; і трэцяе пакаленне, як відаць цяпер, недалёка зайшло ад другога і першага, бо гэтаксама ездзіць на бульбу... Толькі што не перапоўненым казённым аўтобусам, ці пазнейшымі старэнькімі „Жыгулямі" (савецкі варыянт Фіята!), але... на BMW і Chewrolete – і тымі ж BMW, прэстыжнымі раскошамі, цягне да места мяшкі з бульбай пад завязку. Нешта падобнае было, скажам, у Польшчы – chłoporobotnicy – але, нават у Польшчы немагчыма сабе ўявіць, што ўсе інжынеры, лекары, вайскоўцы, цэлы Саюз пісьменнікаў і ўся Польская Акадэмія Навук гэта ж тыя самыя chłoporobotnicy...

А ў Беларусі тое магчыма – і то яшчэ як! Chłoporobotnik na chłoporobotniku i chłoporobotnikiem pogania!!

А ў вёсцы пан гэта ўсё, а хам гэта нічога. У вёсцы паважаюць толькі багатых і моцных, а не таленавітых і выступаючых з агульнага тлуму. У вёсцы ў пашане ўлада, гумовая палка ў руках, грошы ў кішэні і сваяк у начальстве – не якісьці абстрактны розум і талент, ці гэтага таленту дасягненні па-за вёскаю шарачковай Беларусі, яны зусім непатрэбныя (чхаць хацелі на генія!). Аснова цяперашняга дзесяцімільённага тлуму-натоўпу, бо не бяруся называць гэтага грамадствам, бо няма існых грамадзянаў, гэта сямейка, радня і клан. Гэта вечны язычніцкі падзел на сваіх і чужых. Тут не існуе іншае сумленне, іншая мараль, адметная матывацыя ўчынку альбо адмаўлення ад учынку. Тая ж колішняя сярод магнатэрыі, а потым сярод шляхты фамілія танцуе свой адвечны баль – толькі цяпер баль мужыцкі, бо па-арабску свае гэта аль-махія, а па-сіцылійску (цяпер ужо па-савецку!) мафія... Тая страшэнная мафія ўсяго толькі наша нязломная сямейка. Свае!

Але ж тутэйшая мафія, якая так і не выйшла з вёскі, па-вясковаму абмежавала сваю перспектыву адным днём, а свае

інтарэсы страўнікам (жыватом) – па-вясковаму імкнецца быць практычнай і здабываць сваё з як меншым высілкам. Таму замест цярплівасці, навукі і працы на перспектыву, калі бацькі пракладаюць дарогу дзецям, а род з пакалення на пакаленне ўздымаецца паступова, крок за крокам, дык наша вясковая мафія імкнецца схапіць усё адразу, чыім-небудзь чужым коштам, а хто ўсё жыццё працуе і дабівацца таго ж, усё роўна лічыцца дурнем і няўдачнікам, бо, каб умеў жыць (!), то меў бы тое самае хутчэй і лягчэй... Дзесяць запаветаў Ісуса Хрыста прымаюцца вяскаўнёй з адной-адзінай папраўкай – тыя ж дзесяць табу распаўсюджваецца выключна на свой клан. „Чужых" дык можна і забіваць, і рабаваць, і ашукаць, і выкінуць... Найбольш лупяць, як ліпку, дзяржаву – бо яна нічыя, значыць, чужая. І ўсе гэтыя гістарычныя помнікі, уся гэтая культурная спадчына бязлітасна нішчыцца праз усё XX стагоддзе толькі з тае прычыны, што гэта належыць дзяржаве, значыць, чужое і шкоднае... У вяскаўні нават няма такога паняцця, як Айчына. Гэта ж кніжныя ёй выдумкі – і не болей. Парадаксальным чынам цяперашні суверэнітэт Рэспублікі Беларусь мае толькі аднаго шчырага абаронцу – чынавенства.

Абараняючы суверэнітэт, чынавенства перш за ўсё абараняе сябе і сваю ўладу, свае цёплыя крэслы... Гэта зусім не значыць, што за той суверэнітэт чынавенства жыцця не пашкадуе! Наадварот, гэта значыць, што калі нехта дасць больш, чым дае яму той суверэнітэт, то канкрэтны чыноўнік свой канкрэтны кавалак Айчыны прадасць вокамгненна! Але, ці гэта гора?! Найбольш скептычна я гляджу на спробы выкінуць чынавенства і замяніць яго „патрыётамі"... Чыноўнік хоць збольшага знаецца на цэнах і коштах – і калі дагэтуль, а таму ўжо восем гадоў, ён тую Рэспубліку Беларусь не прадаў, значыць, не было пакупнікоў альбо, можа, мала давалі за яе... А як ужо „просты чалавек" агаладае, то забудзе ўсё на свеце і будзе памятаць толькі пра свой пусты жывот, а таму сам пабяжыць на бліжэйшы базар прадаваць тую Маці-Беларусь, як бегае прадаваць крадзенае збожжа з калгаса, мяшок цэменту з будоўлі ці электраматор з завода. Гэтаксама прадаюць даведкі з устаноў, дыпломы з універсітэтаў, зброю з гарнізонаў, дачок-шаснастовак з цесных двух- і трохпакаёвых кватэраў... Грашавітым курвягам.

Вяскаўня можа быць кім хочаш і дзе хочаш. Агіды, страху, сораму і цярпення ў яе проста няма – калі пусты жывот, то ўсё

гэта маральна-людскае адкладваецца на потым. Але тое потым чамусьці так і не надыходзіць, бо жэрці хочацца цэлы час – і як жа іначай,

*бо, што карысьці чалавеку здабыць увесь сьвет,*
*а сябе самога загубіць*
*альбо пашкодзіць сабе?*
Лука IX, 25

Непараўнальнае ні з чым абурэнне светам ахоплівае вяскаўню альбо тутэйшых толькі ў адным выпадку: аднойчы высвятляецца, што не толькі твой адзін клан хоча жэрці, але жэрці хоча цэлы свет, а і цэлы той свет складаецца з такіх самых кланаў, і ўсе яны хочуць жэрці, і нават не тое жэрці, што твой клан ужо сам збіраўся, але... якраз твой клан і хочуць зжэрці! І тут у тутэйшага сама ўзнікае ў галаве і лагічна ясна ўкладаецца справядлівасць, якая на Крэсах – калі коратка – зводзіцца да падзелу на нашых і вашых... А паколькі ў кожнае пакаленне-два на Крэсах была якая-небудзь вайна ці рэвалюцыя, і паколькі тут межы насілі і пераносілі туды-сюды, як на Каляды плот на вёсцы, а гэта ўсё адбывалася на памяці яшчэ жывога пакалення, і адбывалася аж сем разоў, то гэтак званае пачуццё гісторыі на Крэсах проста прыроджанае – толькі пастаўце добры літар якім двум пеўням, дайце ім добрае зернетка да падзелу, толькі навучыце іх, што няма ні эліна, ні іудзея, ні паляка, ні беларуса... Эх, і дадуць жа яны вам у хвост і ў грыву з абодвух бакоў! Бо ўжо пайшло, ужо паехала і паляцела, а ўжо

*і прыйшло ім на думку:*
*хто з іх быў большы?*
Лука IX, 46.

І тут і ў крэсавага каталіка, які мае сябе за паляка (!), і ў крэсавага праваслаўнага, які мае сябе за непаляка (!), што самі па сабе яны нават пахваліцца нічым не могуць: у аднаго ўсё жыццё гной, бульба і грошы ў галаве, але ж і ў другога ўсё жыццё гной, бульба і грошы ў галаве... І вось ізноў пачынаюць яны ад Гедыміна, ад Сапегі, ад Міцкевіча, ад Дзяржынскага і Пілсудскага, і лічаць нобелеўскіх лаўрэатаў, савецкіх маршалаў, лукашэнкаўскіх міністраў, варшаўскіх цётак, маскоўскіх дзядзькоў і

суседскіх дзяцей... І неяк не прыйдзе ў галаву абодвум, што той і той роўныя сабе хамы, бо абодва роўныя служкі, і што іх вера засела ў жываце, а душа ў задніцы, і што вучаць іх маткі і начальства толькі аднаму: вы ж глядзіце, дурні, не перабірайце,

*і калі прыйдзеце ў які горад,*
*і прымуць вас,*
*ежце, што вам дадуць.*
Лука X, 8.

Гэта і ёсць Крэсы. І нідзе яны – аказваецца – не зніклі, бо Крэсы гэта людзі, гэта архетып. Няма ні ВКЛ, ні Рэчы Паспалітай, ні Савецкага Саюза, ні Расійскай Імперыі, а Крэсы ёсць. Яны сягоння нават не памежжа Расіі ды Польшчы і не толькі адвечная расійска-польская праблема. Гэта праблема цяпер усяе Еўропы і цэлага свету, бо гэта Рэспубліка Беларусь.

KAMUNIKAT.org